# БЕЛАРУСКІ РЭЗЫСТАНС

часопіс найноўшай гісторыі Беларусі

№ 1(2)/2005

KAMUNIKAT.org

**БЕЛАРУСКІ РЭЗЫСТАНС - часопіс найноўшай гісторыі Беларусі**
Заснаваны ў 2004 г. у Менску.
Заснавальнік — выдавецтва “Беларускі Рэзыстанс”.
Галоўны рэдактар: Сяргей Ёрш kambatant@yahoo.com
Намесьнік галоўнага рэдактара: Андрэй Барткевіч
Кантактныя адрасы:
rezystans@yahoo.com
rezystans2004@yahoo.com
Падпісаны да друку 04.02.2005
Надрукаваны: Украіна г. Чарнігаў, Друкарня “Промінь”. Раздрукавана з арыгінал-макета заказчыка. Замова: 144. Гарнітура: Arial.
Наклад 299 асобнікаў.
Пры перадруку спасылка абавязковая.
© Беларускі Рэзыстанс, 2005
KAMUNIKAT.org

**ЗЬМЕСТ**

**Дасьледаваньні**
Грыбоўскі Ю. Першы штурмовы зьвяз. Да гісторыі стварэньня й дзейнасьці беларускіх камандас у гады Другой сусьветнай вайны
Варанец М. Нацыянальна-патрыятычны рух беларускіх вайскоўцаў у канцы 1980-х — першай палове 1990-х гадоў
Дубноўскі В. Спроба тварэньня Беларускага Вызвольнага Цэнтру ўШвэдыі. 1943 — 1945 гг.

**Дакумэнты**
Ёрш С. Падпольны беларускі друк падчас нямецкай акупацыі 1941—1944 гадоў
Бюлетэнь Беларускай Незалежніцкай Партыі, № 1 і № 2. Перадрук
Матэрыялы да гісторыі Беларускай Краёвай Абароны
Дэпартацыя Аляксандра Калошы

**Успаміны**
Дзеравенскі П. Аддзел атамана Трухана і паўстаўшая вайсковая арганізацыя Люцька
Беларуска-польскія перамовы ў сакавіку 1944 году

**Паведамленьні**
Група беларускіх нацыяналістаў на Вялейшчыне. 1943 год
Ёрш С., Грыбоўскі Ю. Партызанскі аддзел лейтэнанта Бандыка. 1944 г.
Кавалёў А. Выкрыцьцё антысавецкай групы капітана Чугунова
Цыбульскі Л. Арышт у Менску актывіста БНП. 1945 год
Цыбульскі Л. Дывэрсіі на лініях сувязі ў Беларусі ў лістападзе 1945 году
Раманюк А. Падпольная беларуская арганізацыя дзеяла 10 гадоў

**Рэцэнзіі**
Ёрш С. Момант ісьціны / Турук А. Падагульненьне зробленага / Ёрш С. Найперш трэба здабыць незалежнасьць

**Згадкі**
Сьветлай Памяці / Пра тых, каго ўжо сярод нас няма

**Пошта**
Данілюк Б. Сакрэтны бок дзейнасьці патрыётаў
Г. К. Калі ў закладніках цэлы народ
Я. С. Пісаць пра памылкі мінулай гісторыі
Шыбіцкі М. Вярнуцца на радзіму не дазволілі
М. Ш. Статыстыка тэрору
Казак П. Як Кушаль пасварыўся з маёрам Вітушкам

**Дайджэст**
“Я быў намесьнікам Акінчыца”
“Зялёны Дуб” і прыпіскі

**Удакладненьне**
**Фотафакт**
Дудаліч С. Памылка ў рамачцы
**Рэклама**

**ДАСЬЛЕДАВАНЬНІ**

***Юры Грыбоўскі***

**Першы беларускі штурмовы зьвяз**

(Да гісторыі стварэньня й дзейнасьці беларускіх камандас у гады Другой сусьветнай вайны)

У гісторыі беларускага нацыянальнага супраціву ў гады Другой сусьветнай вайны дагэтуль застаецца шмат пытаньняў, якія патрабуюць глыбокагадасьледаваньня. Акурат да ліку гэткіх праблемаў адносіцца гісторыя стварэньня й дзейнасьці беларускіх дывэрсійных фармаваньняў на баку Нямеччыны. Гаворка ідзе пра малакалькасныя аддзелы камандас, у заданьне якіх уваходзіла, галоўным чынам, выведка і правядзеньне дывэрсіяў у тыле супраціўніка. Недасьледаванасьць дадзенага пытаньня тлумачыцца ня толькі ейнай зачыненасьцю на працягу савецкага пэрыяду, але, таксама, адсутнасьцю непасрэдных архіўных крыніцаў. Дасюль айчынныя дасьледчыкі карысталіся пераважна ўспамінамі сучасьнікаў гэных падзеяў, а таксама публікацыямі беларускіх эмігрантаў. Асноўны матэрыял адносна гэтага пытаньня знаходзіцца ў зборах Абвэру ў нямецкай архіваліі. Аднак у гэтым артыкуле мы намагаемся прасачыць гісторыю 1-га Беларускага штурмовага зьвязу на падставе архіўных матэрыялаў, якія таксама маюць высокую навуковуювартасьць і каштоўнасьць. Гэтыя дакумэнты захоўваюцца ў Польшчы — ў Архіве Польскага чырвонага крыжа і Архіве Цэнтральнага музэю ваеннапалонных у Ламбінавіцах-Апольлі. Акрамя таго, істотнай крыніцай падчас падрыхтоўкі гэтага артыкулу стаў дзёньнік унутраных загадаў камандзіра зьвязу, у якім бадай што падзённа адлюстравана паўсядзённае жыцьцё беларускіх камандас. Ён знаходзіцца ў зборах Беларускай бібліятэкі імя Францішка Скарыны (Лёндан).
Нацыстоўскае кіраўніцтва Нямеччыны праз сваё агіднае стаўленьне да іншых народаў (асабліва славянскага паходжаньня) цалкам адмаўляла ўзброеную дапамогу з боку прадстаўнікоў гэтых народаў у змаганьні супраць СССР. Разам з тым, кіраўніцтва Абвэра ў гэтым сэнсе было больш прагматычным,чымсьці зацятыя нацыстоўцы сярод кіроўных колаў краіны, і ўлічваючы стракаты нацыянальны склад Савецкага Саюзу, ня грэбавалі паслугамі антысавецкіх эмігрантаў зь ліку беларусаў, украінцаў, эстонцаў, летувісаў і інш.
Першыя згадкі наконт супрацоўніцтва беларусаў з Абвэрам па закідваньню агентаў на варожую тэрыторыю зьвязаныя з нападам 1 верасьня 1939 году Нямеччыны на Польшчу. Дзеля таго, каб даведацца пра антыпольскія альбо антысавецкія настроі на тэрыторыі паўночна-ўсходніх ваяводзтваў II Рэчы Паспалітай напрыканцы жніўня 1939 году каля Кобрына былі выкінутыя два супрацоўнікі Абвэру, адзін зь іх — Сьцяпан Гугель (перад вайной скончыў Бэрлінскі ўнівэрсытэт). У заданьне гэтых парашутыстаў уваходзіў пошук і наладжаньне сувязі з антыпольскімі партызанамі на Палесьсі, дзеля таго, каб, пры неабходнасьці, дамовіцца зь імі наконт дывэрсіяў у польскім тыле ў часе нападу нямецкіх войскаў на польскую дзяржаву. Праўда, толькі 3 верасьня парашутысты наладзілі кантакт з аддзелам атамана Тарасюка каля Драгічына. Там яны падавалі сябе за дэзэртыраў з Войска Польскага, каб убіцца ўдавер да партызанаў. Штодзённа дывэрсанты па радыёстанцыі інфармавалíБэрлін аб дзейнасьці палескіх партызанаў.
Аднак сапраўдная зацікаўленасьць беларускай ды ўкраінскай эміграцыяй з боку Абвэра ўзнавілася незадоўга да нападу Нямеччыны на Савецкі Саюз. Са жніўня 1940 году аддзел “Іншаземныя арміі Ўсходу” Генэральнага штабуСухаземных войскаў значна павялічыў заданьні Абвэру, якія датычыліся СССР. У гэты час узмацняецца шчыльнае супрацоўніцтва Абвэру з Арганізацыяй украінскіх нацыяналістаў (АУН), летувіскімі ды латыскімі “ляснымібратамі”. З мэтай забесьпячэньня ўдалага кіраваньня ўсімі франтавымі органамі Абвэру 1 траўня 1941 году быў створаны спэцыяльны выведны штаб “Валі-1” на чале з падпаўкоўнікам Шмаль-Шлегерам.1 Дадзены штаб разьмяшчаўсяў ваколіцах Варшавы, у

Сулэювэку. Пра цікавасьць з боку Абвэра да нацыяналістычнае агентуры яскрава сьведчаць наступныя факты. Увесну 1941 году колькасьць агентуры ў параўнаньні з канцом 1940 г. павялічылася ў 15-20 разоў. Так, на працягу студзеня-чэрвеня 1941 году было зафіксавана 152 парушэньні нямецка-савецкай дзяржаўнай мяжы з удзелам нямецкіх самалётаў, якія, праўдападобна, мелі на мэце закінуць у савецкі тыл паветраным шляхам дывэрсантаў..2 Побач з украінскім, летувіскім ды іншымі вызвольнымі рухамі, у прамежку з кастрычніка 1939 г. па чэрвень 1941 г. спробы правядзеньня перамоваў з Абвэрам рабілі і беларускія эмігранты. Супрацоўнікі Абвэру — маёр Геруліс, былы рэктар Кёнігзбэрскага ўнівэрсытэту, маёр Дэрынг, прафэсар фон Мэндэ і ягоны дарадца фон Энгельгард сустракаліся зь беларускімі прадстаўнікамі. На гэты момант сярод беларускай палітычнай антысавецкай эміграцыіў Нямеччыне і акупаваных ёй краінах існавалі некалькі плыняў. Да кантакту менавіта з вайсковымі коламі, а перадусім — Абвэрам, была схільная група доктара Мікалая Шчорса і кс. Вінцэнта Гадлеўскага, якая імкнулася прыдапамозе немцаў стварыць беларускія ўзброеныя аддзелы, што ў будучыні мелі стаць стрыжнем нацыянальнага войска незалежнай Беларусі. Супрацоўніцтва вышэйзгаданай групы з Абвэрам пачалося яшчэ ў другой палове 1940 г. Яно грунтавалася на вярбоўцы і перакідзе ў савецкую Беларусь агентаў, адмыслова падрыхтаваных у абвэраўскім цэнтры ў г. Сулэювэк пад Варшавай. Дадзеныя мерапрыемствы ажыцьцяўляліся пры падтрымцы адзьдзяленьня Варшаўскага камітэту Беларускага камітэту самападамогі, грамадзкай арганізацыі запачаткаванай увосень 1939 г. на тэрыторыі III Райху і Генэральнагагубэрнатарства з дазволу нямецкіх уладаў. Тым ня менш, да практычнай дзейнасьці па фармаваньні аддзелаў камандас справа дайшла толькі ў траўні 1941 г. У якасьці першых беларускіх выведна-дывэрсійных адзінак падчас Другой сусьветнай вайны можна ўважаць створаныя напарэдадні нямецка-савецкай вайны — Першы беларускі штурмовы зьвяз. Акурат тады ў складзе Асобнага вучэбнага палка “Брандэнбург-800” быў створаны дадзены падразьдзел. З той нагоды, што ўкраінскі альбо балтыцкі эмігранцкі рух быў значна мацнейшы і актыўнейшы, то зь ліку прадстаўнікоў гэтых народаў былі сфармаваныяаднаведна буйнейшыя тактычныя дывэрсійныя аддзелы. Напрыклад, у гэты час фармуюцца ўкраінскія батальёны — “Нахцігаль” і “Ролянд”, эстонскі батальён “Эрна” і г.д. Галоўнай мэтай усіх гэтых камандас была дывэрсія ў памежнай зоне супраць Чырвонай Арміі напярэдадні і падчас наступу Вэрмахту на савецкую тэрыторыю.

Асноўнай крыніцай рэкрутацыі ў беларускі аддзел дывэрсантаў сталі былыя польскія ваеннапалонныя, якія зь верасьня 1939 г. знаходзіліся на тэрыторыі Нямеччыны. Паводле дадзеных Міністэрства замежных справаў III Райху на пачатак 1940 г. у нямецкіх лягерох ваеннапалонных (шталагах і афлагах) утрымлівалася да 20 тысяч беларусаў і 30 тысяч украінцаў.3 Да сярэдзіны 1940 г. ваеннапалонныя-беларусы знаходзіліся ў 38 шталагах і 9 афлагах, разьмешчаных на абшары ўсіх вайсковых акругаў Вермахту, акрамя XII.4 Згодна з дэкрэтам Гітлера, з красавіка 1940 году пачалося звальненьне польскіх ваеннапалонных з лягераў. Зь імі падпісвалася працоўная дамова, у выніку чаго яны гублялі права апекі з боку Міжнароднага чырвонага крыжа і атрымоўвалі статус цывільных іншаземных працоўных ў III Райху. Знаходжаньне сярод польскіх ваеннапалонных значнай колькасьці беларусаў прыцягнула да іх ўвагу беларускай палітычнай эміграцыі ў Нямеччыне і акупаваных ёй краінах. 20лютага 1940 г. Прэзыдэнт Рады БНР В.Захаркі накіраваў на імя палітычнага рэферэнта Пратэктарата Чэхіі і Маравіі Коля нататку, ў якой прапаноўваў нямецкім уладам парупіцца пра культурна-асьветную працу сярод ваеннапалонных-беларусаў, правесьці іх рэгістрацыю, дапусьціць у лягеры ваеннапалонных прадстаўнікоў беларускай эміграцыі і арганізаваць распаўсюджваньне беларускага друку.5 Беларускія эміграанты рабілі спробы аб’яднацьваеннапалонных вакол сваіх арганізацый. Так, намаганьнямі беларускіх эмігрантаў у канцы 1939 г. у Бэрліне ў складзе МУС было створана Беларускае прадстаўніцтва, дзе павінны былі рэгістравацца ваеннапалонныя беларусы.У лістападзе 1939 г. пачаўся выхад

газэты “Раніца”, якая з дазволу нямецкіх уладаў распаўсюджвалася ў лягерах ваеннапалонных, дзе ўтрымліваліся беларусы. Пры пасярэдніцтве газэты, ваеннапалонныя з розных лягераў атрымалі магчымасьць наладзіць сувязь паміж сабою, страчаную падчас баявых дзеяньняў. Гэтая газэта выклікала досыць вялікую зацікаўленасьць з бокуваеннапалонных-беларусаў, аб чым сьведчыць масавая карэспандэнцыя ў рэдакцыю.6 Да канца 1941 г. у Беларускім прадстаўніцтве прайшлі рэгістрацыю да 20 тыс. ваеннапалонных-беларусаў. Са стварэньнем у 1940 г. першай грамадзкай арганізацыі — Беларускага камітэту самадапамогі — ў ейныя шэрагі ўступілі ня менш 8 тысяч былых польскіх ваеннапалонных.7
Беларускія эмігранты па загаду немцаў павінны былі весьці сярод землякоў агітацыю з заклікам супрацоўнічаць зь нямецкімі уладамі. Заахвочваньне адбывалася шляхам палёгкаў у сацыяльнай галіне — выдачай картакна харчаваньне і адзеньне, магчымасьцю зьняць кватэру. 8 сакавіка 1940 г. беларусы, якія падпісалі кантракт зь нямецкім прадпрыемствам, былі вызваленыя ад абавязковага нашэньня на адзеньні літары “Р”. Са студзеня 1941 г. ваеннапалонныя беларусы таксама вызваляліся ад 15% штомесячнага падатку на адбудову польскіх тэрыторыяў.8 У сувязі з гэтым здараліся выпадкі, калі падчас рэгістрацыі беларусамі запісваліся палонныя-палякі. Дзеячы Беларускага прадстаўніцтва з дазволу нямецкіх уладаў зьдзяйсьнялі выезды ў лягеры польскіх ваеннапалонных з мэтай пошуку там суайчыньнікаў і спрычыненьня іх да сваёй працы. Непасрэдна за вярбунак дабраахвотнікаў у дывэрсійныя аддзелы Абвэру побач з беларускімі эмігрантамі адказвалі прадстаўнікі гэтай спэцслужбы — маёр Геруліс і капітан Казлоўскі.
Агенты Абвэру супольна з супрацоўнікамі Беларускага прадстаўніцтва,якія наведвалі шталагі з мэтай пошуку кандыдатаў у школы дывэрсантаў, перадусім, зьвярталі ўвагу на нацыянальна сьведамы элемэнт. Варта тут прыгадаць, што сярод польскіх ваеннапалонных апынулася шмат сьвядомых беларусаў і нацыяналістаў: паэт Міхась Васілёк, вядомыя дзеячы беларускага руху — Аляксандар Крыт і Васіль Камароўскі, падхаружы Гэнрык Барановіч,падпаручнік Станіслаў Грынкевіч, Барыс Рагуля.9 У ліку палонных знаходзіўся й Усевалад Родзька (нар. 21 чэрвеня 1920 г.), які да пачатку Другой сусьветнай вайны зьяўляўся харужым Войска Польскага і быў прыдзелены да 42-га пяхотнага палка (Беласток). 19 верасьня 1939 г. каля мясцовасьці Лэнтаўніца ён патрапіў у нямецкі палон, атрымаў асабовы нумар 22893 і ўтрымліваўся ў шталагу XXIA (Астшэшаў, каля Пазнані). 20 жніўня 1940 г. Родзька быў вызвалены зь лягеру і накіраваны ў мясцовасьць Бжэска (Словінскага павету), дзе, паводле асабістай карты ваеннапалоннага, ён пражываў да выбуху вайны.10
У выніку вярбунку, на курс дывэрсантаў былі набраныя 52 асобы, пераважназь ліку былых польскіх ваеннапалонных.11 Дабраахвотнікаў накіроўвалі ў мястэчка Лямсдорф (зараз Ламбіновічы ў Апольскім ваяводзтве, Польшча), дзе 5 траўня 1941 г. была створаная дэсантная школа. Нягледзячы на тое, што як прадстаўнікі Абвэру, так і дзеячы Беларускага прадстаўніцтва, сярод польскіх ваеннапалонных праводзілі вярбунак сьвядомых беларусаў, у дывэрсійную школу патрапілі ўдзельнікі польскага падпольля. Так, польскай канспірацыі ўдалося правесьці ў склад беларускага аддзела сваіх агентаў,сярод якіх быў Браніслаў Валасэвіч. Большасьць дабраахвотнікаў складалі менавіта былыя польскія ваеннапалонныя, сярод якіх быў адзін паручнік і два падхаружыя былога Войска Польскага. Усе дабраахвотнікі былі залічаныя ў штаты Абвэру ў якасьці агентаў і атрымалі свае парадкавыя нумары..12 Камандзірам зьвязу стаў былы харужы Войска Польскага Ўладзімер Качан.У адпаведнасьці з унутраным загадам №1 ад 16 траўня 1941 г. намесьнікам камандзіра быў вызначаны Кастусь Габінскі, вайсковым інструктарам — Казімер Славэцкі, нацыянальна-выхаваўчым супрацоўнікам — Эдвард Валанцей, хронікарам — Браніслаў Даніловіч, інтэндантам і інструктарам па міннайсправе — Мікалай Быцько.13 Акрамя таго, у адпаведнасьці з загадам камандзіра за №1 ад 16 траўня 1941 г., на Браніслава Даніловіча

ўскладаліся абавязкікультурніцка-асьветнае працы (гісторыя, гэаграфія, літаратура). 12 траўня на сходзе ўдзельнікаў школы было вырашана называць аддзел "Беларускім штурмовым зьвязам".14

Курс падрыхтоўкі быў разьлічаны на 2 месяцы і ўключаў у сябе: карыстаньне ўсімі відамі нямецкай і савецкай агнястрэльнай зброі (у тым ліку — з найноўшымі ўзорамі), сапёрная справа, дывэрсія на аўташашы і чыгунцы, вайсковая тапаграфія, шыхтовыя заняткі, мэдычная падрыхтоўка (аказаньне першай дапамогі) і г.д. Значная ўвага надавалася рукаемнаму бою з ужываньнемфінскага нажа. Апрача таго, адбываліся заняткі па плаваньні і нямецкай мове. Неабходна адзначыць, што заняткі па нямецкай мове распачаліся 17 траўня, выкладчыкам якіх стаў сябра зьвязу Баляслаў Тачаноўскі. Камандаваньне зьвязу надавала шмат увагі нацыянальнай працы сярод асабовага складу. Так, напрыклад, у адпаведнасьці з загадам Уладзімера Качана ад 17 траўня 1941 г., распачаліся лекцыі Беларусаведы, якія чытаў адзін з жаўнераў зьвязу— Эдвард Валанцей. 17 траўня камандзір зьвязу выдаў загад, дзе адзначалася наступнае: "У сувязі з сёньняшным гістарычнай хвілінай усе беларусы, якія знаходзяцца тут, мусяць браць удзел ува ўсіх сходах нацыянальнага характару, дзе будзе праяўляцца актыўнае грамадзкае жыцьцё і аблічча нашага зьвязу. Тыя, хто ня будзе прыслухоўвацца да вышэйзгаданага, будуць адказваць перад грамадзкім судом і гісторыяй".15 Зьвязовы хронікар Браніслаў Даніловіч напісаў шыхтовую песьню "Гэта йдзе Першы зьвяз наш штурмовы", які стаў своеасаблівым гімнам аддзелу.

Акрамя патрыятычна-выхаваўчае працы, камандаваньне таксама пільна сачыла за дысцыплінай асабовага складу. Як сьведчаньне гэтаму ёсьць суд гонару, які адбыўся 18 чэрвеня над Янкам Селява, Сьцяпанам Паўлоўскім і Яраславам Станкевічам, якія парушылі ўнутраны расклад зьвязу.16 Згодна з загадам Уладзімера Качана за №3 ад 18 траўня 1941 г., была ўведзеная пасада службовага падафіцэра, ў абавязкі якога ўваходзіла наступнае: рабіць пакліч а 6 гадзіне штодня (па сьвятах — а 7 гадзіне); склікаць сходы асабовага складу; пільнаваць унутраны парадак; сачыць за сваечасовым сілкаваньнем асабовага складу; сачыць за дысцыплінаю; рабіць а 21 гадзіне перакліч, а таксама абвяшчаць каманду на адбой а 22 гадзіне штодзённа. Акрамя таго, службовы афіцэр атрымліваў ад камандзіра зьвязу спэцыяльныя інструкцыі. 19 траўня быўвыдадзены загад №4, дзе зьвярталася ўвага падафіцэраў зьвязу на тое, каб яны падавалі каманду "зважай" перад кожным зьяўленьнем нямецкага афіцэра альбо падафіцэра.17

Праз адсутнасьць беларускага вайсковага статуту вайскоўцы зьвязу былі вымушаныя карыстацца нямецкім і польскім статутамі, тэкст якіх перакладаўся на беларускую мову. Аднак 19 траўня быў зацьверджаны тэкст беларускай каманды, які распрацаваў Казімер Славэцкі. Пра цяжкасьці з ужыткамроднае мовы ў камандах сьведчыць загад камандзіра зьвязу за №6 ад 21 траўня, дзе адзначалася: "Прыгадваю сябрам зьвязу, каб у як мага найкарацейшым часе прызвычаіліся да беларускай каманды, а не карысталіся іншымі камандамі без патрэбы".18

8 чэрвеня 1941 году асабовы склад зьвязу склаў прысягу на адданасьць Беларусі. У гэты ж дзень быў абраны склад новага кіраваньня ў які ўвайшлі: Уладзімер Качан (камандзір), Эдвард Валанцей (сакратар), Мікалай Быцько (скарбнік) і чынныя сябры — Міхась Бярцэвіч, Кастусь Габінскі ды Браніслаў Даніловіч. Згодна з загадам Уладзімера Качана за №27 ад 12 чэрвеня 1941 г., Беларускаму штурмоваму зьвязу была прысвоеная назва 1-га Беларускага штурмовагазьвязу.19 13 чэрвеня курс шкаленьня скончыўся, у выніку чаго гэты аддзел быўперакінуты з-пад Лямсдорфу бліжэй да савецкай мяжы і раскватараваны ў мястэчку Прушкаў. На гэты час у асабовым складзе зьвязу знаходзіўся 41 сябра..20 Аднак да канца шкаленьня дайшлі ня ўсе жаўнеры ад першапачатковай колькасьці. Так, напрыклад, яшчэ 25 траўня асабовы склад пакінуў Язэп Зубовіч, а 29 чэрвеня — Янка Явік, Сьцяпан Паўлоўскі, Язэп Пажондны і Яўхім Гапонік. Згодна з унутраным загадам №13 ад 29 траўня 1941 г.,

вышэйзгаданыя асобы накіроўваліся на Бацькаўшчыну. Праўдападобна, як былыя польскія ваеннапалонныя,яны атрымалі дазвол ад савецкай улады на вяртаньне да хаты.
На жаль, адсутнічае якая-колечы інфармацыя наконт умундзіраваньня альбо адзнакаў беларускіх камандас. Праўдападобна, жаўнеры зьвязу ўжывалі палёвую ўніформу Вэрмахту. Вядома аднак, што падчас закіду са спэцзаданьнем у чэрвені 1941 г. на савецкую тэрыторыю яны былі апранутыя ў мундзіры чырвонаармейцаў.
З пераездам зьвязу ў Прушкаў Абвэр вырашыў ужыць беларускі зьвяз у дывэрсыйнай акцыі на савецкай тэрыторыі. Паводле камандзіра зьвязу, немцы далі беларускім вайскоўцам права адмовіцца ад удзелу ў закідзе на тэрыторыю БССР. У выніку тры сябры зьвязу скарысталіся гэтым і былі адсунутыя ад гэтай акцыі. Напярэдадні перакіду на савецкую тэрыторыю жаўнеры былі падзеленыя на групы па тры асобы ў кожнай. Варта адзначыць, што кожная група мела асобнае заданьне па дывэрсіі на савецкіх камунікацыях. У сувязі з гэтым, перад закідам, вайскоўцы былі ўзброеныя адпаведным чынам. На кожную групу выдаваліся — адзін компас і адзін аўтамат. Акрамя таго, кожны камандас атрымаў па пісталету калібра 7,65 мм., па 4 польскія гранаты, фінскі нож. Прадугледжвалася, што кожная група будзе выконваць заданьне на працягу ня больш трох сутак.21 Закід у тыл супраціўніка ажыцьцяўляўся паветраным шляхам.
У першую групу ўвайшлі Альбэрт Асоўскі, Станіслаў Акінчыц, Вацлаў Гальчынскі, Станіслаў Валасэвіч, Тадэвуш Гардзіевіч, Яраслаў Станкевіч і Лявон Зялінскі. Гэта група рушыла на заданьне 15 чэрвеня 1941 г. з мэтай выкананьня дывэрсіі на чыгунцы Баранавічы — Стаўпцы. Аднак ажыцьцявіць гэтае заданьне беларускім вайскоўцам не ўдалося. Адразу пасьля закіду камандас былі выкрытыя савецкімі вайскоўцамі. У выніку ўзброенай сутычкі некалькі дывэрсантаў былі захопленыя ў палон і дапытваліся ў НКУС. Так, сярод тых, хто патрапіў ў няволю, апынуліся Браніслаў Валасэвіч, Яраслаў Станкевіч і інш.22 Наступная група вайскоўцаў у ліку 20 жаўнераў была вырушыла з месца разьмяшчэньня кашараў у Прушкаве на заданьне 19 чэрвеня 1941 г. У гэты ж дзень быў выдадзены апошні ўнутраны загад камандзіра зьвязу за №27. У складгэтае групы ўвайшлі: Уладзімер Качан, Міхась Бярцэвіч, Мікалай Быцько, Кастусь Габінскі, Лявон Храповіч, Рыгор Рапіевіч, Янка Селява, Станіслаў Вайноўскі, Віктар Шакоўскі, Павал Яцэвіч, Эдвард Валанцей, Язэп Панятоўскі,Мікалай Бранішэўскі, Фэлікс Табалевіч, Аляксандар Голас, Казімір Славэцкі, Тодар Сабіла, Павал Вагель, Аляксандар Тур, Гэнрык Гуменік.23 Напярэдадні перакіду на савецкую тэрыторыю вышэйзгаданая група была падзеленаяна дзьве часткі па 10 асобаў, якія атрымалі самастойныя заданьні. Адна з 10-асабовых падгрупаў, якую ачольваў Уладзімер Качан, пасьпяхова выканала дывэрсію ў савецкім тыле. Уначы з 21 на 22 чэрвеня беларускія камандас былі вынікутыя з парашутамі на захад ад Менску ў радыусе 25-40 км., дзе ўдала зьдзейсьнілі дывэрсію на чыгунцы і адышлі насустрач намецкім войскам. Маюцца зьвесткі, што агулам дзеля выкананьня спэцзаданьняў на савецкую тэрыторыюбылі закінутыя 41 камандас. Аднак адсутнічаюць якія-колечы зьвесткі адносна складу іншых групаў, дакладнага часу перакіду іх праз нямецка-савецкую мяжу, а таксама вынікаў выкананьня заданьняў. Праўдападобна, што на савецкі бок са спэцзаданьнямі былі накіраваныя толькі вышэйзгаданыя 27 сябраў зьвязу, тым часам, як астатнія 14 жаўнераў па нейкіх прычынах не былі заангажаваныя да ўдзелу ў акцыях на тэрыторыі БССР і знаходзіліся ў Прушкаве.
Пасьля нападу Нямеччыны на Савецкі Саюз 22 чэрвеня 1941 г. і імклівага прасоўваньня нямецкіх войскаў на ўсход, баявое выкарыстаньне 1-га Беларускага штурмовага зьвязу, па выкананьні выведна-дывэрсійных заданьняў, стала бязсэнсоўным і немэтазгодным. У сувязі з гэтым, беларускія камандас былізадзейнічаныя дзеля выконваньня вартавых і паліцыйных функцыяў на акупаванай немцамі тэрыторыі Беларусі. У прыватнасьці, у верасьні 1941 г. асабовы склад штурмовага зьвязу быў уключаны ў склад менскай паліцыі парадку.. Па сутнасьці, з гэтага моманту 1-ы Беларускі штурмовы зьвяз спыніў сваё існаваньне як адзінка

спэцыяльнага прызначэньня. Вайсковую вартасьць жаўнераў зьвязу, пасьля ўключэньня ў беларускую паліцыю ў Менску, яскрава характарызуе ў сваіх успамінах Франц Кушаль, які пісаў наступнае: “сярод маладых хлапцоў гэтага зьвязу былі некаторыя вельмі працавітыя, але частка зь іх складалася з п’яніцаў”.24
Складана прасачыць пасьляваенны далейшы лёс удзельнікаў 1-га Беларускага штурмовага зьвязу. Аднак у дачыненьні да асобных былых жаўнераў гэтае дывэрсійнае адзінкі зьвесткі захаваліся. Так, напрыклад, Уладзімер Качан у студзені 1945 г. уступіў у 1-ы кадравы батальён Беларускай краёвай абароны ў Бэрліне, потым — у 1-ю грэнадзёрскую штурмовую брыгаду “Беларусь”.. Пасьля вайны ён жыў на эміграцыі й нейкі час падтрымліваў сувязі з беларускім актывам. Па некаторых зьвестках, яшчэ адзін былы вайсковец зьвязу Альбэрт Асоўскі, па заданьні кіраўніцтва беларускага нацыянальнага антынацыскага супраціву, у 1941 г. наведаў Швэдыю з мэтай навязаньня кантактуз прадстаўнікамі заходніх хаўрусьнікаў.25 Вядома, што пэўная частка былых жаўнераў зьвязу па вайне засталіся на чужыне. Некаторыя бралі ўдзел у беларускай дзейнасьці. Сярод апошніх знаходзіўся і Браніслаў Даніловіч,які падчас службы ў штурмовым зьвязе быў хронікарам.26
Варта падкрэсьліць, што штурмовы зьвяз быў не адзіным беларускім дывэрсійным аддзелам, які напярэдадні нямецка-савецкай вайны быў створаны спэцслужбамі Нямеччыны. Маюцца зьвесткі, што па лініі прадстаўніцтва Варшаўскага камітэту ў Бела-Падлясцы, шляхам дабраахвотнага вярбунку беларусаў-польскіх ваеннапалонных, быў сфармаваны 32-асабовы аддзел беларускіх парашутыстаў на чале з былым капітанам Войска Польскага Юры Вежанам.Дывэрсійную падрыхтоўку гэты аддзел атрымаў у Сілезіі. У чэрвені 1941 г. камандас Вежана былі дэсантаваныя ў раёне Сувалкаў на тэрыторыю БССР з мэтай правядзеньня дывэрсіяў. Аднак у хуткім часе яны былі затрыманыя савецкімі памежнікамі і апынуліся ў турме ў Ломжы, адтуль іх вызвалілі наступаючыя нямецкія войскі. Аднак гэтыя дадзеныя патрабуюць удакладненьня. 27
Вышэйзгаданыя дывэрсійныя аддзелы ў апэратыўным значэньні былі падпарадкаваныя спэцыяльнаму выведнаму штабу “Валі”, а ў тактычным — камандаваньню Вучэбнага палка асобага прызначэньня “Брандэнбург-800”. У заданьне беларускіх дывэрсантаў уваходзіла галоўным чынам дывэрсія на чыгунцы — падрыў мастоў, рэйкаў на асноўных камунікацыях савецкіх войскаў,парушэньне тэлеграфна-тэлефоннай сувязі, захоп і зьнішчэньне вайсковых складоў, зьнішчэньне каманднага складу Чырвонай Арміі. Яны мусілі ажыцьцяўляць шпіянаж і выведку на тэрыторыі 50-100 кілямэтраў наперад часьцей Вэрмахту.
Робячы падрахунак дывэрсійнай дзейнасьці вышэйзгаданых аддзелаў, трэба адзначыць, што беларускія камандас мусілі дзейнічаць супраць аднойз найбольш баяздольных фармаваньняў Чырвонай Арміі — Заходняй асобайвайсковай акругі (ЗахАВА), у прыватнасьці ў тыле 3-й, 4-й, 10-й ды 13-й арміяў. Апрача таго, беларускія жаўнеры мелі надта сьціслы час падрыхтоўкі да выведна-дывэрсійнай дзейнасьці — трохі больш месяца. Тым больш, што ў мінулым жаўнерам-беларусам не даводзілася займацца дывэрсійнай дзейнасьцю. Відавочна, гэта стала прычынаю раптоўнага выкрыцьця чырвонаармейцамі некаторых дывэрсійных групаў зьвязу. Акрамя таго, на беларусаў не ўскладаліся гэткія істотныя задачы, як, напрыклад, на жаўнераў палка “Брандэнбург-800”, якія па-сутнасьці да падыходу асноўных сілаў Вэрмахту цалкам захапілі Берасьце, альбо на ўкраінскі батальён “Нахцігаль”, вайскоўцы якого апанавалі Львоў.
Гісторыя дзейнасьці 1-га Беларускага штурмовага зьвязу была кароткай.Але сам факт існаваньня гэтага аддзелу камандас сьведчыць пра тое, што ўгады Другой сусьветнай вайны сярод беларусаў прысутнічалі асобныя прадстаўнікі, якія спрабавалі стварыць выведна-дывэрсійныя аддзелы спэцыяльнага прызначэньня. Выкарыстоўваючы тагачаснае палітычнае і вайсковае становішча, яны намагаліся атрымаць ад немцаў дазвол на фармаваньне падобных аддзелаў, якія б у будучыні мусілі стаць асяродкам і стрыжнем беларускага войска. Асноўным арганізатарам і рухавіком стварэньня беларускіх аддзелаў

камандас зь нямецкага боку выступаў Абвэр, кіраўнікі якога, нягледзячы на недалёкабачлівую расавую тэорыю нацыстоўцаў, ня грэбавалі супрацоўніцтвам з вызвольнымі рухамі паняволеных СССР народаў. Разам з тым, нямецкія колы прагнулі выкарыстаць беларускіх дывэрсантаў у сваіх кораткачасовых мэтах у якасьці "гарматнага мяса", абмінаючы інтарэсы беларусаў у іхным імкненьні да стварэньня сапраўднай беларускай узброенай сілы. Тым ня менш, стварэньне й дзейнасьць 1-га Беларускага штурмовага зьвязу не было зьяваю дарэмнай і нікчэмнай. У рэчаіснасьці штурмовы зьвяз стаўся першым беларускім нацыянальным вайсковым фармаваньнем падчас Другой сусьветнай вайны на нямецкім баку. Ён паклаў пачатак новаму (пасьля пэрыяду БНР) гістарычнаму этапу фармаваньня беларускага войска. Недабразычліўцы нярэдка дакараюць жаўнераў зьвязу, даводзячы, што ўдзел у дывэрсійнай дзейнасьці ў тыле савецкіх войскаў у першыя ж дні вайны — гэта "несумленная гульня" й здрада. Аднак дывэрсія і выведка ў глыбокім тыле — гэта тактыка войскаў спэцыяльнага прызначэньня любой краіны. Варта тут адцеміць, што ні адзін удзельнік 1-га Беларускага штурмовага зьвязу ня меў савецкага грамадзянства, таму зь юрыдычнага гледзішча ўдачыненьні да іх неправамоцна дапасоўваць гэткі панятак, як "здраднік"ці "паслугач". Апрача таго, гонар робіць той факт, што вышэйзгаданая фармаваньне належыла да элітнага роду зброі любых узброеных сілаў сьвету —г. зв. камандас (войскаў спэцыяльнага прызначэньня). Гэткім чынам, гісторыя 1-га Беларускага штурмовага зьвязу ёсьць асобнай старонкай гісторыі беларускага нацыянальнага войска ў XX стагодзьдзі.

Спасылкі:

1 Мадер Юлиус. Абвер: щит и меч Третьего рейха. Ростов на Дону, 1999, б. 232.
2 Иоффе Эмануил. Диверсанты // Во славу Родины, 1999, 15 траўня.
3 Madajczyk Cz. Dramat katycski. Warszawa, 1989, s.129.
4 Archiwum Centralnego Muzeum Jeccow Wojennych w Jambinowicech-Opolu (ACMJW). Sygn.: WASt IB. L. 15.5 НА РБ. ф. 988. в.1. спр. 5. арк. 85.
6 Раніца. Беларуская тыднёвая газэта ў Нямеччыне. 1940, 20 верасьня.
7 Соловьев А. К. Белорусская Центральная Рада: создание, деятельность, крах. Мн., 1995, б. 99, 102.
8 Раніца, 1940, 21 лютага.
9 ACMJW. Sygn.: WASt. Of. XA. L. 7.
10 CAJW. Sygn.: WASt. St. XXIA. L. 255.
11 Archiwum Polskiego Czerwonego Krzyza. Sygn.: 06826.
12 Першы зьвяз // Беларускі Голас, 1981, №289.
13 Беларуская бібліятэка імя Ф. Скарыны, Дзёньнік унутраных загадаў 1-га Беларускага штурмовага зьвязу.
14 Тамсама.
15 Тамсама.
16 Тамсама.
17 Тамсама.
18 Тамсама.
19 Беларуская бібліятэка імя Ф. Скарыны, Справаздача Ул. Качана ад 29 студзеня 1945 г..
20 Беларуская бібліятэка імя Ф. Скарыны, Дзёньнік унутраных загадаў 1-га Беларускага штурмовага зьвязу.
21 Беларуская бібліятэка імя Ф. Скарыны, Справаздача Ул. Качана ад 29 студзеня 1945 г..
22 Туронак Юры. Беларусь пад нямецкай акупацыяй. Мн., 1993, б. 207.
23 Беларуская бібліятэка імя Ф. Скарыны, Справаздача Ул. Качана ад 29 студзеня 1945 г.
24 Кушаль Франц. Спробы стварэньня беларускага войска. Мн., 1999, б. 39.
25 Вежан Ян [Ёрш Сяргей]. Першы штурмовы зьвяз // Пагоня. 1995, 2 сакавіка.

26 Служыў беларускай справе // Беларус, 2003, №489.
27 Найдзюк Язэп, Касяк Іван. Беларусь учора й сяньня. Мн., 1993, б. 255.

СПРАВАЗДАЧА КАМАНДЗІРА 1-га БЕЛАРУСКАГА ШТУРМОВАГА ЗЬВЯЗУ Уладзімера КАЧАНА ДА ШЭФА ГАЛОЎНАГА ВАЙСКОВАГА КІРАЎНІЦТВА БЕЛАРУСКАЙ ЦЭНТРАЛЬНАЙ РАДЫ генэрала-маёра Кастуся ЕЗАВІТАВА ад 29 студзеня 1945 г.*

Качан Уладзімер Бэрлін, 29.1.45 г.
Б. Камандант Лямздорскае
дэсантнае школы

Спадару Кіраўніку Вайсковага Аддзела Б.Ц.Р.

Бэрлін

Школа дзе я быў камандантам і камандзірам І Штурмовага Беларускага Зьвязу была у Лямздорфе, павет Опэлін, лягер II.
Час трываня курсу быў аблічаны на 2 месяцы пачаўшы ад 1.V.1941 г.
Праграм курсу наступны:
1) Запазнаньне курсантаў із новаю зброяю як нямецкаго так і савецкаго іабарона проціў савецкай зброі.
Кажды з курсантаў мусяў дакладна ведаць і умець страляць за усіх відаўкулямётаў як нямецкіх так і савецкіх. Апрача гэтага была вінтоўка і пісталет, а таксама гранаты нямецкія і савецкія. Велізарную увагу зварочвалі на барацьбу на “фінскім нажы”.
2) Запазнаньне с узрыўчымі матарьяламі: закладанне і здыманьне мін (узрываньне мастоў, чугункі, будынкаў і г. д.).
3) Умець чытаць карту. Ар’ентацыя у тэрэне карты. Распазнаньне часьцяўсьвета па компасе, гадзінніку, зьвёздах, у лесе і г. д. Адзін с тройкі мусяў умець накідаць дакладны шкіц мясцовасьці.
На гэтыя тры прадметы найбольш клалі увагу.
Апрача гэтага курсанты мелі:
1) Муштру нямецкую і беларускую. Ня маючы беларускага вайсковага статуту, трэба было сумесна з вызначаным праз мяне рэфарэнтам вайсковым, брацьматарьял с нямецкага і польскага статуту і дабіраць беларускія словы.
2) Запазнаньне с рангамі нямецкае і савецкае арміяў.
3) Капаньне правізарычных акопаў.
4) Аддаваньне гонараў.
5) Унутранная служба у казармах.
6) Плывацкія курсы. Спорт і гімнастыка.
7) Літаратура, гэографія і гісторыя Беларусі (коратка).
8) Курсы нямецкае мовы.
9) Першая помач раняным.
10) Пеяньне песьняў нямецкіх а пераважна беларускіх. Мелі свайго дамарослага паэта Данілевіча, які укладаў змест песьняў вайсковых: падбіраўсяматыў. Две песьні былі умешчаные у “Беларускай Менскае Газэце”.
Курс быў зарваны у дні перад вайною нямецка-бальшавіцкаю. Гэтага дня зборка сябраў курсу, дзе спэцыяльны прадстаўнік Міністэрства у рангі маёра, выявіў мэты курсу і даў адзін дзень да развагі. Кожны с курсантаў мог ісьці або ня ісьці на другую сторану. Я гэта усё праводзіў і для гэтага адабраў прысягу заўчасу. Было толькі 3 чалавекі якія адказаліся. Очы

усіх былі скіраваны на мяне. Калі б я адказаўся — адказаліся бы усе. Я тады быў хворы меў тэмпэратуру 38,9 — аднак не зрэзыгнаваў і паішоў.
Групамі якія перакідаліся на другую сторану лічылі па 3 чалавекі. Я вёў 3групы па 3, разам са мной 10 чалавек.
Выпасажэньне людзей было наступнае:
1 машыновы пісталет мадэль 38 – на тры чалавекі
компас – на тры чалавекі
4 магазынкі амуніцыі на кожны м. п.
Кожны сябра атрымаў:
пісталет “F.N” кал. 7,65, амуніцыі па 25 штук ад 4 і больш польскіх гранатаў, фінскі нож, на 3 дні прадукты харчаваньня, а таксама кожная група дастала сваёзаданьне.
Уся акта праграмы навучаньня і шкаленьня, кніжка рапартоў падафіцэраслужбовага, кніжка працы засталі на Беларусі схаваныя (закопаныя) праз мяне. Хроніка засталася у хронікара. Я толькі узяў с сабою кніжку загадаў, якую прдставіў Вам да агляду.
Уладзімер Качан
б. кам. школы і I штурмовага беларускага зьвязу.
P. S. На курсе было 52 сябры у гэтым ліку 1 б. польскі паручнік (беларус) і 2-х падхаронжых.

** Дакумэнт падаецца ў мове арыгіналу бяз зьменаў і рэдагаваньня.*
*Крыніца: Беларуская бібліятэка імя Ф. Скарыны (Лёндан)*

СЬПІС АСАБОВАГА СКЛАДУ 1-га БЕЛАРУСКАГА ШТУРМОВАГА ЗЬВЯЗУ*

1. Акінчыц Станіслаў, падафіцэр Беларускага штурмовага зьвязу. 15 чэрвеня 1941 г. дзеля выкананьня спэцзаданьня накіраваны на савецкую тэрыторыю. Далейшы лёс невядомы.
Па іншых зьвестках — Акінчык (Туронак Ю. Беларусь пад нямецкай акупацыяй. Менск, 1993, б. 207). — Заўвага Рэд. “БР”.
2. Аляхновіч Робэрт, падафіцэр Беларускага штурмовага зьвязу. Далейшы лёс невядомы.
3. Асоўскі Альбэрт, падафіцэр Беларускага штурмовага зьвязу. 15 чэрвеня 1941г. дзеля выкананьня спэцзаданьня накіраваны на савецкую тэрыторыю. У 1941 г.выехаў у Швэцыю. Далейшы лёс невядомы.
Паводле беларускага эміграцыйнага дасьледчыка В. Пануцэвіча, Асоўскі быў узнагароджаны жалезным крыжам за ўдзел “у акцыях Першага Штурмовага Зьвязу”. Па адукацыі ён быў архітэктарам. У Швэцыю Асоўскі выехаў праз Нарвэгію. Гл.: Беларуская царква (Чыкага), 1965, № 28, б. 93, 94. — Заўвага Рэд. “БР”.
4. Бартош Янка. Нарадзіўся ў 1915 г. у в. Нічбадзезье (павет Ваўкавыск). У 1939 г. мабілізаваны ў Польскае войска. Служыў у 42-м пяхотным палку (Беласток). Стралец. У нямецкі палон трапіў 19 верасня 1939 г. каля Чырвонага Бору. Утрымліваўся ўшталагу XXB, потым XXA і XIA. Парадкавы нумар ваеннапалоннага 31232. Вызвалены 22 жніўня 1940 г. і накіраваны ў Брэйтэнфэльд. У дакумэнтах паходжаньне пазначанае як “pole russe”. У 1941 г. уступіў у Беларускі штурмовы зьвяз. Падафіцэр Беларускага штурмовага зьвязу. Далейшы лёс невядомы.
5. Бранішэўскі Мікалай, падафіцэр Беларускага штурмовага зьвязу. 19 чэрвеня 1941 г. дзеля выкананьня спэцзаданьня накіраваны на савецкую тэрыторыю.. Далейшы лёс невядомы.
6. Быцько Мікалай, жаўнер Беларускага штурмовага зьвязу. Інструктар памінннай справе. Інтэндант зьвязу. У 1939 г. служыў у Польскім войску. 19 чэрвеня 1941 г. дзеля выкананьня спэцзаданьня накіраваны на савецкую тэрыторыю. Далейшы лёс невядомы.
7. Бярцэвіч Міхал, падафіцэр Беларускага штурмовага зьвязу. 19 чэрвеня 1941 г.. дзеля выкананьня спэцзаданьня накіраваны на савецкую тэрыторыю. Далейшы лёс невядомы.

8. Вагель Павал, жаўнер Беларускага штурмовага зьвязу. 19 чэрвеня 1941 г. дзеля выкананьня спэцзаданьня накіраваны на савецкую тэрыторыю. Далейшы лёс невядомы.
9. Вайноўскі Станіслаў, жаўнер Беларускага штурмовага зьвязу. Далейшы лёс невядомы.
10. Вайноўскі Францішак, падафіцэр Беларускага штурмовага зьвязу. 19 чэрвеня 1941 г. дзеля выкананьня спэцзаданьня накіраваны на савецкую тэрыторыю.. Далейшы лёс невядомы.
11. Валанцей Эдвард, жаўнер Беларускага штурмовага зьвязу. Адказны за нацыянальна-выхаваўчую працу. 19 чэрвеня 1941 г. дзеля выкананьня спэцзаданьнянакіраваны на савецкую тэрыторыю. Далейшы лёс невядомы.
12. Валасэвіч Браніслаў. Нарадзіўся ў Польшчы. Удзельнік польскага антынацыскага падпольля. У 1940 г. уступіў у Беларускі камітэт у Варшаве. 10 траўня 1941 г. накіраваны ў Беларускі штурмовы зьвяз. Жаўнер. Падчас дэсантаваньня 15 чэрвеня 1941 г. на савецкую тэрыторыю патрапіў у палон да Чырвонай Арміі. Далейшы лёс невядомы.
13. Валасэвіч Станіслаў, сын Юзафа. Нарадзіўся 29 траўня 1906 г. у мясцовасьціДырнаў. У 1939 г. мабілізаваны ў Польскае войска. Служыў у 64-м пяхотным палку (Грудзёндз, Польшча). Капрал. У нямецкі палон трапіў 17 верасьня 1939 г. каля Ловіча. Утрымліваўся ў шталагах XIB. Парадкавы нумар ваеннапалоннага 2070. Вызвалены 21 чэрвеня 1940 г. і накіраваны ў Фрэркінг. У дакумэнтах паходжаньне пазначанае як “паляк”. У 1941 г. уступіў у беларускі штурмовы зьвяз, падафіцэр. 15 чэрвеня 1941 г. дзеля выкананьня спэцзаданьня накіраваны на савецкую тэрыторыю. Далейшы лёс невядомы.
14. Валанцэвіч Эдвард, падафіцэр Беларускага штурмовага зьвязу. Далейшы лёс невядомы.
15. Габінскі Канстанты, намесьнік камандзіра Беларускага штурмовага зьвязу. У 1939 г. служыў у Польскім войску. 19 чэрвеня 1941 г. дзеля выкананьня спэцзаданьня накіраваны на савецкую тэрыторыю. Далейшы лёс невядомы.
16. Гадэмайер Мар’ян, жаўнер Беларускага штурмовага зьвязу. Далейшы лёс невядомы.
17. Гальчынскі Вацлаў, падафіцэр Беларускага штурмовага зьвязу. 15 чэрвеня 1941 г. дзеля выкананьня спэцзаданьня накіраваны на савецкую тэрыторыю. Далейшы лёс невядомы.
18. Гапунік Вацлаў, жаўнер Беларускага штурмовага зьвязу. Далейшы лёс невядомы.
19. Гапунік Яўхім, жаўнер Беларускага штурмовага зьвязу. 29 траўня 1941 г. выбыў да хаты. Далейшы лёс невядомы.
20. Гардзіевіч Тадэвуш, жаўнер Беларускага штурмовага зьвязу. 15 чэрвеня 1941 г. дзеля выкананьня спэцзаданьня накіраваны на савецкую тэрыторыю. Далейшы лёс невядомы.
21. Голас Аляксандар. Нарадзіўся 1 студзеня 1915 г. у в. Ільля (Вялейскі павет, Віленскае ваяводзтва). У 1939 г. мабілізаваны ў Польскае войска. Служыў у Варшаве. Капрал. Трапіў у нямецкі палон. Утрымліваўся ў шталагу IB. Парадкавы нумар ваеннапалоннага 51210. У дакумэнтах паходжаньне пазначанае як “беларус”.. У 1941 г. уступіў у Беларускі штурмовы зьвяз, падафіцэр. 19 чэрвеня 1941 г. дзелявыкананьня спэцзаданьня накіраваны на савецкую тэрыторыю. Далейшы лёсневядомы.
22. Гуменік Гэнрык, жаўнер Беларускага штурмовага зьвязу. 19 чэрвеня 1941 г. дзеля выкананьня спэцзаданьня накіраваны на савецкую тэрыторыю. Далейшылёс невядомы.
23. Даніловіч Браніслаў. Нарадзіўся 20 лістапада 1908 г. на Ашмяншчыне. Напярэдадні пачатку Другой сусьветнай вайны выехаў на працу ў Латвію, дзе наладзіў сувязь з баронам Энгельгартам. Пазьней пераехаў у Нямеччыну, дзе спрычыніўся да беларускай дзейнасьці. У 1941 г. уступіў у Беларускі штурмовы зьвяз. Хронікар зьвязу і адказны за культурніцка-асьветную працу сярод асабовага складу. Аўтар маршавай песьні “Гэта йдзе першы зьвяз наш штурмовы”. У гады нямецкай акупацыі працаваў у цывільнай адміністрацыі на Смаленшчыне. Па вайне жыў у ЗША. Памёр 29 верасьня 2003 г. у Нью-Брансуіку.
24. Зубовіч Язэп, жаўнер Беларускага штурмовага зьвязу. 25 траўня 1941 г. выбыўда хаты. Далейшы лёс невядомы.

25. Зялінскі Лявон, жаўнер Беларускага штурмовага зьвязу. 15 чэрвеня 1941 г. дзеля выкананьня спэцзаданьня накіраваны на савецкую тэрыторыю. Далейшылёс невядомы.
26.  Карпушка Язэп, падафіцэр Беларускага штурмовага зьвязу. Далейшы лёсневядомы.
27. Качан Уладзімер. У 1939 г. знаходзіўся ў Польскім войску. Падхаружы. У 1941 г. уступіў у беларускі штурмовы зьвяз. Камандзір. 19 чэрвеня 1941 г. дзеля выкананьня спэцзаданьня накіраваны на савецкую тэрыторыю. У 1941 — 1942 г. служыў у паліцыі парадку ў Менску. У студзені 1945 г. дабраахвотнікам уступіў у 1-ю беларускую грэнадзёрскую штурмовую брыгаду “Беларусь”. Па вайне жыў на эміграцыі. Нейкі час падтрымліваў стасункі зь некаторымі сябрамі “Беларускага хаўрусу” у Францыі.
28. Мацюшонак Станіслаў, жаўнер Беларускага штурмовага зьвязу. Далейшылёс невядомы.
29. Пажондны Язэп, жаўнер Беларускага штурмовага зьвязу. 29 траўня 1941 г. выбыў да хаты. Далейшы лёс невядомы.
30. Панцялей Юстын, жаўнер Беларускага штурмовага зьвязу. Далейшы лёс невядомы.
31. Панятоўскі Язэп, падафіцэр Беларускага штурмовага зьвязу. 19 чэрвеня 1941 г. дзеля выкананьня спэцзаданьня накіраваны на савецкую тэрыторыю. Далейшы лёс невядомы.
32. Паўлоўскі Сьцяпан, жаўнер Беларускага штурмовага зьвязу. 29 траўня 1941 г.выбыў да хаты. Далейшы лёс невядомы.
33. Пацэвіч Браніслаў, жаўнер Беларускага штурмовага зьвязу. Далейшы лёс невядомы.
34. Рапіевіч Віктар, жаўнер Беларускага штурмовага зьвязу. Далейшы лёс невядомы.
35. Рапіевіч Рыгор, жаўнер Беларускага штурмовага зьвязу. 19 чэрвеня 1941 г. дзеля выкананьня спэцзаданьня накіраваны на савецкую тэрыторыю. Далейшылёс невядомы.
36. Сабіла Хведар, сын Васіля. Нарадзіўся 15 сьнежня 1917 г. у в. Сівіца (павет Маладэчна). У 1939 г. знаходзіўся ў Польскім войску. Служыў у 30-м пяхотным палку (Варшава). Трапіў у нямецкі палон. Утрымліваўся ў шталагу IA. Парадкавы нумарваеннапалоннага 61824. Вызвалены 20 лютага 1941 г. і накіраваны ў Генэральнае Губэрнатарства. У дакумэнтах паходжаньне пазначанае як “беларус”. У 1941 г. уступіў у Беларускі штурмовы зьвяз. 19 чэрвеня 1941 г. дзеля выкананьня спэцзаданьня накіраваны на савецкую тэрыторыю. Далейшы лёс невядомы.
37. Селява Янка, жаўнер Беларускага штурмовага зьвязу. 19 чэрвеня 1941 г. дзелявыкананьня спэцзаданьня накіраваны на савецкую тэрыторыю. Далейшы лёсневядомы.
38. Славэцкі Казімер, падафіцэр Беларускага штурмовага зьвязу. 19 чэрвеня 1941 г. дзеля выкананьня спэцзаданьня накіраваны на савецкую тэрыторыю. Далейшы лёс невядомы.
39. Станкевіч Яраслаў, падафіцэр Беларускага штурмовага зьвязу. 15 чэрвеня 1941 г. дзеля выкананьня спэцзаданьня накіраваны на савецкую тэрыторыю. Далейшы лёс невядомы. Паводле ўспамінаў польскай разьведчыцы Гражыны Ліпіньскай, Я. Станкевіч (“высокі беларус”) і два ягоныя сябры-дэсантнікі былі ў “калёне сьмерці”, якую НКВД гнала па Магілёўскім тракце зь менскай турмы ў канцы чэрвеня 1941 г. Беларускія дэсантнікі вялі пад рукі зморaных польскіх жанчынаў. (Lipin’ska G. Jes’li zapomne o nich... Warszawa, 1990. S. 136, 137). “Немцы перад агрэсіяй на СССР вышкалілі ў Бэрлінеі ў Варшаве вялікую групу беларускіх камандасаў і перакінулі іх праз Буг”, — успамінае Ліпіньска. (Тамсама, S. 148). Пра Я. Станкевіча згадвае таксама жыхарка Гдыні Ёанна Янушак. Яна, удзельніца польскага падпольля ў Лідзе, таксама была ў гэтай “калёне сьмерці”. Пасьля ўцёкаў, Янушак разам са Станкевічам перабіраліся ў бок Ліды. (Невяроўскі А. І праз 55 гадоў боль не сціхае // Наша Слова, 1996, 11 ліпеня, № 28).— Заўвага Рэд. “БР”.
40. Табалевіч Фэлікс, жаўнер Беларускага штурмовага зьвязу. 19 чэрвеня 1941 г.дзеля выкананьня спэцзаданьня накіраваны на савецкую тэрыторыю. Далейшы лёс невядомы.
41. Тачаноўскі Баляслаў, падафіцэр Беларускага штурмовага зьвязу. Далейшы лёс невядомы. Мог быць у складзе дэсанту на тэрыторыі БССР. Гл.: Туронак Ю. Беларусь пад нямецкай акупацыяй. Менск, 1993, б. 207. — Заўвага Рэд. “БР”.

42. Тур Аляксандар, сын Аляксандра. Нарадзіўся ў 22 лютага 1915 г. у в. Скамарошкі (павет Стаўпцы). У 1939 г. мабілізаваны ў Польскае войска. Служыў у сапёрным аддзеле 64-га пяхотнага палка (Грудзёндз, Польшча). Стралец. У нямецкі палон трапіў 18 верасьня 1939 г. каля Сахачова. Утрымліваўся ў шталагу IIIB. Парадкавы нумар ваеннапалоннага 10193. 5 жніўня 1940 г. пераведзены ў шталаг IA. У дакумэнтах паходжаньне пазначанае як “беларус”. У 1941 г. уступіў у Беларускі штурмовы зьвяз. 19 чэрвеня 1941 г. дзеля выкананьня спэцзаданьня накіраваны на савецкую тэрыторыю. Далейшы лёс невядомы.
43. Фёдарчук Язэп, падафіцэр Беларускага штурмовага зьвязу. Далейшы лёсневядомы. Адзін з варыянтаў прозьвішча — Федарчук. Беларускі нацыяналіст. У гады вайны выехаў у Швэцыю, дзе быў адным з закладчыкаў арганізацыі “Беларуская Грамада ў Швэцыі”. Па вайне жыў у Стакгольме, дзе і памёр. — Заўвага Рэд. “БР”.
44. Храновіч Лявон, падафіцэр Беларускага штурмовага зьвязу. 19 чэрвеня 1941г. дзеля выкананьня спэцзаданьня накіраваны на савецкую тэрыторыю. Далейшы лёс невядомы.
45. Цікота Янка, жаўнер Беларускага штурмовага зьвязу. Далейшы лёс невядомы.
46. Чудзяк Міхал. Нарадзіўся 14 верасьня 1917 г. у в. Козель (Казель). У 1939 г. знаходзіўся ў Польскім войску. Служыў у 19-м пяхотным палку (Львоў). Стралец. У нямецкі палон трапіў 18 верасьня 1939 г. каля мясцовасьці Воў. Утрымліваўся ў шталагу XA, адтуль быў накіраваны ў працоўную каманаду ў Дамэндопрфе. Парадкавы нумар ваеннапалоннага 21181. Вызвалены 3 сакавіка 1941 г. У дакумэнтах паходжаньне пазначанае як “украінец”. У 1941 г. уступіў у Беларускі штурмовы зьвяз. Далейшы лёс невядомы.
47. Чудук Міхал, падафіцэр Беларускага штурмовага зьвязу. 15 чэрвеня 1941 г. дзеля выкананьня спэцзаданьня накіраваны на савецкую тэрыторыю. Далейшылёс невядомы.
48. Шакоўскі Віктар, жаўнер Беларускага штурмовага зьвязу. 19 чэрвеня 1941 г., з мэтай выкананьня спэцзаданьня, быў накіраваны на савецкую тэрыторыю. Далейшы лёс невядомы.
49. Явік Янка, жаўнер Беларускага штурмовага зьвязу. 29 траўня 1941 г. выбыў дахаты. Далейшы лёс невядомы.
50. Якімовіч Альбін, сын Станіслава. Нарадзіўся 2 студзеня 1915 г. у в. Рупейкі (Ваўкавыскі павет). У 1939 г. быў мабілізаваны ў Польскае войска. Служыў у 6-м уланскім палку (Станіславаў). Капрал. Інтэрнаваны 21 верасьня 1939 г. на тэрыторыіВугоршчыны. Пазьней апынуўся ў нямецкім палоне. Утрымліваўся ў шталагу XVIIA. Парадкавы нумар ваеннапалоннага 06825. Вызвалены 9 траўня 1940 г. (па іншых крыніцах — 22 ліпеня 1940 г.) і накіраваны ў Варшаву. У дакумэнтах ён пазначаны як“паляк”. Падафіцэр Беларускага штурмовага зьвязу. Далейшы лёс невядомы.
51. Яцэвіч Павал, падафіцэр Беларускага штурмовага зьвязу. 19 чэрвеня 1941 г., з мэтай выкананьня спэцзаданьня, быў накіраваны на савецкую тэрыторыю. Далейшы лёс невядомы.

** Сьпіс складзены аўтарам на падставе дадзеных з Архіву Польскага чырвонага крыжа і Архіву Цэнтральнага музэю ваеннапалонных у Ламбінавіцах-Апольлі, а таксама Дзёньніка ўнутраных загадаў 1-га Беларускага штурмовага зьвязу, які цяпер захоўваецца ў Беларускай бібліятэцы імя Ф. Скарыны ў Лёндане.*

Паводле паказаньняў арыштаванага Б. Валасэвіча, у ягонай групе знаходзіўся таксама дэсантнік Сядынскі (Туронак Ю. Беларусь пад нямецкай акупацыяй. Менск, 1993, б. 207), прозьвішча якога, аднак, адсутнічае ў Дзёньніку ўнутраных загадаў. — Заўвага Рэд. “БР”.

*Міхась Варанец*

**Нацыянальна-патрыятычны рух беларускіх вайскоўцаў у канцы 1980-х – першай палове 1990-х гадоў**

Досі ўжо браты чужынцам мы служылі,
Досі ўжо пашаны ім прыдбалі.
Не сваю, чужую долю баранілі.
Пад чужымі сьцягамі ўміралі.
М. Багдановіч

Асноўнай крыніцай для напісаньня гэтага дасьледаваньня зьяўляюцца дакумэнты, што выпрацоўваліся нацыянальна-патрыятычнымі арганізацыямівайскоўцаў. Іншая крыніца — пэрыядычны друк. Аб'ектыўнасьць гэтых крыніцаў пацьвярджаецца пры аналізе дакумэнтаў і выступленьняў у друку апанэнтаў нацыянальна-патрыятычнага руху вайскоўцаў. Асаблівасьцю данай працы зьяўляецца тое, што яна напісаная, вобразна кажучы, па сьвежых сьлядах. Таму ў яе ўключаныя шматлікія неапублікаваныя матэрыялы, а інфармацыя пра многія факты была запісаная са слоў непасрэдных удзельнікаў нацыянальна-патрыятычнага руху. Асноўным чыньнікам, што гарантуе аб'ектыўнасьць такіх вусных сьведчаньняў зьяўляюцца рэальныя, агульнавядомыявынікі такой дзейнасьці.
Актуальнасьць данага дасьледаваньня тлумачыцца найперш тым, што цяпер (1996 г.), калі нашая маладая дзяржава робіць першыя крокі на шляху самастойнага разьвіцьця, калі ўсё яшчэ існуе пагроза незалежнасьці Беларусі (найперш — унутраная), найважнейшай задачай зьяўляецца патрыятычнае выхаваньне як ва Ўзброеных Сілах Рэспублікі Беларусь, так і ва ўсім грамадзтве. Асабліва важная справа — выхаваньне моладзі. А моладзь ахвотней успрымае дзейнасьць сучасьнікаў, чымсьці далёкіх і ня вельмі далёкіх продкаў.

*Міхась Варанец — палітык, грамадзкі дзеяч, гісторык, адзін з заснавальнікаў Беларускага згуртаваньня вайскоўцаў, маёр запасу. Жыве ў Слоніме.. З гэтага нумару "БР" распачынае публікацыю яго дасьледаваньня напісанага ў 1996 годзе і прысьвечанага беларускаму вайсковаму руху 1980 — 1990-х гг. М.Варанец даводзіць, што з 1988 году ва Ўзброеных Сілах СССР, а потым ва Ўзброеных Сілах Беларусі існаваў арганізаваны нацыянальна-патрыятычны рух, дзейнасьць якога была скіравана на здабыцьцё незалежнасьці Беларусі, на стварэньне і ўмацаваньне беларускага войска. Нацыянальна-патрыятычны рухвайскоўцаў быў сапраўдным народным рухам, які ўзьнік і разьвіваўся зьнізу і ня быў прыўнесены ў войска звонку. Дзейнасьць яго ўдзельнікаў-вайскоўцаў была накіравана на абарону беларускай дзяржаўнасьці, дэмакратыіі правоў чалавека. Цягам 9 гадоў аўтар не аддаваў сваю працу ў друк, каб не нашкодзіць сябрам па нацыянальна-патрыятычнаму руху. Па гэтай жа прычынеў дасьледаваньні ня згадваюцца імёны многіх актывістаў руху. — "БР"*

ПЕРШЫЯ НАЦЫЯНАЛЬНА-ПАТРЫЯТЫЧНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ БЕЛАРУСКІХ ВАЙСКОЎЦАЎВА ЎЗБРОЕНЫХ СІЛАХ СССР (1988 – 20.08.1991 гг.)

Дзе раней мы былі?
Ды баланду па турмах хлябалі,
Па бясконцых этапах брылі
І ў сібірскіх сьнягах паміралі.

Дзе раней мы былі?

Трохі ў родных палетках і хатах.
Ну, а рэшта? У чорнай зямлі
У праклятых навек Курапатах.

Дзе яшчэ мы былі?
Ды псіхушкі цішком абжывалі,
Ці гарэлку бяз спыну пілі,
Ці ў адчаі зацятым маўчалі.

Як народу жылося,
Мы таксама жылі.

Ды вось выцяў мароз
  па чырвонай чуме
І мы зноў, нібы Фенікс, паўсталі.
І ўвесь зброд бальшавіцкі
  ад жаху зьнямеў
Бо нас бачыць жывымі даўно
  не чакалі.
Ну а зараз,
  як шок з іх паціху зышоў,
Зашыпелі і крык паднялі
І вішчаць
Як пра самы сьмяротны з грахоў:
"Дзе раней вы былі"
С. Суднік

Прычыны ўзьнікненьня першых нацыянальна-патрыятычных арганізацый вайскоўцаў
На працягу ўсяго часу існаваньня СССР у яго Ўзброеных Сілах служыла шмат беларусаў. Жаўнерамі-беларусамі камплектаваліся найбольш адказныявіды і роды войскаў. Так, напрыклад, у Ваенна-марскім Флоце СССР у 1980-х іх колькасьць даходзіла да 50% ад агульнага складу (па падліках гісторыка Алега Трусава). У тыя ж гады па колькасьці афіцэраў Савецкай Арміі і Ваенна-марскога флоту, у працэнтных адносінах да колькасьці сваёй нацыі, беларусы былі на першым месцы. На першым месцы беларусы былі і па адноснай колькасьці загінуўшых у Афганістане. Агульнавядомы як высокі ўзровень ваеннай вывучкі беларусаў, так і іх надзейнасьць.
У савецкія часы гэта былі людзі, выхаваныя ў духу савецкага патрыятызму і пралетарскага інтэрнацыяналізму. У пераважнай большасьці зь іх былопачуцьцё сваёй беларускай адметнасьці, але ніхто над гэтым не задумваўся і ня змог бы асэнсавана адказаць — у чым заключаецца яго беларускасьць.
Эдуард Дубянецкі тлумачыў гэта тым, што, пачынаючы з XIX стагодзьдзя, "значная частка беларускага народу апынулася ў стане нацыянальнага анабіёзу, калі энэргія, воля беларусаў былі паралізаваны, ня маючы належныхварункаў для свайго развіцьця і практычнага ўвасабленьня".1 На думку Э.Дубянецкага, вельмі трапна такі стан ахарактарызаваў беларускі палітык часоў БНР Аляксандар Цьвікевіч, які адзначаў, што Беларусь "...нацыянальна не памірала, але і не жыла. 2 Але нават сярод вайскоўцаў-афіцэраў былітакія, хто і ў задушлівыя 1970-я і 1980-я гады паслугоўваліся беларускай мовай у сваіх сем'ях. Відавочна, што нацыянальны дух сярод беларусаў-вайскоўцаў ва Ўзброеных Сілах СССР патэнцыяльна існаваў. Але дзеля таго, каб ён праявіўся, патрэбны былі адпаведныя ўмовы. Такой умовай стала палітыка "галоснасьці", распачатая тагачасным генэральным сакратаром ЦК КПСС

М.Гарбачовым. Яна спрыяла распрыгоньваньню сьвядомасьці людзей, дазволіла імдаведацца праўду пра сваю гісторыю. Гэта паступова вяло да абуджэньня інацыянальнай сьвядомасьці, у тым ліку і сярод вайскоўцаў-беларусаў.

**Нацыянальныя арганізацыі беларускіх вайскоўцаў за межамі Беларусі**

**Рокаш беларускіх вайскоўцаў у Казахстане**

Першая нацыянальна-патрыятычная суполка беларусаў-вайскоўцаў за межамі Беларусі ўзьнікла ў г. Прыазёрску Казахскай ССР (вайсковая часьць 03866).Заснавальнікам яе быў афіцэр, ураджэнец Нясьвіжчыны Станіслаў Суднік.

Усё сваё сьвядомае жыцьцё С.Суднік зьяўляецца патрыётам Беларусі. З 1977 году ён быў сталым падпісчыкам беларускамоўных газэтаў "Звязда" і "Літаратура і мастацтва". Але патрыятызм гэты быў большай часткай пасіўны. Пералом адбыўся ў 1988 годзе (прычына — перапляценьне акалічнасьцяў асабістых з вонкавымі, грамадзкага кшталту — "галоснасьць" і г.д.). Пасьля некаторага перапынку С.Суднік піша вершы (з 1985 г. нічога не пісаў), якія ўжо клічуць да актыўнай дзейнасьці: 15 траўня 1988 году — "Пагоня за мову" (надрукаваны ў часопісе "Полымя" за 1992 г., № 4); 18 траўня 1988 г. — "Ці не падумалі панове" (не апублікаваны); 28 траўня 1988 г. — "Суд" (надрукаваны ў газэце "Рокаш", 1990, жнівень, № 1 і ў газэце "Наша слова", 1990, верасень, № 7). Верш "Суд" стаўся для аўтара праграмным у яго нацыянальна-патрыятычнай дзейнасьці:

Гэй, устаньце беларусы,
На суд мацяры-зямлі,
Адкажыце беларусы,
Вы за колькі прадалі
Мову нашу, мову маці,
Мову пушчаў і бароў
Мову Койданаўскай раці
І Грунвальдскіх ваяроў?...
...Вас спытаюць вашы дзеці
Што пакінулі вы ім,
А ў адказ вы зазванеце
Срэбрам Юдавым сваім. З

З гэтага часу пачалася энэргічная дзейнасьць С.Судніка на карысьць беларускага Адраджэньня. У 1988 годзе ён паступае ў вайсковую акадэмію ў горадзе Калінін (цяпер — Цьвер) і на прыватнай сустрэчы з аднакашнікамі, выпускнікамі Менскай вышэйшай інжынэрнай зянітна-ракетнай вучэльні чытаесвае травеньскія, 1988 году, вершы. Аднакашнікі пазнаёмілі Судніка з падпалкоўнікам Вінцэнтам Чорным, лідэрам беларускага зямляцтва ў акадэміі. У кастрычніку 1988 г. С.Суднік, будучы на Радзіме, адмыслова заязджае ў Гомель да свайго сябра Алеся Міткаўца (выгнанага ў свой час з унівэрсытэту за "нацыяналізм"), а ў Менску праз газэты знаходзіць Ігара Чарняўскага, зь якім быў знаёмы яшчэ з 1975 г. па клюбу аматараў піва Менскага ўнівэрсытэту. Гэта былі важныя сустрэчы, на якіх ішла гутарка аб сытуацыі ў Беларусі і шляхах нацыянальнага Адраджэньня. З усім гэтым багажом (інфармацыя, літаратура, асабістыя ўражаньні) Суднік паляцеў у Казахстан. У вайсковай часьці С.Суднік азнаёміў з літаратурай афіцэраў — ураджэнцаў Беларусі і, найперш, Ігара Супаненку, сьвядомага афіцэра-беларуса. Такая прапагандысцкая работа сярод вайскоўцаў-землякоў вялася няспынна.. З 1989 году з ініцыятывы Судніка (ён быў намесьнікам камандзіра вайсковай часьці) ў ленінскім пакоі вяліся падшыўкі беларускамоўных газэтаў "Літаратура і мастацтва" (ЛіМ), "Звязда", часопіса "Вожык", а пазьней — газэтаў "Наша слова", "Навіны Беларускага народнага фронту за перабудову

“Адраджэньне”, “Свабода”, “Голас часу” (Англія), часопіса “Полацак” (ЗША). Літаратура зь Беларусі (найперш неафіцыйная) пастулала ад Алеся Міткаўца іІгара Чарняўскага.
У гэтым жа 1989 годзе С.Суднік праз Вінцэнта Чорнага выйшаў на Міколу Міхноўскага — літкансультанта камісіі “Спадчына” Саюза пісьменьнікаў Беларусі — і ўжо ў жніўні атрымаў ад яго статут грамадскай арганізацыі “Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны” (ТБМ), а потым і адпаведную літаратуру.
У пачатку 1989 г. у былым СССР пачалася кампанія за наданьне нацыянальныммовам статуса дзяржаўных. С.Суднік і яго найбліжэйшы паплечнік І.Супаненка вырашылі паспрыяць гэтаму ў адносінах да беларускай мовы. Вясной 1989 году яны сабралі 21 подпіс вайскоўцаў пад лістом да Вярхоўнага Савету БССР за дзяржаўнасьць беларускай мовы, які быў надрукаваны на Бацькаўшчыне.4 Устудзені 1990 году Вярхоўны Савет БССР прыняў Закон “Аб мовах у БеларускайССР”. Дакладчыца, намесьніца старшыні Савету Міністраў БССР Ніна Мазай зачытала вытрымкі з ліста (два апошнія абзацы) ад афіцэраў “...Савецкіх Узброеных Сіл беларускага паходжаньня, якія служаць у Казахскай ССР”, для абгрунтаваньня неабходнасьці прыняцьця Закону.5 Для С.Судніка і яго сяброў гэта азначала, што беларусы-вайскоўцы маглі разьлічваць на дзяржаўную падтрымку.
Падбадзёраныя гэтым Суднік і Супаненка ў пачатку траўня 1990-га падрыхтавалі зварот з лістамі да ўсіх народных дэпутатаў Вярхоўнага Савету БССРі даслалі яго ў рэдакцыі газэтаў “ЛіМ” і “Звязда”.6 Пра зьмест “Звароту” можна меркаваць па яго загалоўках:
першы аркуш — “Аб рэспубліканскай нацыянальнай палітыцы...”
другі аркуш — “Аб нацыянальнай валюце...”
трэці аркуш — “Аб палітычным суверэнітэце Беларусі і дэмакратызацыі грамадскага жыцця рэспублікі...”
чацьвёрты аркуш — “Аб нацыянальных сімвалах...”
пяты аркуш — “Аб рэабілітацыі беларускага правапісу...”
“ЛіМ” увогуле прамаўчаў, а “Звязда” даслала ад імя рэдакцыі ліст, дзе выказала сваё нэгатыўнае стаўленьне да зьместу “Звароту...”.
Але, маючы маральную падтрымку землякоў, С.Суднік і І.Супаненка ў чэрвені 1990 г. прымаюць рашэньне наладзіць выпуск газэты. І вось у жніўні 1990 году выйшаў першы нумар газеты “Рокаш” — органа Прыазёрскай гарадзкой Рады ТБМ імя Францішка Скарыны. Фармальны сход па стварэньні суполкі ТБМ не зьбіраўся, але ўжо з 1989 году фактычна існавала нацыянальна-патрыятычная супольнасьць вайскоўцаў-беларусаў колькасьцю да 30 чалавек.
Эпіграфам для газэты сталі словы паэта Максіма Багдановіча “Біце ў сэрцы іх, біце мячамі, Не давайце чужынцамі быць...”.
У рэдакцыйным артыкуле першага нумару газэты напісана:
“Рокаш” — старабеларускае слова і абазначае бунт, паўстанне. Газета “Рокаш” будзе клікаць вас на духоўны бунт, на бунт супраць тых, хто нішчыў і нішчыць нашу мову, нашу культуру, нашу дзяржаву”.7 Газэту атрымоўвалі на Беларусі, у Казахстане, Летуве, Эстоніі, больш дзесяці месцаў Расеі ўключна з Якуцкам, Тынду, Хабараўскам. Газэта паступала ў Ленінградзкую публічную бібліятэку імя Салтыкова-Шчадрына, у Лёнданскую бібліятэку імя Францішка Скарыны, у Беларускую дзяржаўную бібліятэку імя У.Леніна. У верасьні 1990 г. выйшаў другі нумар газэты. Усяго ж да жніўня 1991-га было выдадзена 8 нумароў газэты “Рокаш”: 1990 г. – 2, 1991 г. – 6, уключна з сьвяточным, прысьвечаным 73-м угодкам Беларускай Народнай Рэспублікі. Сталымі аўтарамі “Рокаша” быліСтаніслаў Суднік, Ігар Супаненка ды іншыя. У газэце зьмяшчаліся вершы С.Судніка, гістарычныя артыкулы, аналітычныя матэрыялы аб падзеях на Беларусі, нататкі з жыцьця беларусаў Прыазёрску. Газэта выпускалася кампутарным спосабам, з “выкарыстаньнем” службовага становішча С.Судніка (намесніка камандзіра часьці).

Але і гэтага ўжо было мала. Суднік і Супаненка, параіўшыся з вайскоўцамі-беларусамі, і атрымаўшы іх падтрымку, вырашылі адчыніць нядзельную беларускую школу. Вось вынятка з другога нумару "Рокаша":

"16 верасня ў горадзе Прыазёрску Джэзказганскай вобласці Казахскай ССР прайшлі першыя 3 гадзіны заняткаў у беларускай нядзельнай школе. У першы дзень на заняткі прыйшло 16 дзяцей і двое дарослых, гэта не ўсе, але больш чым чакалася.

...Заняткі праводзяцца па трох прадметах:

- беларускай мове;
- беларускай літаратуры;
- беларусазнаўству (гісторыя, геаграфія, грамадазнаўства Беларусі)...8 Мы просім чытачоў нашай газеты аказаць нам дапамогу і даслаць па колькі падручнікаў па беларускай мове і літаратуры...

Рада ТБМ г.Прыазёрска"9

Але ў арганізатараў (яны ж выкладчыкі) акрамя мастацкай літаратуры быў толькі адзін падручнік — "Белорусский язык для небелоруссов". Таму з самага пачатку школа была пад пагрозай закрыцьця. Але, будучы ў адпачынку, І.Супаненка 10 верасьня 1990 г. адмыслова трапіў на ўстаноўчую канфэрэнцыю міжнароднай грамадзкай арганізацыі "Згуртаваньне беларусаў сьвету "Бацькаўшчына" (ЗБС "Бацькаўшчына"), дзе выступіў і папрасіў дапамогі. У выніку прывёз некалькі падручнікаў для школы як узор. Крыху пазьней С.Суднік, таксама будучы ў адпачынку ў Беларусі (восень 1990 г.), зьвярнуўся з афіцыйным запытам у навукова-пэдагагічную бібліятэку (яе каардынаты ў верасьні разьведаў Супаненка) і ў хуткім часе ў Прыазёрск былі дасланыя 100 падручнікаў. Ужо праз 2 месяцы школу падзялілі на дзьве клясы: малодшую і старэйшую. У першай выкладаў І.Супаненка, у другой — С.Суднік. Колькасьць вучняў стала больш дваццаці. Трэба дадаць, што школе дапамаглі падручнікамі 32 прыватныя асобы, газэта "ЛІМ", 9 грамадзкіх арганізацый і 3 дзяржаўныя ўстановы на Беларусі, а таксама ініцыятыўная група ЗБС "Бацькаўшчына" з Алма-Аты. *[Хочацца быць аптымістам // Рокаш, 1991, люты, № 3; Шчыры дзякуй // Рокаш, 1991, жнівень, № 8].

У гэтым жа 1990 годзе нацыянальна-патрыятычная арганізацыя беларусаў-вайскоўцаў выйшла за межы асьветніцкай дзейнасьці. Яе сябры выступалі за

- "стварэнне беларускай нацыянальнай арміі...
- Беларусь: моцная ядзерная дзяржава...
- стварэнне грамадскага вакуума вакол нацыянальных адшчапенцаў і нігілістаў...".10

Важнай падзеяй у жыцці арганізацыі сталася сьвяткаваньне ў сакавіку 1991 году 73-х угодкаў Беларускай Народнай Рэспублікі. Аб тым, як яно праходзіла, распавядаецца ў рэдакцыйным артыкуле "Пад знакам "Пагоні" 5-га нумара "Рокаша":

- У сходзе прыняў удзел 21 чалавек: адзін жаўнер, 18 афіцэраў і два генэралы. Вядучы С.Суднік распавёў пра гісторыю стварэньня БНР, а потым зрабіў справаздачу аб дзейнасьці Таварыства беларускай мовы г.Прыазёрска. Ад беларускіх вайскоўцаў гораду Цьвер сход прывітаў падпалкоўнік Вінцэнт Чорны. Быў арганізаваны гандаль беларускімі кнігамі, часопісамі і слоўнікамі. Кожнаму ўдзельніку быў уручаны сьвяточны бюлетэнь, падрыхтаваны рэдакцыйным калектывам газэты "Рокаш". Былі падрыхтаваныя красворды з цыклю "Перакладзіце на беларускую мову". У канцы сходу ўдзельнікі прынялі рэзалюцыю. Варта адзначыць, што ўсе выступоўцы ўжывалі толькі беларускую мову, хоць некаторым гэта было цяжкавата.

Нацыянальна-патрыятычная арганізацыя беларускіх вайскоўцаў у Прыазёрску актыўна ўдзельнічала ў працы ініцыятыўнай групы "Бацькаўшчына" г.Алма-Аты, у першую чаргу ў выпрацоўцы статутных дакумэнтаў. І ў траўні 1991 годзе ў сталіцы Казахстана быў створаны і зарэгістраваны рэспубліканскі культурны асяродак "Беларусь". 26 ліпеня 1991-га Рада культурнага асяродку "Беларусь" афіцыйна заснавала арганізацыю ТБМ у горадзе Прыазёрску Казахскай ССР і зьвярнулася да старшыні Прыазёрскага гарадзкога Савета

народных дэпутатаў з прозьбай зарэгістраваць яе. Рэгістрацыя адбылася ўпершай палове жніўня 1991 году.
Важным чыньнікам для далейшай дзейнасьці арганізацыі сталі паездкі на Беларусь Супаненкі (травень-чэрвень 1991 г.) і Судніка (чэрвень-ліпень тагож году). Адной з мэтаў паездак была неабходнасць "выйсьці" на Міколу Статкевіча. З нататкі ў газэце "Свабода" (1991, травень, № 9) было вядома, што ён узначальвае вайсковую сэкцыю партыі "Беларуская сацыял-дэмакратычная Грамада". У канцы траўня 1991 г. у Менску адбылася сустрэча І.Супаненкі з М.Статкевічам, а ў чэрвені — сустрэча С.Судніка з М.Статкевічам і С.Чыславым. Вайскоўцы гаварылі пра канцэпцыю стварэньня беларускага войска, аб дзеяньнях па яго стварэньні ў супрацы з існуючымі нацыянальна-дэмакратычнымі грамадзкімі і палітычнымі структурамі, аб каардынацыі дзеяньняў паміж усімі нацыянальна-патрыятычнымі арганізацыямі вайскоўцаў. Гэтым жа часам, 14-15 чэрвеня 1991 году, С.Суднік прыняў удзел у 2-ім зьездзе ТБМ.
У жніўні 1991 году (падчас путчу ГКЧП) выданьне газэты "Рокаш" і, адпаведна,дзейнасьць арганізацыі ў такім напрамку, былі забаронены. Сам С.Суднік быў выкліканы да начальства і абвінавачаны ў распальваньні беларускаганацыяналізму.

**Згуртаваньне беларусаў-вайскоўцаў г. Масквы (ЗБВ)**
Увосень 1990 году сярод сяброў Маскоўскай суполкі БНФ (існавала з 1989 г.) пачала выкрышталізоўвацца група вайскоўцаў. Адзін зь іх, лейтэнант Віктар Нагнібеда, па ўласнай ініцыятыве, ад імя аргкамітэту Згуртаваньня беларускіх вайскоўцаў (хаця насамрэч аргкамітэту яшчэ не было) склаў "Зварот дабеларускіх вайскоўцаў" і ў студзені 1991 г. даслаў у газэту "Свабода". "Зварот..." быў зачытаны ў эфіры радыёстанцыі "Свабода" і надрукаваны ў газэце"Свабода" (1991, студзень, № 1-2). Кароткую інфармацыю пра стварэньне ў Маскве арганізацыйнага камітэту Згуртаваньня беларускіх вайскоўцаў дала газэта "ЛіМ" (1991, 1 лютага, № 5). Празь месяц той жа "ЛіМ" надрукаваў больш падрабязную інфармацыю пра зьмест "Звароту..." і вытрымку зь яго: "Мы звяртаемся даўсіх беларускіх вайсковых згуртаванняў, да ўсіх свядомых афіцэраў беларусаў з прапановай дасылаць лісты са звесткамі пра беларускі вайсковы рух і прапановы па правядзенні ўстаноўчага з'езду беларускіх вайскоўцаў".11
На гэты зварот Віктар Нагнібеда атрымаў больш 40 лістоў. Мікалай Статкевіч у сакавіку 1991 году адмыслова прыехаў у Маскву дзеля наладжваньня сувязяў з мясцовымі вайскоўцамі-беларусамі. Пасьля гэтых лістоў і сустрэчы з М.Статкевічам, 13 красавіка 1991 г. сабраўся сход беларусаў-вайскоўцаў горада Масквы. Сход пастанавіў стварыць Згуртаваньне беларусаў-вайскоўцаў г.Масквы (ЗБВ), прыняў Статут ЗБВ і выбраў каардынацыйны камітэт у складзе трох чалавек на чале з палкоўнікам Васілём Астаповічам.12
Статут ЗБВ прадугледжваў наступныя напрамкі дзейнасьці:
" – культурна асветніцкая праца сярод беларусаў-вайскоўцаў па захаванню і распаўсюджванню беларускай мовы, прапагандзе беларускай гісторыі і культуры.
- выяўленне і даследаванне выпадкаў парушэння правоў грамадзян Беларусі ў войску, дзеянняў войска супраць інтарэсаў беларускага народу".13
На другім сваім паседжаньні ў гэтым жа месяцы каардынацыйны камітэт ЗБВ прыняў зварот да беларусаў-вайскоўцаў, у якім абвяшчаў свае мэты і заклікаў да стварэньня гурткоў беларусаў-вайскоўцаў у вайсковых часьцях.14Тады ж быў прыняты і зварот да дэпутатаў Вярхоўнага Савету БССР, у якім былі выкладзены прапановы па ажыцьцяўленьні 10-га артыкула "Дэкларацыі абДзяржаўным суверэнітэце Беларускай ССР".15 Усе гэтыя дакумэнты адразу жбылі разасланыя ў арганізацыі і да асобаў, зь якімі ЗБВ мела сувязі.

Надалей арганізацыя займалася накапленьнем інфармацыі і прапагандай сваіх ідэй. Падчас жнівеньскага путчу сябры маскоўскай арганізацыі прынялі чынны ўдзел у абароне “Белага Дому” у Маскве.

Варта згадаць таксама, што ў 1980-х гадах у горадзе Калінін (Цьвер), у вайсковай акадэміі існавала шматлікае беларускае зямляцтва. З 1989 году на яго аснове сфармавалася нацыянальна-патрыятычная арганізацыя на чале з падпалкоўнікам Вінцэнтам Чорным. Але распавед пра дзейнасьць гэтай і іншых арганізацый, што існавалі па-за межамі Беларусі — тэма будучых дасьледаваньняў.

## Нацыянальныя арганізацыі беларускіх вайскоўцаў у чырвонасьцяжнай Беларускай вайсковай акрузе

### Вольнае згуртаваньне вайскоўцаў

Першаштуршком для стварэньня першай нацыянальна-патрыятычнай арганізацыі вайскоўцаў на Беларусі сталіся падзеі 30 кастрычніка 1988 году, калі БССРаўскія ўлады разагналі ў Менску жалобны мітынг з нагоды “Дзядоў” — Дня памінаньня продкаў. Менавіта абурэньне дзеяньнямі ўладаў і крыўда засвой народ згуртавалі ў лістападзе 1988 г. пяцёх сяброў, курсантаў 5-га курсаМенскай вышэйшай інжынэрнай зэнітна-ракетнай вучэльні (далей у тэксце— ВИЗРУ). Гэта былі стыхійныя, непадрыхтаваныя сустрэчы, на якіх ішла размова аб тым, як распавесьці праўду аб падзеях 30.10.1988 году. Сярод пяцёх сяброўвызначаўся сваёй актыўнай пазыцыяй у падтрымку “Перабудовы”, прыхільнасьцю да беларушчыны, Сяржук Чыслаў, які задаваў тон, быў лідэрам групы.

Першым дзейсным крокам сяброў групы быў выпуск насьценнай газэты. Газэта была вывешана ў інтэрнаце 5 курсу і ўяўляла сабой выразкі з афіцыйнайпрэсы, у якіх расказвалася пра падзеі 30 кастрычніка. Гэта выклікала эмацыйныя абмеркаваньні ня толькі ў курсанцкім, але і ў афіцэрскім асяродку: ці страляў бы ў свой народ?!, як быць з прысягай і ваенным загадам?!, і г.д.

У хуткі часе, праз суседа С.Чыслава (Чыслаў — менчук), рабочага трактарнага заводу, да сяброў трапіла “Адозва...” аргкамітэту Беларускага Народнага Фронту за перабудову “Адраджэньне” (БНФ). З дазволу выкладчыка, Сяржук Чыслаў зачытаў яе на занятках па навуковаму камунізму. Хаця гэтая інфармацыя падавалася як адна з праяваў “Перабудовы” (“Адозва...” пачыналасясловамі, што “Перабудова” распачатая “лепшымі сіламі КПСС”), але ўсё жгэта было нязвыкла, і таму абмеркаваньня сярод курсантаў не адбылося. Вывесіць “Адозву...” на факультэце не дазволіў начальнік палітычнага аддзелу.

У сьнежні 1988 г. сябры вырашылі далучыцца да БНФ і 30 сьнежня іх група была зарэгістраваная ў аргкамітэце па стварэньні Беларускага Народнага Фронту за перабудову “Адраджэньне”, як група падтрымкі Фронту. Наступным крокам групы была спроба нейкім чынам адзначыць угодкі Беларускай Народнай Рэспублікі. Карыстаючыся часовай адсутнасьцю начальніка палітычнага аддзелу, са згоды яго намесьніка, у вучэльні былі вывешаныя аб’явы наступнага зьместу:

Шаноўныя сябры!
- усіх, хто неабыякава ставіцца да лёсу роднай культуры ды мовы
- усіх, каго цікавіць старажытная ды сучасная гісторыя Беларусі
- усіх, хто шануе духоўную спадчыну продкаў

запрашаймо ўзяць удзел у працы
літаратурна-асветніцкай суполкі
ПРАЛЕСКІ

Першае паседжанне адбудзецца ў пятніцу, 24 сакавіка ў пакоі № 216 (катэдра гісторыі КПСС) у 16.00
У праграме:
- "Кастусь Каліноўскі" – каго любіш?
- Беларуская народная Рада – праўда ды хлусня пра першы народны ўрад.
- Абмеркаванне праграмы суполкі ды іншых арганізацыйных пытанняў.
Рада Суполкі".16
Назва "Пралескі" была вынайдзена напярэдадні і атаясамлівала групу,якая арганізацыйна афармілася менавіта зімой, з першымі пралескамі, якія прабіваюцца з-пад сьнегу. Гэта была назва для начальства: у палітычным сэнсе яна (назва) была нэйтральная, а значыць прымальная для камандаваньня. У сваім асяродку яны называлі сябе "Рух-63", лічачы сябе нашчадкамі Кастуся Каліноўскага. Хлопцы насілі значкі з выявай К.Каліноўскага, што быліпрысьвечаныя 150-годзьдзю з дня яго нараджэньня. На значках замест лічбы "150" сябры групы намалявалі бел-чырвона-белы сьцяжок. Яны ж прытрымліваліся паўстанцкага дэвізу: "Каго любіш? — Люблю Беларусь".
24 сакавіка 1989 году пакой № 216 быў апячатаны, а арганізатары (С.Чыслаў і яшчэадзін курсант) — выкліканы да начальніка палітаддзела. Да гэтага сябрызнаходзіліся каля 216-га пакою, дзе тлумачылі курсантам сутнасьць справы ібралі каардынаты ў тых, хто актыўна цікавіўся мерапрыемствам і яго арганізатарамі. У палітаддзеле С.Чыславу задавалі пытаньні накшталт: Хто такія? Адкуль гэта ў вас узялося? Што за "праўда ды хлусня"? Што за "ўрад народны"?, і г.д. У наступныя дні атмасфэра станавілася ўсё больш напружанай, алеўрэшце ўсё абышлося. Адзін з палітработнікаў сказаў шчыра: "Мы ня будземвыключаць вас з вучэльні, каб не рабіць з вас нацыянальных герояў".
Але ўсё ж высілкі С.Чыслава і яго сяброў не былі дарэмныя. Аб існаваньнісуполкі даведалася ўся вучэльня, што спрыяла, у прыватнасьці, пашырэньню шэрагаў арганізацыі. На гэты час (канец сакавіка 1989 г.) група паднялася на якасна новы ўзровень. Калі дагэтуль яе сябры ў большай ступені ўсьведамлялі сябе як групу сяброў, прыхільнікаў "Перабудовы", то зараз яны бачылі сябе ўжо членамі канкрэтнай арганізацыі з канкрэтнымі мэтамі: асьветніцкая дзейнасьць і другая, неафіцыйная мэта — незалежнасьць Беларусі і нацыянальнае войска. Гэтаму паспрыяла, у прыватнасьці, паездка С.Чыслава ўлютым 1989 году ў горад Вільню, адкуль ён прывёз бел-чырвона-белы сьцяг.
Ужо ў красавіку 1989 году дакладна акрэсьлілася структура арганізацыі: кіруючае ядро з трох чалавек на чале з Чыславым, на якое замыкаліся, акрамясяброў з 5-га курсу, курсанты з трох факультэтаў 4-га курсу, цывільны работнік адной з кафэдраў Валеры Палсьцюк і бібліятэкарка Марыя Пятроўна Зыкава. Вакол іх у сваю чаргу групаваліся прыхільнікі (1-3 чалавекі). Такім чынам, ядро арганізацыі, тыя, хто ня толькі яе падтрымліваў, але і выконваў розныя даручэньні, складала 10 чалавек, а ўсяго налічвалася каля 20 чалавек. Сьпісаў арганізацыі не было, а сяброўства ў ёй вызначалася паводле стаўленьня чалавека да ідэяў, мэтаў арганізацыі праз асабістыя кантакты.
Пасьля 25 сакавіка 1989 г. камандаваньне дазволіла "пралескаўцам" вывесіць у інтэрнаце стэнд пад назвай "Пражэктар Перабудовы", хаця зноў жа разьмяшчаць на ім можна было матэрыялы толькі з афіцыйнай прэсы.
У красавіку адбылася яшчэ адна важная падзея ў дзейнасьці групы С.Чыслава. Яна пад назвай "Вольнае згуртаваньне вайскоўцаў" (ВЗВ) увайшла ў толькі што створаную Канфэдэрацыю беларускіх суполак (КБС), вальны Сойм якой адбыўся ў Вільні. Знаёмства з канфэдэрацыяй адбылося праз газэту, выдадзеную аргкамітэтам КБС, а сталыя стасункі падтрымліваліся праз сябра Рады КБС Караліну Мацкевіч.
На красавік-чэрвень 1989 г. прыпадае найбольш плённы этап дзейнасьці арганізацыі:
- былі падрыхтаваныя прапановы на ўстаноўчы зьезд БНФ (па шырокім спэктры праблемаў);
- быў падрыхтаваны варыянт эмблемы Фронту: скарынаўскае сонца з месяцам;

- прынялі ўдзел (Сяржук Чыслаў) у імпрэзе КБС у Ракаве. Была напісаная нататка ў друкаваны орган КБС, у якой быў заклік да вайскоўцаў не разганяць зьезд БНФ (меркавалася, што ён пройдзе ў Менску);
- супрацоўнічалі (з лютага 1989 г.) з суполкай "Сьвітанак" (узначальваў А.Гуркоў) і яе друкаваны орган "Студэнцкая думка" распаўсюджвалі сярод курсантаў вучэльні. У газэце "Студэнцкая думка" была нататка, якая заклікалавучыцца беларускай лацінцы. І С.Чыслаў захапіўся лацінкай, навучыўся пісаць на ёй, а ўсе сябры арганізацыі прынамсі ўмелі расьпісвацца на лацінцы.
- прадстаўнік арганізацыі ўваходзіў у Першамайскую Раду БНФ г. Менску,а сябры групы Сяржук Чыслаў і яшчэ адзін сябра рэгулярна ўдзельнічалі ўпрацы гэтай Рады;
- 1 траўня 1989 году сябры арганізацыі прынялі ўдзел у дэманстрацыі, што ладзіў БНФ. Гэта потым каштавала ім чарговымі непрыемнасьцямі, выклікамі ўпалітаддзел і г.д. Так, начальнік палітаддзела вучэльні падчас "выхаваўчай" размовы паказваў ім фотаздымкі, на якіх усе трое былі зафіксаваныя падчас удзелу ў дэманстрацыі (відавочна фотаздымкі перадалі з КДБ);
- сябры арганізацыі бралі пасільны ўдзел у выбарчай кампаніі ўвесну 1989 году: вывешвалі ўлёткі, задавалі пытаньні на сустрэчах з кандыдатамі, вялі актыўную прапаганду сярод курсантаў;
- выпусьцілі "баявы лісток" на беларускай мове (праўда, больш дзеля жарту) пад назвай "Марнае выданне". А перад выпускам з вучэльні, у чэрвені 1989 году, група С.Чыслава сабрала сярод курсантаў вучэльні 300 подпісаў за дзяржаўнасьць беларускай мовы. Гэтыя подпісы былі перададзеныя падчас 1 зьезду ТБМ (26 чэрвеня 1989 г.) аднаму з арганізатараў ТБМ Міколе Міхноўскаму. Дарэчы, на 5 курсе з 70 чалавек подпісы паставілі больш 60-ці чалавек.
- сябры арганізацыі ўдзельнічалі ў працы Ўстаноўчага зьезду БНФ (24-25.06.1989 г..), які адбыўся ў Вільні. Дэлегатам ад групы падтрымкі БНФ быў выбраны Валеры Пальсьцюк. Як не вайсковец, ён меў магчымасьць паехаць на зьезд. У апошні момант выпала такая магчымасьць і С.Чыславу. І ён удзельнічаў у працы зьезду ўжо як дэлегат ад Вольнага згуртаваньня вайскоўцаў па лініі КБС.
На гэтым закончыўся першы, найбольш актыўны, этап дзейнасьці першай натэрыторыі Беларусі нацыянальна-патрыятычнай арганізацыі вайскоўцаў, створанай у лістападзе 1988 году. Маладыя лейтэнанты, заснавальнікі арганізацыі, разьехаліся па гарнізонах, а самы актыўны зь іх — Сяржук Чыслаў — у самае глухое месца: у пасёлак Мірны Чыцінскай вобласьці Расейскай фэдэрацыі.
У другой палове 1989 г. група працягвала дзейнічаць. Яе ўзначаліў АляксейПісьмянкоў, ужо курсант 5 курсу. Але ўмовы дзейнасьці былі яшчэ больш неспрыяльнымі. Камандаваньне ставілася да арганізацыі ўсё больш нэгатыўна.Пасьля ўдзелу ў 1-ым зьездзе БНФ быў вымушаны звольніцца з працы ў вучэльні Валеры Пальсьцюк. Па ініцыятыве А.Пісьмянкова курсантскі хор пачаў развучваць "Пагоню" М.Багдановіча, але гэта скончылася выклікам Аляксея ў асобы аддзел, пагрозамі пасадзіць яго на гаўптвахту. Неўзабаве памёрла Марыя Пятроўна Зыкава, якая аказвала значны ўплыў на сяброў арганізацыі.
Зьвестак пра дзейнасьць арганізацыі ў гэты пэрыяд непасрэдна ад саміх тагачасных яе сяброў пакуль няма.
Дзейнасьць першай на тэрыторыі Беларусі нацыянальна-патрыятычнай арганізацыі вайскоўцаў аказала значны ўплыў на многіх вайскоўцаў ВИЗРУ. Пра гэта, у прыватнасьці, сьведчаць надпісы-пажаданьні ад выпускнікоў у асабістым фотаальбоме С.Чыслава. 31 чалавек пакінулі там свае пажаданьні. У 26 пажаданьнях, у той ці іншай ступені, узгадваецца грамадзкая дзейнасьцьЧыслава, а дзесяць пажаданьняў напісаныя на беларускай мове. Напрыклад,сябры суполкі "Вольнае згуртаваньне вайскоўцаў" зычылі Чыславу:

“Сяржук!
Не трэба адчайвацца і сумаваць, бо Навасібірск — не назаўсёды, усяму свой час, прыйдзе і час Адраджэння.
А пакуль жывуць такія хлопцы як ты, — жыве Беларусь! Куды б ні закінуў цябе лёс, з табой заўсёды будзе наша родная краіна, а для ўсіх астатніх ты будзеш часцінай гэтай Краіны. Памятай аб гэтым і будзь заўсёды вартым называцца ганаровым імем Беларуса... на працягу ўсіх 5 гадоў ты быў надзейным сябрам, дзякуй табе!”

“Сяржук!
...Дзякуй табе за ўсё тое, што ты зрабіў для нашай суполкі, для Беларусі”!

А вось пажаданьні аднакашнікаў, якія не былі сябрамі ВЗВ:
“...я всегда уважал заинтересованных, преданных делу людей… мне кажется, что ты больше бы пользы принёс здесь — а не вдали от своей Радзімы”.

“Дорогой друг Сергей!
Ты великий сын белорусского народа, и я хочу от имени всех Грузинов и отсебя лично сказать одно: береги свою нацию и свой язык”.
Ваенная сэкцыя БСДГ
6 ліпеня 1990 г. у газэце “Літаратура і мастацтва” пад рубрыкай “Думка чытача” быў надрукаваны артыкул вайскоўца С.Гарбаўца “Ці патрэбна нацыянальнае войска?”, а 5 кастрычніка 1990-га — працяг тэмы пад назвай “Дзе і як служыць беларусам”. Аўтар гэтых двух матэрыялаў — старэйшы выкладчык ВИЗРУ падпалкоўнік Мікалай Статкевіч, які карыстаўся псэўданімам “С.Гарбавец” (дзед Статкевіча па маці, які прапаў у засьценках НКВД).
Паводле кароткай “Гісторыі БЗВ”, “увосень 1989 года ў Мінску з афіцэраў той жа інжынернай вучэльні ўзнікла група, якая адразу паставіла на мэце ўтварэнне беларускага войска. Групу ўзначальваў кандыдат тэхнічных навук Мікалай Статкевіч. У яе ўваходзіў кандыдат тэхнічных навук падпалкоўнік Мікалай Бірукоў (зараз — намеснік старшыні БЗВ). Група працавала ў падполлі. Яна займалася распрацоўкай дэталёвай канцэпцыі стварэння беларускага войска. ...У пачатку 1991 года група, якую ўзначальваў М.Статкевіч, прыняла рашэнне аб выхадзе яе кіраўніка з падполля”.17
Дзеля вырашэньня задачаў групы было вырашана абаперціся на Беларускую сацыял-дэмакратычную Грамаду, якая ў той час стваралася і мела сваю фракцыю ў парлямэнце, карысталася ўплывам у СМІ і ў той жа час не знаходзілася пад такім кантролем з боку ўладаў, як БНФ.18
1 сакавіка 1991 г. Мікалай Статкевіч напісаў заяву аб выхадзе з КПСС і на ўстаноўчым зьездзе партыі “Беларуская сацыял-дэмакратычная Грамада” (2-3 сакавіка 1991 г.) заявіў аб неабходнасьці стварэньня беларускага войска ў сакавіку 1991 г.. Неўзабаве пасьля ўстаноўчага зьезду БСДГ, Сяржук Чыслаў (у пачатку 1991 году ён звольніўся з савецкага войска па скарачэньні і вярнуўся наРадзіму) праз актывіста БСДГ Мікалая Кійку пазнаёміўся з Мікалаем Статкевічам. 30 сакавіка 1991 году Цэнтральная Рада БСДГ прыняла рашэньне аб утварэньні ў складзе партыі ваеннай сэкцыі. Задачы сэкцыі:
“- стварэнне суполак сяброў і прыхільнікаў БСДГ сярод вайскоўцаў;
- вядзенне агітацыйнай працы па перакананню грамадскасці рэспублікіў неабходнасці стварэння рэспубліканскага войска;
- аказанне дапамогі парламенцкай фракцыі Грамады ў заканадаўчай працы па вайсковай праблеме;
- аказанне пры неабходнасці практычнай дапамогі органам улады Рэспублікі ў рэалізацыі вайсковай рэформы.19

Паведамленьне распаўсюджвалася сябрамі партыі. Інфармацыя пра ваенную сэкцыю была і ў інтэрвію М.Статкевіча газэце “Знамя юности”20 і ў менскай гарадзкой газэце “Добры вечар”21, а таксама ў газэце “Свабода” (1991, травень, № 9). Доступ да шматтыражных газэтаў “Знамя юности” (наклад — 500 250 асобнікаў), “Добры вечар” (30 087) і на радыё быў атрыманы з дапамогай БСДГ. У чэрвені 1991 году М.Статкевіч сустракаўся ў Каўнасе з міністрам абароны Летувы, даў інтэрвію летувіскай газэце, а таксама выступіў па мясцовым тэлебачаньні са зваротам да вайскоўцаў. На Беларусь летувіскія тэлеканалы не трансьляваліся і ў нас гэты выступ шырокага рэзанансу ня меў.
Ваенная сэкцыя вяла працу па наладжваньні сувязяў з беларускімі нацыянальна-патрыятычнымі арганізацыямі вайскоўцаў па ўсёй тэрыторыі СССР.. Агулам да жнівеньскага путчу меліся сувязі з арганізацыямі Масквы, Цьвяры, Мардовіі, Якуціі (РСФСР), Прыазёрску (Казахская ССР), з арганізацый вайсковага гарадка Печы (г. Барысаў, Беларуская ССР) і дзесяткамі асобных людзей.
Але з пачаткам гэтай працы пачаўся перасьлед М.Статкевіча, паўстала пытаньне аб звальненьні яго з войску. За “непрыняцьцё захадаў” да Статкевіча быў зволнены начальнік ВИЗРУ генэрал-маёр Л.Клімаў. Начальніка вучэльні не ўратавала нават заступніцтва фракцыі БСДГ у Вярхоўным Савеце.22
Адначасова, дзеля далучэньня як мага большай колькасьці вайскоўцаў да беларускай справы, было вырашана выкарыстоўваць ТБМ. У красавіку 1991 г. у ВИЗРУ была створаная суполка ТБМ, якую ўзначаліў актыўны сябра групы Статкевіча, кандыдат тэхнічных навук падпалкоўнік Мікалай Бірукоў.
Вызначальнай для дзейнасьці ваеннай сэкцыі БСДГ зьявілася ўжо згаданая сустрэча Мікалая Статкевіча і Сяржука Чыслава са Станіславам Суднікам. Суднік меў кантакты з большасьцю замежных беларускіх арганізацыяў. Гэтая сустрэча азначала, што практычна ўсе дзейсныя беларускія нацыянальна-патрыятычныя арганізацыі вайскоўцаў былі зьвязаныя між сабой.

У траўні 1991 году нацыянальна-патрыятычныя вайскоўцы стварылі арганізацыю ТБМ у вайсковым гарадку Печы (г. Барысаў) у колькасьці 5 чалавек. А яшчэ за месяц да таго яе арганізатары ўстанавілі кантакт з М.Статкевічам.

## Распрацоўка канцэпцыі стварэньня Беларускага войска

### Нацыянальнае войска — сымбаль дзяржаўнасьці

Важным чыньнікам у дзейнасьці першых нацыянальна-патрыятычных арганізацый была распрацоўка канцэпцыі стварэньня беларускага войска. Праўда, варта адразу зазначыць, што адмыслова гэтым займаліся толькі група Статкевіча і арганізацыя Судніка. Прычым група Статкевіча па сутнасьці ібыла створаная дзеля гэтай мэты. Таму з разгляду канцэпцыі гэтай групы іварта пачаць.
Першыя разьдзелы канцэпцыі М.Статкевіч перадаў у рэдакцыю “ЛІМ” у сакавіку 1990 году. Яны былі надрукаваныя, як ужо адзначалася, 6 ліпеня 1990-га. Гэтыяразьдзелы ўключалі ў сябе, акрамя абгрунтаваньня неабходнасьці стварэньня беларускага войска, наступныя палажэньні:
- “Нацыянальныя вайсковыя злучэнні павінны стварацца на аснове дагавораў паміж Саюзам і рэспублікамі, уваходзіць у склад аб’яднаных Узброеных Сіл Саюза і мець двайное падпарадкаванне — прэзідэнту Саюза і прэзідэнту рэспублікі”.
- “У сувязі з пераходам нашага грамадства да шматпартыйнасці, палітаддзелы ў войску павінны быць скасаваны”.

- “Стварэнне нацыянальнага войска можна ажыццявіць у даволі кароткі тэрмін на матэрыяльнай базе тых вайсковых злучэнняў, што размешчаны на тэрыторыі рэспублікі зараз”.
- “ У форме... можа быць... шырока выкарыстана нацыянальная сімволіка. Мовай службовых узаемаадносін, дакументацыі нацыянальных вайсковых злучэнняў павінна быць дзяржаўная мова рэспублікі”.
- Для пераадоленьня крызісу мы павінны кансалідавацца як нацыя. Галоўнай кансалідуючай ідэяй павінна быць “ідэя, якая стаіць вышэй, чым інтарэсы розных груп насельніцтва і палітычных груповак. Гэта ідэя нацыянальнага выжывання”. Сам факт існаваньня нацыянальнага войска прыблізіцьнас да асэнсаваньня гэтай ідэі: “Нацыянальнае войска можа стаць сімвалам нашай дзяржаўнасці, сродкам аднаўлення нацыянальнай годнасці, школайсапраўды патрыятычнага выхавання”.23
Прадбачлівасьць аўтараў канцэпцыі і жыцьцёвасьць іх ідэй былі пацьверджаныя вельмі хутка. 27 ліпеня 1990 г. Вярхоўны Савет БССР прыняў Дэкларацыю“Аб дзяржаўным сувэрэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі”, артыкул 10-ты якой абвяшчаў: “Беларуская ССР мае права на ўласныя Узброеныя Сілы, унутраныя войскі, органы грамадскай і дзяржаўнай бяспекі, падкантрольныя Вярхоўнаму Савету Беларускай ССР.
Беларуская ССР мае суверэннае права вызначаць парадак і ўмовы праходжання яе грамадзянамі вайсковай службы, службы ў органах дзяржаўнай і грамадскай бяспекі, вырашаць пытанні размяшчэння войск і ўзбраення на сваёй тэрыторыі.
Ніякія вайсковыя фарміраванні іншых краін, іх ваенныя базы і пабудовыне могуць быць размешчаны на тэрыторыі Беларускай ССР без згоды яе Вярхоўнага Савета.
Беларуская ССР ставіць мэтай зрабіць сваю тэрыторыю без’ядзернай зонай, а рэспубліку – нейтральнай дзяржавай”.24
У газэце “ЛіМ” (№ 48 ад 30 лістапада 1990 г.) былі надрукаваныя водгукі чытачоўна ліпеньскі артыкул С.Гарбаўца (М.Статкевіча) “Ці патрэбна беларускае войска”. За выключэньнем адной крытычнай заўвагі, водгукі былі станоўчыя.
А перад гэтым, у кастрычніку 1990 году, быў апублікаваны працяг канцэпцыі.Аўтар яе адзначае, што Беларусь дэкляравала неабходнасьць стварэньня беларускага войска, але далей дэкляраціі справа пакуль не пасунулася. Таму С.Гарбавец прыводзіць наступны аргумэнт на карысьць неадкладнага стварэньня беларускага войска:
- “З развалам Варшаўскага пакта мы рэальна апынемся на пярэднім рубяжысупрацьстаяння двух самых магутных у свеце ваенных машын. Раней ролю фарпоста у такім супрацьстаянні можна было хоць неяк апраўдаць з пункта гледжання пануючай ідэалогіі. Цяпер жа гэтае пытанне трэба разглядаць толькі з боку мэтазгоднасці такога становішча для беларускага народа. Інтарэсы рэспублікі патрабуюць адмаўлення ад ролі, якую нам навязвае цэнтр”.
- “З-за павялічэння колькасці войск на Беларусі ўзнікае, акрамя іншага,шэраг экалагічных і дэмаграфічных праблем”.
- “Пра неабходнасць стварэння беларускага войска сведчыць і існуючаестановішча з прызывам нашых юнакоў у армію”, у якой служаць салдаты з рэгіёнаў, ахопленых міжнацыянальнымі канфліктамі. Салдаты з гэтых рэгіёнаў могуць вырашаць разборкі між сабой і зброяй.
- Трэба прыняць меры “па абмежаванні раёнаў службы беларускіх прызыўнікоў граніцамі рэспублікі”.
- Трэба “абудзіць у маладых салдат нацыянальную самасвядомасць і менавіта на ёй будаваць выхаваўчую работу, рэалізаваўшы такім чынам Дэкларацыю аб суверэнітэце ў той яе частцы, дзе гаворыцца аб стварэнні нацыянальнага войска, таму што “ідэалогія, якая раней ляжала ў аснове выхаваўчайработы ў арміі і грунтавалася на супрацьстаўленні “двух лагераў”, дала трэшчыну”.25

Асноўныя палажэньні, ідэі гэтай канцэпцыі па магчымасьці прапагандаваліся ў СМІ. У траўні 1991 г., адказваючы ( як сябра выканкаму Цэнтральнай РадыБСДГ) на пытаньні журналісткі Галіны Айзенштадт, М.Статкевіч аргумэнтаваў ранейшыя палажэньні канцэпцыі і выказаў шэраг новых:
- Стварыць на Беларусі вайсковыя адзінкі з татар-караімаў і яўрэяў.
- Удакладніў, што "у рэспубліканскіх частках павінны служыць усе грамадзяне і ўраджэнцы Беларусі, незалежна ад нацыянальнасці".
- Канкрэтызаваў свой ранейшы тэзіс аб двайным падпарадкаваньні рэспубліканскіх часьцей:
а) "Рэспубліка займаецца камплектаваннем кадраў, вядзе выхаваўчую работу, пабудаваную на нацыянальным патрыятызме, навучанне".
б) "Без згоды Вярхоўнага Савета ніхто не павінен мець права перакідацьрэспубліканскія часткі ў іншыя рэгіёны краіны".
в) "Усімі астатнімі пытаннямі павінна распараджацца Міністэрства Абароны СССР".
- выказаў меркаваньне, што "відаць, распад Саюза непазбежны. І адным з нестабільных месцаў можа стаць Расія... І калі ў Расіі пачнецца гвалтоўная барацьба за ўладу, яна можа быць перанесена і на тэрыторыю Беларусі".
- "Шмат якія праблемы ўдалося б вырашыць, калі б армія будавалася (маецца на ўвазе Савецкая Армія — М.В.) па тэрытарыяльна-нацыянальнай прыкмеце".26
Варта яшчэ раз сказаць, што слушнасьць канцэпцыі і прадбачлівасьць яеаўтараў пацьвердзіліся і пацьвярджаюцца жыцьцём: беларуская армія створаная і створаная яна на базе Чырвонасьцяжнай Беларускай вайсковай акругі (ЧБВА); палітаддзелы ў войску скасаваныя; да 1995 году ў войску часткова выкарыстоўвалася нацыянальная сымболіка і, хаця зусім нязначна, беларуская мова; сам факт існаваньня Ўзброеных Сіл Беларусі наблізіў і набліжае нас да асэнсаваньня нацыянальнай ідэі; беларускія хлопцы служаць толькі на Радзіме; бяз згоды Вярхоўнага Савету ніхто цяпер ня мае права пасылаць нашых воінаў за межы Беларусі; распаўся Савецкі Саюз і Расея стала "адным з нестабільных месцаў" — там ідзе грамадзянская вайна. І яна не перанесена на тэрыторыю Беларусі таму, што мы — незалежная дзяржава, маем уласнае войска. На сёньня гэта галоўны здабытак беларускага народу.А свой пасільны ўнёсак дзеля гэтага зрабілі і сябры першых нацыянальна-патрыятычных арганізацый беларускіх вайскоўцаў.
Не ўсё з вышэй пералічанага зроблена і робіцца належным чынам. Узброеныя Сілы Беларусі так і ня сталі пакуль тым "войскам", "сымбалем", "сродкам", той "школай", пра што марылі беларускія патрыёты ў пагонах. І гэта ня дзіўна. Лёс распарадзіўся так, што гэтую канцэпцыю ажыцьцяўляюць іншыя людзі, якія ні ідэйна, ні маральна, ні псыхалягічна непадрыхтаваныя да гэтага.
Але нават іх жыцьцё штурхае далей разьвіваць тое, што калісьці высьпела ня ў іх сэрцах. У траўні 1991 году М.Статкевіч казаў пра "тэрытарыяльна-нацыянальны" прынцып камплектаваньня Савецкай Арміі. Але ні ён, ні хто іншы іня мог падумаць тады, што з 1995 г. тэрытарыяльны прынцып камплектаваньня будзе ўведзены ў беларускай арміі. Камплектаваньне па тэрытарыяльнаму прынцыпу, акрамя эканамічнай выгады, павышэньня баяздольнасьці войскаў, дало яшчэ і зьніжэньне на 28% надзвычайных здарэньняў і злачынстваў (у 1995 годзе, у параўнаньні з папярэднім годам).
Трэба аддаць належнае аўтарам канцэпцыі, сьмеласьці іх думак. Бо канцэпцыя была апублікаваная ў часы, калі СССР быў яшчэ моцнай дзяржавай, а пачала пісацца раней — яшчэ да адмены ў сакавіку 1990 году славутага шостага артыкулу Канстытуцыі СССР аб панаваньні КПСС.

**Беларусь — моцная ядзерная дзяржава**
У 1991 годзе ў газэце "Рокаш" зьявіліся матэрыялы, дзе разглядаліся пытаньні будаўніцтва нацыянальнага войска. Канешне ж "казахстанцы" чыталі "ЛіМ". У той ці іншай форме

прапановы С.Гарбаўца ёсьць і ў іх. Па-другое, з канцэпцыяй групы Статкевіча азнаёмілася хоць і нешматлікая, але самая актыўная і нацыянальна сьвядомая частка беларускага грамадзтва. Канцэпцыяж арганізацыі С.Судніка, з-за малога накладу “Рокаша”, цяжкасьцяў у распаўсюдзе, не атрымала належнага водгуку на Беларусі.
Тым ня менш, варта разгледзець тыя палажэньні “казахстанцаў”, якія не пераклікаюцца з канцэпцыяй групы Статкевіча, а дапаўняюць яе.
Галоўнае і прынцыповае адрозненьне канцэпцыі арганізацыі Судніка адканцэпцыі групы Статкевіча — гэта дакладная і цьвёрдая пазыцыя наконтядзернай зброі на Беларусі: “Беларусь — моцная ядзерная дзяржава”.27
Група ж Статкевіча гэтае пытаньне ў 1990 годзе ўвогуле не закранала, а ў 1991 годзе выказалася за тое, што “...ядзерная зброя павінна быць у юрысдыкцыі або ўсяго Саюза, або (што нават было б лепей) — адной Расіі”.28
Сутнасьць пазыцыі “казахстанцаў” па пытаньні ядзернай зброі выклаў на старонках “Рокаша” актыўны сябар арганізацыі Ігар Супаненка. Гэтая пазыцыя заключаецца ў тым, што “Беларусь, Украіна, Расея вызначаюцца як суверэнныя дзяржавы і свае ўзаемаадносіны ладкуюць на блокаваму прынцыпу.Заключаюць паміж сабой ваенна-палітычны Саюз, утвараюць агульнае камандаванне, выпрацоўваюць палітычную і ваенную дактрыну, дзе кожная дзяржава возьме на сябе пэўныя абавязкі. Дзеляць зброю, у тым ліку і ядзерную. Ядзерныя сілы утвараюць на базе тых часцей, якія цяпер знаходзяцца на тэрыторыі рэспублікі. Агульнымі застаюцца аб’екты, неабходныя для выкарыстоўвання кожнай дзяржавай. Гэта: інстытут ядзерных даследаванняў, палігоны, асобныя стратэгічныя базы”. 29
Такі падыход аўтар абгрунтоўвае ня толькі з пункту гледжаньня абароназдольнасьці рэспублікі, а і
- з мэтай узьняцьця прэстыжу Беларусі на міжнароднай арэне (“Беларусь стане у адзін шэраг з такімі дзяржавамі як Францыя, Велікабрытанія”);
- з мэтай пазбаўленьня комплексу непаўнавартасьці (“Народ Беларусі усвядоміць, што ён усё ж не халуйскага гатунку, як гэта было на працягу амаль усёй гісторыі, а будзе трымаць у сваіх руках адказнасць за лёс свету”);
- з мэтай мець права рабіць палітыку згодна з уласнымі інтарэсамі (Ці здолее наш народ “...пайсці на такі крок пасля чарнобыльскай трагедыі... . Ці дакажуць тры славянскія дзяржавы, што яны не толькі нацыянальныя кватэры,але і суверэнныя дзяржавы, дзве з іх заснавальніцы і ўдзельніцы ААН, што ўсе яны маюць права быць у Савеце Бяспекі...”). 30
Ігар Супаненка лічыць, што адказ на гэтыя і іншыя пытаньні можна будзедаць толькі ў 1995 годзе. Акрамя таго ён адзначае яшчэ тры моманты, зьвязаныяз гэтай праблемай:
а) Не ўсялякая ядзерная зброя патрэбна Беларусі, а толькі ракеты малойдальнасьці. Гэта некалькі супакоіць далёкіх суседзяў і паменшацца выдаткі на ўтрыманьне ракет (міжкантынэнтальныя ракеты нашмат даражэйшыя);
б) У сувязі з тым, што Беларусь ракетнае войска можа ўтрымаць толькі ў шчыльным Саюзе з Украінай і Расеяй, трэба, адпаведна, заплюшчыць вочы на старыя раны і з улікам гэтага весьці палітыку;
в) Калі ядзерныя сілы будуць падпарадкаваныя рэспубліканскаму кіраўніцтву, тады ўжо парлямэнт Беларусі будзе вырашаць канчаткова яе лёс. Ня трэба будзе лашчыцца і вымольваць на каленях, каб нам дазволілі стаць нэйтральнай і бяз’ядзернай. 31
Можна толькі зьдзіўляцца такому высокаму ўзроўню мысленьня капітанаСавецкай Арміі. Па шляху, абгрунтаванаму Ігарам Супаненкам, пайшла Ўкраіна. Яна прыдбала ўсе вышэйзгаданыя дадатныя моманты ды яшчэ выйграла эканамічна. І, наадварот, Беларусь, як вядома, усё гэта прайграла.

Але і тады ўжо, улічваючы стан нашага грамадзтва, склад Вярхоўнага Савета БССР, “казахстанцы” лічылі варыянт “ядзернай дзяржавы” (варыянт № 5) малаверагодным і распрацавалі варыянт № 4 — Узброеныя Сілы нэйтральнай бяз’ядзернай дзяржавы: “Рэспубліка ажыццяўляе Дэкларацыю аб суверэнітэце. Становіцца нарэшце суверэннай дзяржавай, адмаўляецца ад саюзаў і блокаў, выводзіць ядзерную зброю. Прынцып калектыўнай бяспекі становіцца стратэгічным напрамкам у палітыцы рэспублікі”. 32 Прынамсі такі варыянт афіцыйна зьдзяйсьняецца цяпер. Якім чынам? Гэта ўжо іншае пытаньне.

Гэты чацьвёрты варыянт прадугледжваў ладкаваньне Узброеных Сілаў з двух відаў войскаў:

- Сухапутныя войскі,
- Ваенна-паветраныя сілы (ВПС), у склад якіх уваходзяць войскі супрацьпаветранай абароны (СПА).

Падрыхтоўку кадраў для сухапутных войскаў меркавалася ажыцьцявіць на базе Менскай палітычнай вучэльні і ў вайсковай вучэльні, створанай набазе адной з дывізій Сухапутных войскаў. Таксама прадугледжвалася, асабліва на першым часе, выкарыстоўваньне ваенных установаў на тэрыторыі іншых саюзных рэспублік для падрыхтоўкі сваіх спэцыялістаў. Падрыхтоўка кадраў ВПС, на думку аўтара, адна з самых дарагіх рэчаў у сучасных арміях. Таму падрыхтоўка спэцыялістаў СПА прадугледжвалася на базе Менскай ВИЗРУ, а вось “…утвараць вучылішча ваенна-паветраных сіл, альбо рыхтаваць невялікую колькасць спецыялістаў за мяжой можна толькі ўсё грунтоўна зважыў, прааналізаваўшы ўнутрана-эканамічнае і знешне-палітычнае становішча на Беларус 33

Падрабязна быў распрацаваны і варыянт № 3, калі рэспублікі самі ўтвараюць і кантралююць Цэнтар, аддаюць яму стратэгічныя сілы, забіраюць сабе частку сілаў для фармаваньня рэспубліканскіх арміяў. Асновай такіх арміяў станавіліся б унутраныя войскі. Частка сухапутных войскаў, якая апынулася па-за стратэгічнымі сіламі СССР, таксама ўвайшла б у склад гэтых арміяў.

Варыянт № 2 і № 1, якія практычна пазбаўлялі Беларусь рэальнага сувэрэнітэту — толькі называліся, але не разглядаліся.

У шостым нумары “Рокаша” (травень 1991 г.) былі зьмешчаныя разважаньні Вацлава Сярпінскага: “ТРЭБА БРАЦЬ, або чым напоўніць суверэнітэт Беларусі”.. У артыкуле падрабязна выкладзеныя этапы фармаваньня беларускага войска па варыянту № 3.

Першы этап:

1. Дабіцца, каб прызыўнікі служылі на Беларусі;
2. Часткі Савецкай Арміі на тэрыторыі Беларусі атрымліваюць двайное падпарадкаваньне. У прыватнасьці, члены Ваенных саветаў ЧБВА, арміяў у складзе ЧБВА павінны прызначацца Ўрадам БССР;
3. Намесьнікі па палітчастцы павінны быць замененыя афіцэрамі па сувязях з грамадзкасьцю і прызначацца Ўрадам Беларусі;
4. Камандуючы ЧБВА павінен быць членам Ураду БССР па абароне;
5. Беларусь бярэ на сябе рэалізацыю часткі бюджэту Міністэрства Абароны СССР, якая будзе прызначаная для ўтрыманьня гэтых войскаў.

Другі этап:

6. Усе войскі МУС на тэрыторыі БССР пераходзяць пад уладу Міністэрства ўнутраных справаў БССР з паступовай заменай афіцэрскага складу і пераходам на беларускую мову і форму;
7. Рэарганізацыя структураў і выдзяленьне часьцей ЧБВА ў Беларускае Войска, як частку Узброеных Сілаў СССР; паступовая “нацыяналізацыя” афіцэрскага складу, пераход на беларускую мову, на нацыянальную форму і адзнакі;
8. Камандуючы Беларускім Войскам зьяўляецца намесьнікам Міністра Абароны СССР;

9. Часьці Беларускага Войска ўдзельнічаюць у вучэньнях і баявых дзеяньнях Узброеных Сілаў СССР на любым участку тэрыторыі СССР па плянах, зацьверджаных Міністрам Абароны СССР і ўзгодненых з Урадам Беларусі;
10. На тэрыторыі Беларусі, са згоды Ўраду Беларусі, могуць разьмяшчацца ічасьці Ўзброеных Сілаў другіх рэспублік. Пры гэтым Беларусь атрымоўваеарэндную плату за затраты на іх утрыманьне;
11. Вытворчасьць ці закупка ўзбраеньня — згодна з дамоўленасьцю з іншымі рэспублікамі;
12. Вярхоўны Савет Беларусі павінен прыняць Закон аб нацыянальным войску.

Як ужо адзначалася і як бачна з параўнальнага аналізу абедзьвіх канцэпцыяў — яны не супярэчаць адна адной. Можна адзначыць, што канцэпцыя арганізацыі Судніка больш шырокая і больш дэталізаваная, а канцэпцыя групыСтаткевіча — больш сыстэмная і больш лягічная.

Важна адзначыць і тое, што сябры нацыянальна-патрыятычных арганізацый, распрацоўваючы гэтыя канцэпцыі, мелі на ўвазе, што ажыцьцяўляць іх мусяць законнаабраныя існуючыя ўладныя структуры.

Такім чынам, як бачым, афіцэры-патрыёты па ўласнай ініцыятыве, на грамадзкіх пачатках, займаліся распрацоўкай канцэпцыі стварэньня беларускага войска.

А што ж тыя, каму належала гэта рабіць па пасадзе, па службовому абавязку? Сьведчаньняў, што такая праца вялася ў Вярхоўным Савеце БССР, ва УрадзеБССР і ў штабе ЧБВА — няма. А сьведчаньняў адваротнага кшталту — шмат. Прывядзем адно зь іх — выказваньні камандуючага ЧБВА генэрала Анатоля Кастэнкі ў інтэрвію газэце “ЛіМ”: “Але ж Беларусь з’яўляецца суверэннай дяржавай у складзе СССР, навошта ж ёй мець нацыянальнае войска? Дзеля прэстыжу? Ніхто ж яе суверэнітэту ў краіне не пагражае. Што ж тычыцца небяспекі, якая заўсёды пагражала нам з захаду, дык тут Беларусь можа спакойна абаперціся на Узброеныя Сілы краіны, якія не дадуць яе ў крыўду. Мае апаненты (маецца на ўвазе С.Гарбавец — М.В.) — прыхільнікі нацыянальных беларускіх фарміраванняў — не ўлічваюць усіх акалічнасцей гэтай справы. Свае Узброеныя Сілы? У такім выпадку ў рэспубліцы трэба будзе стварыць Міністэрства абароны з усімі адпаведнымі структурамі, ваенныя акадэміі і вучылішчы, бо не будзеш жа запрашаць ваенных спецыялістаў з іншых рэгіёнаў краіны. А ўзбраенне? Як вядома, у рэспубліцы не вырабляюцца ні сучасная ракетная тэхніка, ні танкі, ні самалёты і верталёты... Логіка падказвае, што функцыі абароны краіны павінны належаць Цэнтру, якому іх дэлегуюць рэспублікі, у тым ліку і Беларусь. Я прыхільнік адзінай саюзнай арміі...”.34

Гэтая доўгая цытата прыведзеная ня толькі дзеля паказу “ўзроўню” і “лёгікі” аргумэнтацыі генэрала, а таму, што праз пэўны час (менш году), яго аргумэнтацыя дзіўным чынам памяняецца на супрацьлеглую.

**На шляху да адзінай арганізацыі**

У адказ на вышэйзгаданае інтэрвію Анатоля Кастэнкі, Ігар Супаненка напісаў у газэту “Рокаш” артыкул “Рэспубліка, Суверэнітэт, Армія”. Аўтар цьвяроза ацэньваў сытуацыю на Беларусі і, у прыватнасьці, пісаў:

“Цяперашні склад Вярхоўнага Савета сведчыць аб тым, што... чакаць ад ягокрокаў да сапраўднага суверэнітэту наўрад ці можна. Усё залежыць ад таго, у якім стане Беларусь падойдзе да наступных выбараў, ці саспее на самавызначэнне народ, як пройдуць гэтыя выбары і хто на іх пераможа.

У любым выпадку трэбарыхтавацца да будучых вялікх спраў. Гуртавацца трэба афіцэрам беларускага паходжання, пашыраць і наладжваць сувязі сярод вайскоўцаў, якія служаць і якія ў запасе. У будучым ёсць сэнс правесці сход, альбо з’езд беларусаў вайскоўцаў, дзе больш падрабязна абмеркаваць вайсковыя пытанні, дапамагчы будучаму (а мо ўсё ж і цяперашняму) парламенту і ўраду стварыць нацыянальную Армію”. 35

У лісьце ад 9 жніўня 1991 году на імя М.Статкевіча (у Менск ліст прыйшоў падчас путчу — 20.08.1991 г.) І.Супаненка ставіць пытаньне больш канкрэтна: “На Украіне адбыўся сход афіцэраў (і былых таксама). У нас ніякіх адтуль (маецца на ўвазе зь Беларусі — М.В.) вестак. Што вы можаце сказаць аб гэтым? Ці зможам мы правесці такі сход, ці ёсць перспектыва яго правесці ў будучым? Што наконт гэтага растлумачыць сваім хлопцам?”. 36
Прыведзеныя вытрымкі сьведчаць:
- што сябры нацыянальна-патрыятычнай арганізацыі ў горадзе Прыазёрску ня думалі, што пытаньне практычнага стварэньня беларускага войска паўстане так хутка;
- што пакуль яны ня ставілі наўпрост пытаньне аб стварэньні адзінай арганізацыі, хоць і меркавалі правесьці сход усіх афіцэраў беларускага паходжаньня. І, як можна меркаваць, правесьці гэта ў цеснай лучнасьці з беларускімі ўладамі і дзеля дапамогі ім. Усё ж было спадзяваньне, што досьвед беларусаў-вайскоўцаў і іх адданасьць Радзіме спатрэбяцца.
Праца па наладжваньні сувязяў з вайскоўцамі-беларусамі з іншых месцаў СССР вялася адразу пасьля практычнага згуртаваньня вайскоўцаў у горадзе Прыазёрску. Былі наладжаныя сувязі з арганізацыямі і проста невялікімі групамі-зямляцтвамі: 1989 год — г. Цьвер; 1990 год — г. Кастрама, Уладзімірская вобласьць (гл. “Рокаш”, № 2, верасень 1990 г.); 1991 год — Летува, Эстонія, г. Ленінград, г. Тында, г. Хабараўск, г. Лёндан (гл. “Рокаш” № 8, жнівень 1991 г.), а таксама Масква і Менск.
З студзеня 1991 году такую ж працу і ўжо з канкрэтнай мэтай — стварэньне адзінай нацыянальна-патрыятычнай арганізацыі (праўда, не было акрэсьленых тэрмінаў і падыходаў па яе стварэньні) — пачала маскоўская арганізацыя. Дзякуючы Звароту, падрыхтаванаму Віктарам Нагнібядой, сувязь з маскоўскай арганізацыяй устанавілі больш за сорак групаў і асобных людзей, утым ліку група Статкевіча, арганізацыя Судніка, Сяргей Чыслаў (Чыцінская вобласьць Расеі) і г. д.
Як ужо адзначалася, пасьля ўстаноўчага зьезду БСДГ група Статкевіча, ужо як ваенная сэкцыя БСДГ, пачала весьці прадуманую працу па стварэньніарганізацыі нацыянальна-патрыятычна настроеных вайскоўцаў у рамках структураў партыі “Беларуская сацыял-дэмакратычная Грамада”. Дарэчы, на той час БСДГ была адзінай дэмакратычнай партыяй, якая адмыслова займалася вайсковым пытаньнем. Кіраўніцтва партыі, сам М.Статкевіч, і пасьля сустрэчы ў чэрвені 1991 году Статкевіча і Чыслава з Станіславам Суднікам, па-ранейшаму лічылі, што “БСДГ павінна ўзяць на сябе гэтую справу, дапамагчы людзям сабрацца, уз’яднацца, знайсці адзін аднаго”. 37
Але жыцьцё ўнесла свае карэктывы, паскорыла працэс аб’яднаньня патрыётаў-вайскоўцаў, падказала прынцыпы гэтага аб’яднаньня.
*(працяг у наступным нумары)*

Спасылкі:
1 Дубянецкі Э. Выйсці з нацыянальнага анабіёзу // Літаратура і мастацтва, 1992, 5 чэрвеня, № 23
2 Тамсама
3 Суднік С. Суд // Наша слова, 1990, верасень, №7
4 Вярхоўнаму Савету Беларускай ССР, рэдакцыі газеты “ЛіМ” // Літаратураі мастацтва, 1989, 8 сьнежня, № 49
5 Даклад намесніцы старшыні Савета Міністраў БССР дэпутаткі Н.Н.Мазай на 14-ай сесіі Вярхоўнага Савета Беларускай ССР 11-га склікання // Звязда, 1990, 27 студзеня
6 Зварот да народных дэпутатаў Вярхоўнага Савета БССР // Рокаш, 1990, жнівень, № 1; Архіў БЗВ. Фонд 2, 1990 г., дакумэнт №1
7 “Рокаш” – старабеларускае слова... // Рокаш, 1990, жнівень, №1
8 Дарэчы, беларусазнаўства, як прадмет, пачалі выкладаць на Беларусі ў вышэйшых навучальных установах пазьней, у 1991 годзе.

9 Беларуская нядзельная школа ў Казахстане // Рокаш, 1990, верасень, № 2
10 Прамова на Ўстаноўчай канфэрэнцыі згуртаваньня "Бацькаўшчына" Ігара Супаненкі // Рокаш, 1990, верасень, № 2
11 Адгалоскі: Беларускія вайскоўцы яднаюцца // Літаратура і мастацтва, 1991, 1сакавіка, № 9
12 Пастанова сходу ініцыятыўнага камітэту беларусаў-вайскоўцаў г.Масква, 13 красавіка 1991 года // Архіў БЗВ. Фонд 2, 1991 г., дакумэнт № 2
13 Статут згуртавання беларусаў-вайскоўцаў г.Масквы // Архіў БЗВ. Фонд 2, 1991 г.., дакумэнт № 3
14 Каардынацыйны камітэт ЗБВ, "Да беларусаў вайскоўцаў" // Архіў БЗВ. Фонд 1, 1991 г., дакумэнт № 2
15 Зварот Каардынацыйнага камітэту згуртавання беларусаў-вайскоўцаў (ЗБВ) да Вярхоўнага савета БССР // Архіў БЗВ. Фонд 1, 1991 г., дакумэнт № 1
16 Архіў БЗВ. Фонд 1, 1989 г., справа № 1
17 Гісторыя БЗВ (складзена кіраўніцтвам БЗВ 14 чэрвеня 1994 г.) // Архіў БЗВ. Фонд 3, 1994 г., дакумэнт № 14, б. 3-4
18 Тамсама, б. 4
19 Шаноўны спадар! Сябры камісіі БСДГ па вайсковых пытаннях: народны дэпутат БССР Віталь Малашка, Мікалай Статкевіч, Сяргей Чыслаў // Архіў БЗВ. Фонд 3, 1991 г., дакумэнт № 1
20 Айзенштадт Г. Диалог без ретуши. "Свою" армию — в штыки?" // Знамя юности, 1991, 17 траўня, № 94
21 Лаўрынавічус Йонас. Чаму нам патрэбна беларускае войска. Сваімі думкамі дзеліцца падпалкоўнік Савецкай Арміі, кандыдат тэхнічных навук, член Цэнтральнай Рады БСДГ М.Статкевіч // Добры вечар, 1991, 27 ліпеня, № 86
22 Гісторыя БЗВ, б. 4
23 Гарбавец С., ваеннаслужачы. Думка чытача. Ці патрэбна нацыянальнае войска // Літаратура і мастацтва, 1990, 6 ліпеня, № 27
24 Декларация Верховного Совета Белорусской Советской Социалистической Республики "О государственном суверенитете Белорусской Советской Социалистической Республики" // Советская Белоруссия", 1990, 30 ліпеня
25 Гарбавец С. Дзе і як служыць беларусам // Літаратура і мастацтва, 1990, 5 кастрычніка, № 40
26 Айзенштадт Г. Диалог без ретуши. "Свою" армию – в штыки? // Знамя юности, 1991, 17 траўня
27 Прамова на Установчай канферэнцыі згуртавання "Бацькаўшчына" Ігара Супаненкі // Рокаш, 1990, верасень, № 2
28 Добры вечар, 1991, 27 ліпеня, № 86
29 Супаненка І. Рэспубліка, Суверэнітэт, Армія // Рокаш, 1991, люты, № 3]
30 Рокаш, 1991, люты, № 3
31 Тамсама
32 Тамсама
33 Тамсама
34 Замскі М. Рэспубліка, суверэнітэт, армія. Гутарка з камандуючым ЧБВА, народным дэпутатам СССР А.І.Кастэнкам // Літаратура і мастацтва, 1990, 30 лістапада, № 48
35 Супаненка Ігар. Рэспубліка, Суверэнітэт, Армія. // Рокаш, 1991, люты, № 3
36 Архіў БЗВ. Фонд 5, 1991 г., дакумэнт № 4
37 Лаўрынавічус Йонас. Чаму нам патрэбна беларускае войска. Сваімі думкамі дзеліцца падпалкоўнік Савецкай Арміі, кандыдат тэхнічных навук, член Цэнтральнай Рады БСДГ М.Статкевіч // Добры вечар, 1991, 27 ліпеня, № 86

*В. Дубноўскі*

**Спроба ўтварэньня Беларускага Вызвольнага Цэнтру ў Швэдыі. 1943-1945 гг.**

Беларускі вызвольны рух у часы Другой сусьветнай вайны ня меў свайго палітычнага прадстаўніцтва ні ў ЗША, ні ў Ангельшчыне. Таму ўзьняць "беларускае пытаньне" перад урадамі заходніх саюзьнікаў не было каму. Праўда, як паказала далейшае разьвіцьцё падзеяў, нават Польшча і прыбалтыйскія краіны, якія мелі на эміграцыі прадстаўніцтвы і ўрады, не пазьбеглі савецкай акупацыі. Але падчас вайны ніхто ня мог прадбачыць такой сытуацыі, таму беларускія незалежніцкія палітыкі спрабавалі наладзіць кантакты з Захадам. Паводле эміграцыйных крыніцаў, у жніўні альбо ў верасьні 1941 г. свайго дэлегата на выезд на Захад у якасьці прадстаўніка Беларускага Рэзыстансу зьбіралася выслаць незалежніцкая група Вінцэнта Гадлеўскага. Пасьля адмовы Гадлеўскага, у Стакгольм праз Нарвэгію паехаў Альберт Асоўскі, а ў 1942 г. — Васіль Лукашык і Язэп Федарчук. Асоўскі, на даручэньне Гадлеўскага, напісаў лісты ў Чыкага да мясцовых беларускіх дзяячоў Чарапука, а.Рэшаця ды іншых з заклікам арганізавацца і актывізавацца ў справе беларускае незалежнасьці перад заходнімі саюзьнікамі. Гэта было выканана, і ўжо 7 верасьня 1941 г. была зарганізаваная Беларуска-Амэрыканская Нацыянальная Рада ў ЗША (Беларускія навіны (Парыж), 1945, № 1, 25 сьнежня; "Беларуская царква" (Чыкага), 1965, № 28, б. 76-77, 93-94). Гісторык Ю.Туронак лічыць, што роля А.Асоўскага ў гэтым надуманая ды спасылаецца на ліст а.Рэшаця да В.Лукашыка ад траўня 1945 г., у якім ён піша, што ў часе вайны не атрымліваў зьвестак ад беларусаў з Эўропы (Беларускі гістарычны агляд (Менск), 1999, Т. 6, Сш. 1-2 (10-11), сьнежань). Аднак ёсьць падставы меркаваць, што нейкія кантакты паміж групай Гадлеўскага і беларусамі ў ЗША маглі быць. Той жа падпольны "Бюлетэнь БНП" (№ 2, [1942 г.]) надрукаваў артыкул "Беларусы ў Амэрыцы", у якім паведамляў пра дзейнасьць "Беларускага Камітэту" у ЗША.
Паводле В.Дубноўскага, артыкул якога мы прапануем чытачам "БР", выезд Асоўскага ў Швэцыю адбыўся ў 1943 г., і Гадлеўскі ўжо ня мог мець да яго ніякага дачыненьня. Паводле гэтай вэрсіі, выслалі яго туды кіраўнікі бэрлінскіх беларускіх арганізацыяў. Артыкул Дубноўскага цікавы і тым, што ў ім згадваецца зусім невядомы праект стварэньня БНК у Швэцыі ў 1944 г. Аднак і гэтая, і іншыя спробы беларускіх нацыянальных дзеячоў (у тым ліку і тыя, што рабіліся праз польскае падпольле АК) навязаць сувязь з заходнімі саюзьнікамі і ўтварыць у вольнай ад нямецкай акупацыі заходняй альбо паўночнай Эўропе беларускае прадстаўніцтва, не дасягнулі жаданага выніку. Апошняя спроба выслаць дэлегатаў на Захад была зьдзейсьненая кіраўніцтвам падпольнай Беларускай Незалежніцкай Партыі ў канцы 1944 — у пачатку 1945 гг., але было ўжо запозна. Заходнія саюзьнікі сумесна з Савецкім Саюзам ужо вырашылі лёс ня толькі Беларусі, але й Польшчы. Беларускія палітычныя цэнтры на Захадзе паўстануць у пасьляваенны час і будуць утвораныя новай хваляй эміграцыі.

Адсутнасьць вялікіх скупінаў беларускае палітычнае эміграцыі на Захадзе вельмі адмоўна адбівалася на ўсім беларускім пытаньні сярод вольнага сьвету. Беларускаму актыву на Бацькаўшчыне і ў Нямеччыне было ясна, што дзеля таго, каб належна паставіць беларускую справу ў паваенных вырашэньнях вольнага сьвету, неабходна стварыць беларускае нацыянальнае прадстаўніцтва па-за межамі засягу гітлераўскае Нямеччыны, пад якой з мусу апынулася Беларусь і амаль увесь беларускі нацыянальны актыў.
Адсутнасьць гэткага прадстаўніцтва пагражала тым, што бальшавіцка-маскоўская агентура ачэрніць перад прадстаўнікамі Захаду ўвесь беларускі нацыянальны рух, як "нямецкіх

калябарантаў”, а сваю агентуру прадставіць за праўдзівых беларускіх патрыётаў, што магло-б нанесьці беларускай справе неаблічоныя шкоды.
Каб неяк выратавацца з пагражаючай сытуацыі, на патаемнай нарадзе беларускага актыву ў Бэрліне (1943 г.), у якой прыймалі ўдзел прадстаўнікі розных беларускіх арганізацыяў, як “Беларускае прадстаўніцтва” (інж. Шкутка, падаем толькі ачольваўшых прадстаўніцтвы), БНСамапомач (сп. М.Шкялёнак), былы прадстаўнік БНР у Нямеччыне (сп. Бароўскі), Беларуская камісія па вызваленьню ваеннапалонных (сп. В.Камароўскі) ды інш. Нарада пастанавіла перакінуць у Швэдыю, дзе ўжо знаходзіўся, уцёкшы перад тым з Беластоку ягоны першы беларускі бурмістр, беларускі нацыянальны працаўнік сп. Лукашык1,у дапамогу першаму, сп. інж. А.Асоўскага2.
Дзеля гэтага А.Асоўскага ўладжваюць на працу ў нямецкую паўваенную будаўнічую арганізацыю “Тодт” у аддзел, які накіроўваецца ў захопленыя немцамі Данію і Нарвэгію. З тым, што ён, пры нагодзе, мае перайсьці швэдзкую мяжу ды навяжыць лучнасьць з сп. Лукашыкам ды іншымі, якія маюць быць перакінутыя туды беларускімі эмігрантамі. Ды арганізуюць Беларускі Нацыянальны Камітэт, які-б мог свабодна дзеіць у абароне беларускай справы сярод хаўрусьнікаў Заходу ды інфармаваць вольны сьвет аб запраўдным становішчы Беларускага Народу і ягоных імкненьнях.
Замер перакідкі інж. А.Асоўскага ўдаўся, але, на жаль, не ўдалася іншая частка праекту беларускага актыву, бо сп. Асоўскі БНК у Швэдыі не арганізаваў.
У 1944 г., калі ў Нямеччыне апынуліся ўвесь беларускі актыў, беларускія вайсковыя часткі ды масы ўцекачоў, патрэба стварэньня БНК на нэўтральным груньце сталася яшчэ больш палкай. Хадзіла ўжо ня толькі аб інфармаваньнівольнага сьвету, але і аб ратаваньні прадбачаных пераходах на бок хаўрусьнікаў беларускіх вайсковых частак, якія немцы мусам перакідалі на францускі фронт, а разам і аб магчымасьцях стварэньня беларускіх збройных адзінак на баку хаўрусьнікаў.
Аб патайным пасланьні групы людзей ня было і мовы, бо гэта было тэхнічна немагчыма, а таму пачалі шукаць іншыя магчымасьці. Сама пастанова аб новай спробе прарыву з ціскоў гітлероўскай Нямеччыны была на гэты раз прынятая групаю “Двупагоні” (Грамада) 3, якая кіравала на той час афіцыйнай беларускай установай “Беларускае Інфармацыйнае Бюро”, якое падлягала БЦР.
Грамадаўцы навязваюць блізкі кантакт з прадстаўніком нямецкіх антыгітлероўскіх колаў — баронам Танэнфэльдам. Барон Танэнфэльд — б[ылы] афіцэр нямецкага войска, але касмапаліт паводле паглядаў, рамантык і паэта, удзельнічаў у беларускім русе яшчэ ў 1918—20 гг., калі ўступіў у армію Балаховіча ды належыў да ягонага “першага ўраду Беларусі”, як міністр замежных спраў. Як экспэрт беларускіх спраў ён працуе ў 1943—1944 гг. пры аддзеле Міністэрства прапаганды ў Бэрліне “Вінэта”. Барон Танэнфэльд поўнасьцю падтрымоўвае думку “двупагоньнікаў” аб неабходнасьці стварэньня БНК у Швэдыі.
Да нямецкага Міністэрства прапаганды быў паданы ад імя Беларускага Інфармацыйнага Бюро мэмарыял, у якім прасілася дазволу перакінуць у Швэдыю беларускіх працаўнікоў, каб яны там стварылі БНК, які неабходны дзелябарацьбы там з бальшавіцкай прапагандай. Прадбачачы, што нямецкія ўладыня згодзяцца на гэткі праект самастойнага існаваньня БНК у нэўтральнайкраіне, дзе немцы не змаглі-б яго прымусіць выконваць іхныя загады, мэмарыял прапанаваў таксама пасылку разам з беларусамі аднаго немца, які-б кантактаваў міністэрства з БНК і ўзгадняў працу. Кандыдатам на гэтую пасаду БІБюро прапанавала вызначыць барона Танэнфэльда, як ведаюча[га] беларускую мову.
Па даўжэйшай цяганіне па міністэрствах БІБ атрымала на мэмарыял катэгарычную адмову, а барон Танэнфэльд, як падтрымліваючы гэтыя прапазыцыі (ён, як экспэрт беларускіх справаў, склаў сваю апінію аб неабходнасьці падтрыманьня немцамі гэтае ініцыятывы БІБ) быў звольнены з працы ў Міністэрстве прапаганды. Як выявілася пазьней, міністэрства Гэбельса было нат згоднае дапусьціць гэтую перакідку беларусаў па-за межы нямецкага засягу, але

гэтаму супрацьставілася Ўсходняе Міністэрства і Міністэрства нутраных спраў, якія катэгарычна адкідалі падобную магчымасьць.4
Такім чынам Беларусы, на час заканчэньня ваенных падзеяў, ня мелі свайго нацыянальнага незалежнага воргану па-за тэрыторыямі нямецкае акупацыі, які-б змог быць прадстаўніком Беларускага Народу перад хаўрусьнікамі. Адбілася гэта жахліва на долі нашых масаў уцекачоў і вайскоўцаў, якіх сілаю выдавалі бальшавіком на сьмерць і кананьне ў концах, або загонам у шэрагі польскіх аддзелаў, пазьней кінутых таксама на сьмерць пад Монтэ Касіно, або гінучых і сяньня ў шэрагах Чужаземнага францускага легіёну ў джунглях Інда-Кітаю.
Беларускі Нацыянальны Камітэт у Швэдыі5, але мясцовага значэньня, зарганізаваўся толькі пару год па вайне, як арганізацыя беларускае эміграцыі ў Швэдыі. Ачолілі яго ўжо ўспомненыя сп. сп. Лукашык і Асоўскі6, але значнейшае ролі ў беларускім нацыянальным русе на эміграцыі гэты БНК не адгуляў і ня мае ўплываў да сяньня, дзеля малой колькасьці беларускае эміграцыі ў Швэдыі, або дзеля яе далейшага расьсяленьня.
*Дакуманты і факты (Нью-Ёрк — Таронта), 1957, студзень-сакавік, № 11.*

Спасылкі:
1 Васіль Лукашык (1905 — 1975), беларускі палітычны дзяяч. Паходзіў з Сакольшчыны. На пачатку нямецкай акупацыі быў бурмістрам Беластоку, удзельнічаў узаснаваньні ў Менску падпольнай арганізацыі “Беларуская Народная Грамада”. Быў арыштаваны гэстапа, але здолеў уцячы з канцлягеру Асьвенцым. Затрыманы ў Варшаве паўторна, але дзякуючы фальшывым дакумэнтам, ня быў распазнаны, адпраўлены на прымусовую працу ў Нарвэгію. У 1944 г. з групай з 10 беларускіх хлопцаў уцякае праз горы ў Швэцыю (Котлярчук А. Швэды ў гісторыі й культуры беларусаў. Менск, 2002, б. 221-222; Котлярчук А. Суполка “Беларуская Грамада” ў Швэцыі 1948 — 1975-х гадоў // Беларус (Нью-Ёрк), 2002, № 470, сакавік). Таму вэрсія Пануцэвіча не адпавядае сапраўднасьці, як і няясная вэрсія Дубноўскага, бо Асоўскі ў 1943 г. яшчэ ня мог ехаць у Швэцыю да Лукашыка, бо апошняга там ня было. Арганізацыю “Беларуская Грамада” Лукашык разам з Федарчуком засноўваюць у Швэцыі толькі ў канцы 1948 г.
Даволі нечаканай зьяўляецца вестка Барыса Данілюка з ЗША пра прыезд В.Лукашыка ў Бэрлін у канцы 1944 году:
“Лукашыка, што прыязджаў із Швэдыі, я бачыў у Берліне пад канец 1944-га году.. Не памятаю толькі, ці ў канцыляры і Езавітава, у якой я працаваў, ці ў харчоўні ТОДТу, у якой працаўнікі БЦР сталаваліся. Зь ім я не размаўляў, а ад іншых даведаўся, што ён сьпяшаў і зараз-жа паехаў з Бэрліну” (З ліста Б. Данілюка да С. Ярша ад 18 кастрычніка 2004 г.).
2 Альбэрт Асоўскі — архітэктар, удзельнік “Першага беларускага штурмовага зьвязу”, спэцыяльнага дывэрсійнага аддзелу, які ў чэрвені 1941 г. быў закінуты на тэрыторыю БССР. Пра яго жыцьцё і дзейнасьць у Швэцыі нічога невядома.
3 Маецца на ўвазе падпольная нацыянальная арганізацыя “Беларуская Народная Грамада” альбо “Грамада”, якая ў 1941—1944 гг. дзейнічала на тэрыторыіБеларусі (кіраўнікі — Юльян Саковіч, Сяргей Хмара), а ў канцы 1944-га аднавілася ў Бэрліне пад назвай “Двупагоня” (сымбаль барацьбы супраць ворагаў з усходу і захаду).
4 Рэальнасьць гэтых падзеяў пацьвярджаюць архіўныя дакумэнты Галоўнага кіраўніцтва вайсковых спраў БЦР. У першай палове верасьня 1944 г. беларускі прапагандовы аддзел сувязі “Вінеты” падрыхтаваў да друку адозву “Браты Беларусы” (Адозва Беларускага Камітэту ў Швэдыі), якая, відаць, пасьляскандалу і звальненьня Танэнфэльда, не была надрукаваная (НА РБ, ф, 383, воп.1,спр.2, арк.14).
5 Насамрэч, арганізацыя “Беларуская Грамада” у Швэдыі.
6 Пра ўдзел у гэтай арганізацыі Асоўскага нічога невядома.

**ДАКУМЭНТЫ**

**Падпольны беларускі друк падчас нямецкай акупацыі 1941—1944 гадоў**

Разам з кронікай партызанскай і падпольнай барацьбы, Беларускі Рэзыстанс 1940-50-х гадоў пакінуў нам у спадчыну свой падпольны друк. Дасьледаваньняў яго дагэтуль ня было зроблена, бо найбольш поўныя зборы па-ранейшаму знаходзяцца ў спэцсховішчах. Больш вядома пра беларускі нелегальны друкчасоў нямецкай акупацыі, хоць некаторыя дасьледчыкі і адмаўляюць яго існаваньне.

Сяргей Жумар у кнізе "Оккупационная периодическая печать на территории Беларуси в годы Великой Отечественной войны" (Менск, 1996) сьцьвярджае, што беларускімі нацыяналістамі падчас нямецкай акупацыі "не было створана і сваёй падпольнай прэсы" (б. 249). Сьцьверджаньне, вядома, спрэчнае. Жумарня мог ня ведаць пра існаваньне хаця б "Бюлетэню БНП". Але ён гэты ды іншыя факты ўпрост праігнараваў. Васіль Раманоўскі ў сваёй кнізе "Саўдзельнікі ў злачынствах" (Менск, 1964) згадаў існаваньне пад нямецкай акупацыяй "Бюлетэню БНП", назваўшы яго "бруднымі лісткамі", якія "заклікалі моладзь і інтэлігенцыю актыўна змагацца супраць СССР, за стварэньне беларускай буржуазнай дзяржавы" (б. 188). Юры Туронак у кнізе "Беларусь пад нямецкай акупацыяй" (Менск, 1993) бярэ пад сумнеў той факт, што "Бюлетэнь БНП" быў нелегальным выданьнем (б. 196). Уладзімер Гуленка ў энцыкляпэдычным артыкуле чамусьці піша, што БНП выдавала "Беларускі інфармацыйны бюлетэнь" (Энцыкляпэдыя гісторыі Беларусі, т.1, Менск, 1993, б. 393).

Сапраўды, у гады Другой сусьветнай вайны беларускі нацыянальны падпольны друк быў нязначным. Прычынай гэтага была й слабасьць нацыянальнагаруху, і калябарацыя зь нямецкімі акупантамі многіх беларускіх дзеячаў (частка іх працавала ў легальнай, дазволенай акупантамі, прэсе), і адсутнасьць неабходнай тэхнічнай базы (як і дапамогі звонку) ў нацыянальнага падпольля. Самым вядомым падпольным пэрыёдыкам зьяўляецца "Бюлетэнь Беларускай Незалежніцкай Партыі".

Дата заснаваньня "Бюлетэню БНП" пакуль канчаткова нявызначана. Па адных зьвестках, ён быў заснаваны Цэнтральным Камітэтам БНП летам 1942 г. у Менску. Пра гэта сьведчыць сябра ЦК БНП Барыс Рагуля (Ёрш С. Вяртаньне БНП. Асобы і дакумэнты Беларускай Незалежніцкай Партыі. Слонім—Менск, 1998, б.127). Сябра ЦК БНП Дзімітры Касмовіч у сваіх успамінах згадвае, што рашэньне пра заснаваньне свайго выданьня было прынятае на нарадзе Родзькі, Вітушкі і Касмовіча ў Віцебску 29-30 ліпеня 1942-га (Каваль Я. Генэрал вызвольнага фронту. Менск, 2002, б.16). Васіль Раманоўскі піша, што рашэньне пра выданьне "Бюлетэню БНП" было прынятае нарадай партыйнага кіраўніцтва, якая адбылася ў кастрычніку 1942-га (Саўдзельнікі ў злачынствах, б.188). А Вацлаў Пануцэвіч, не падаючыкрыніцы інфармацыі, сьцьвярджаў, што на варшаўскай нарадзе незалежнікаў напрыканцы жніўня 1941 г. Ус. Родзька "меў пры сабе № 1 БЮЛЕТЭНЮ Беларускай Незалежніцкай Партыі, [які] магчыма быў сьвежа адбіты пры ўдзеле Гадлеўскага ў Варшаве" (Пануцэвіч В. Кс. Вінцэсь Гадлеўскі. Дзяржаўны Муж і Правадыр Народу // Беларуская царква (Чыкага, ЗША), 1965, № 28, б.93; Спадчына (Менск), 1993, № 6, б.70).

Разьбежка ў датах зьявілася невыпадкова. Савецкая разьведка ў сваіх данясеньнях у Маскву ў 1943 годзе згадвала "першы нумар бюлетэню беларускіхэмігрантаў за 1940 г." (НАРБ, ф.4, в.33а, спр.524, арк.185). Намі была выказаная гіпотэза, што на варшаўскай нарадзе 1941 г. Родзька мог мець якраз эміграцкі бюлетэнь (Вяртаньне БНП, б.130). Аднак Ю. Туронак зусім слушна адзначыў, што пра такі бюлетэнь дагэтуль нічога не было вядома і яго ніхто з дасьледчыкаў ня згадваў (Туронак Ю. Да генэзы БНП, або як ствараліся міфы // Беларускі гістарычны агляд (Менск), Т.6, 1999, Сш.1-2(10-11), сьнежань). З дапамагой далейшых

архіўных пошукаў удалося ўстанавіць, што за “бюлетэнь беларускіх эмігрантаў” савецкая разьведка лічыла “Бюлетэнь Беларускай Незалежніцкай Партыі № 1-1940 г.”.
У Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь захоўваюцца некалькі варыянтаў першага нумару “Бюлетэню БНП”, пазначаных 1940 годам. Намі былі выяўленыя два варыянты ягонага перакладу на расейскую (па дзьве копіі — НА РБ,ф.3500, в.2, спр.51, арк.40-44; 107-109адв; 110-112адв; 238-245). Цікава, што ў ролі аднаго з перакладчыкаўвыступае намесьнік начальніка апэратыўнай чэкісцкай групы Менскай вобласьці падпалкоўнік дзяржбясьпекі Соцікаў. Ягоны пераклад “Бюлетэню БНП” быў выкананы 26 сакавіка 1943 году (НА РБ, ф.3500, в.2, спр.51, арк.109 адв.). У гэтай жа архіўнай справе знаходзіцца і беларускамоўны варыянт першага нумару нелегальнага пэрыёдыка, таксама пазначаны 1940 годам (НА РБ, ф.3500, в.2, спр.51, арк. 45-51). Усавецкіх партызанскіх дакумэнтах ёсьць згадка і пра захоплены савецкімі партызанамі “Бюлетэнь БНП”, пазначаны 1941 годам (НА РБ, ф.3500, в.2, спр.46, арк.283).
Яшчэ больш заблытвае справу знаходка беларускім гісторыкам Алесем Гелагаевым у фондах Расейскага дзяржаўнага архіву сацыяльна-палітычнайгісторыі (РДАСПГ) у Маскве арыгіналаў двух першых нумароў “Бюлетэню БНП” (РДАСПГ, ф.17, в.125, спр.251, арк.119-120адв.,121-126адв.). На гэтых асобніках год выданьня не пазначаны. Каб разабрацца ў гэтай праблеме мусім прааналізаваць “Бюлетэні”, знойдзеныя ў менскім і маскоўскім архівах. Тэкст другога нумару, практычна, не адрозьніваецца, таму зьвернем увагу на № 1. Першае адрозьненьне — у маскоўскім арыгінале няма даты, якая ў менскіх копіях пазначана 1940 і 1941 гадамі. Другое — у маскоўскім арыгінале № 1 падана, што гэта “орган вызвольнага Сялянска-Работніцкага Руху”. Ва ўсіхназваных намі менскіх копіях — “Орган беларускага вызвольнага руху”. Трэцяе — зьнешне падобны зьмест бюлетэняў, насамрэч мае шмат адрозьненьняў, і ня толькі моўных. Напрыклад, у маскоўскім арыгінале ў адозьве адсутнічае частка тэксту, якая ёсьць у менскім варыянце пасьля заклiку “Мы клічам у нашыя рады”: “...ўсіх чэсных змагароў за гэтыя самыя ідэалы. Не абяцаем на сёньня нічога апрача цяжкага штодзённага змаганьня. Мы не са слоў ілёзінгаў, не з пасадаў і адзначэньняў будуем сваю сілу, але з цяжкае працыі поту, з крыві і ахвяраў п[і]янераў нашага нацыянальнага паўстаньня” (НА РБ, ф.3500, в.2, спр.51, арк.46).
У канцы “Аснаўной ідэалягічнай праграме БНП” у маскоўскім варыянце адсутнічае такі сказ: “Павадыры і сябры Беларускай Незалежніцкай Партыізабавязваюцца, калі трэба, з ахвяраю ўласнага жыцьця праводзіць безаглядна ў жыцьцё пададзеную праграму” (НА РБ, ф.3500, в.2, спр.51, арк.51). І, наадварот, у менскім варыянце першага нумару “Бюлетэню БНП” у зацемцы “Чэсьць памяці змагароў!” зьмешчаная інфармацыя толькі пра Пётру Рандарэвіча, і нічога не сказана пра Лубчонка (праўда, ён згадваецца, як “Дубчонак”, у адным зь ведамых нам перакладаў “Бюлетэню БНП” на расейскую мову — НАРБ, ф.3500, в.2, спр.51, арк.109адв.).
Праўдападобна, першы нумар “Бюлетэню БНП” сапраўды меў, як мінімум, два выданьні, прычым, зьдзейсьненых рознымі людзьмі (першы — Вінцэнтам Гадлеўскім у Варшаве (?), другі — Міхасём Рагулем у Віцебску. — Вяртаньне БНП,б.127). І неабавязкова, што першы варыянт выйшаў у 1940 годзе, бо гэтую дату магліпаставіць і ў мэтах канспірацыі (што найбольш верагодна). А копіі маглі выконваць ня толькі чэкісты, але і самыя падпольшчыкі (дарэчы, паводле Б.Рагулі, наклад другога нумару, які быў памножаны ім у Наваградку, складаў каля 500 асобнікаў. — Вяртаньне БНП, б.128).
Тэма для асобнага дасьледаваньня — антыжыдоўскія выказваньні ў некаторых матэрыялах другога нумару “Бюлетэню БНП”, што для падпольнай антынацыскай прэсы было не характэрна (падобнага было дастаткова шмат у легальнай, паднявольнай прэсе, якая знаходзілася пад нямецкай цэнзурай). Ягоныя выдаўцы, якія пасьля вайны апынуліся на эміграцыі (Міхась Рагуля, Барыс Рагуля ды інш.) пра гэта змаўчалі.

Другі нумар “Бюлетэню БНП”, які быў падрыхтаваны да друку канцы 1942 г., алевыйшаў, верагодна, у пачатку 1943 г. (Вяртаньне БНП, б.127, 128), стаўся апошнім, што друкаваўся на тэрыторыі Беларусі. Наступныя чатыры нумары выйшлі ў Нямеччыне на працягу 1944—1946 гадоў.
Пра іншыя беларускія падпольныя пэрыёдыкі часоў нямецкай акупацыі вядома вельмі мала. П.Рагач у сваім “Кароткім аглядзе гісторыі Беларусі” (Кліўленд—Нью-Ёрк—Талін, 1990, б.86) згадвае “нелегальныя газэты й лістоўкі, якія заклікалі Беларусаў да абароны сваіх правоў” і якія выдавала нацыянальнае падпольле. Паводле Івана Касяка, “палітычны часапіс на ратататры”выдавала нацыянальная партызанская група Ўладзімера Шавеля, якая дзейнічала на Барысаўшчыне ў пачатку 1942 г. (Найдзюк Я., Касяк І. Беларусь учора і сяньня. Менск, 1993, б.292). Аднак адсутнасьць адзінага моцнага каардынацыйнага цэнтру Беларускага Рэзыстансу, які спрабаваў стварыць кс. Гадлеўскі, не дазваляла канцэнтраваць невялікія людзкія і матэрыяльныя рэсурсы для арганізацыі сталага выдавецтва. Наступная спроба выправіць гэтую сытуацыю была зробленая Усеваладам Родзькам і Міколам Абрамчыкам увосень 1943 г., але перашкодзіў арышт апошняга немцамі.
У гэтай кніжцы “БР” мы перадрукоўваем першыя два нумары “Бюлетэню БНП”, як найбольш малавядомыя на Бацькаўшчыне.
Сяргей Ёрш

БЮЛЕТЭНЬ
БЕЛАРУСКАЙ НЕЗАЛЕЖНІЦКАЙ ПАРТЫІ
Орган вызвольнага Сялянска-Работніцкага Руху.
№ 1
Б Е Л А Р У С Ы!

Дзесяткі год мы ўглядаемся на трагэдыю Нашага Народу, на безасноўныя гульні лёсу з мільёнамі нашых братоў, на акружаючы нас зьдзек, палітычны прыгон, на няспынную акупацыю Нашае Бацькаўшчыны чужынцамі.
Усе спробы змаганьня з гэтакім станам былі крывава спыненыя нашымі ворагамі, але кроў "тысячных ахвяраў" замацавала гартоўнымі вязамі народную волю — волю свабоды. Сяньня навучаныя гісторыяй і прыкладамі гэтыхахвяр, мы павінны згуртаваць гэтакую народную сілу, якая споўніла б жаданьне народу быць вольным.
Годзі прыгону і зьдзеку. Годзі акупацыі і чужацкай "апекі". У народзе хапае сілы, якая перартрывала стагодзьдзі няволі і варожага гнёту — яе толькі трэба падняць, зарганізаваць і павесьці. І мы паднімем яе.
Беларуская Незалежніцкая Партыя паднімае зноў сьцяг барацьбы за Незалежнасьць Беларусі. Сьцяг вялікай ідэі працоўных сялянскіх, работніцкіх і інтэлігэнцкіх масаў Беларусі. Ідэі задзіночаньня ўсіх актыўных, перадавых сілаў нашае зямлі ў адзіны фронт барацьбы за волю і славу народу.
Нашая ідэя — гэта рэзультат традыцыі вызвольнага змаганьня Беларускага Народу, агромністай працы Беларускай Сацыялістычнай Грамады, бязьмежнай ахвярнасьці соцыял-рэволюцыянэраў, адчайнае барацьбы ноцдэмаў зчырвонымі палачамі, магутнае волі масаў з радоў Беларускае Сялянска-Работніцкае Грамады, нясучых ахвяры ў барацьбе з польскім тэрорам.
Беларусы Актывісты!
Мы трымаем сьцяг змаганьня за сувэрэннасьць Беларускага Народу іягоДзяржавы, за правы на творчае незалежнае жыцьцё беларускіх працоўных масаў, за правы вольнага карыстаньня прадуктамі свае працы, за разбудову гістарычнае славы нашай Бацькаўшчыны. Мы ідзём на бой з усялякім паняволеньнем нашага народу, мы падаём руку ўсім народам, якія змагаюцца за сваю свабоду і якія разумеючы нашае няшчасьце пойдуць супольна з намі ў бой.
Мы клічам у нашыя рады!
Хто дужы і чэсны той з намі, хто слабы той адпадзе.
Мы нікога хочучага працаваць для нацыі не адкідаем з узгляду на яго пераконаньні, бо мы баронім надпартыйнасьці, мы будзем супрацоўнічаць з кожным чэсным барацьбітом за аднолькавыя ідэалы, ці з ідэйнаю арганізацыяю, але будзем заўсёды змагацца і нішчыць усялякія спробы пасягненьняў насувэрэннасьць Беларускае Дзяржавы і шкодніцкую прывату сярод беларускага грамадзянства.
Беларусы Актывісты! Клічам Вас прыступіць да будаўніцтва народнае будучыні ў цяжкае працы, у ахвярным змаганьні з поўным самавырачэньнем. Пад нацыянальным сьцягам нашае арганізацыі пойдзем на барацьбу за долю Беларусі. Пойдзем па вялікую перамогу!
Цэнтральны Камітэт Б. Н. П.

АСНАЎНАЯ ІДАЛЯГІЧНАЯ ПРАГРАМА
БЕЛАРУСКАЙ НЕЗАЛЕЖНІЦКАЙ ПАРТЫІ,
апрацованая на аснове пастановы першага зьезду Б. Н. П.

Сёньнешняе палажэньне і агульны ход падзеяў вымагае ад Беларускага Народу неадкладнага гуртаваньня ўсіх народных сілаў і іх рашучага дзееньня. Акт 25 сакавіка 1918 году,

выявіўшы найвышэйшую ідэю нашае нацыі і ідэю незалежнага жыцьця, павінен у рэзультаце сучасных падзеяў стацца рэчаістасьцяй, павінен прыняць жыцьцёвыя формы. Сёньня Беларусь павінна мець волю і сілу стацца незалежнай дзяржавай, а гэтую волю і сілу дасьць ёй арганізаваны, здысцыплінаваны, сьведамы і ахвярны народ.
Беларуская Незалежніцкая Партыя бярэ на сябе абавязак арганізацыі народнае сілы і змаганьня за незалежнасьць нашае Бацькаўшчыны і заклікаеўсіх Беларусаў споўніць свой чэсны абавязак перад Народам і прыняць удзел у барацьбе за яго свабоду і правы.
Здабыцьцё незалежнай дзяржаўнасьці дарогай збройнага змаганьня зьяўляецца першым этапам нашых імкненьняў, другім будзе арганізацыя грамадзкага і палітычнага жыцьця дзяржавы згодна імкненьняў, псыхікі, патрэбаў і жыцьцёвых умоваў Беларускага Народу.
Прынцыпамі вытварыўшымі ідэалогію Б.Н.П. зьяўляецца наступная праграма:
1/ Мы змагаемся за незалежную, сувэрэнную беларускую дзяржаву ў этнаграфічных межах Беларусі.
2/ Мы прызнаём, што найвышэйшым аўторытэтам і сілаю Беларускае Дзяржавы зьяўляецца зарганізованая і здысцыплінованая Беларуская Нацыя. Мы змагаемся за нацыянальную, аўтарытатыўную Беларуску[ю] Рэспубліку. Мы проціў парлямэнтарнага дэмакратызму, які дзеліць і аслабляе сілы нацыі.
Мы проціў дыктатуры некаторых слаёў, ці палітычных групіровак у народзе.
3/ Мы прызнаём, што толькі адзіная палітычная партыя, зложаная з найлепшага нацыянальнага элемэнту і кіраваная разумным павадыром, зьяўляеццаасновай сілы Народу і Дзяржавы.
Мы імкнёмся згуртаваць у радох Б.Н.П. увесь сьведамы беларускі актыў, які стаўся б годным носьбітам дзяржаўнага аўтарытэту Беларускае Рэспублікі.
4/ Мы прызнаём, што прыналежнасьць да партыі ў першую чаргу ўзьвялічваеадказнасьць і абавязкі, а не правы.
Што праца партыі павінна быць творчай, пазытыўнай і мець за аснаўную мэту дабро свае Нацыі.
Мы змагаемся ў сваёй ідэалогіі за творчы, пазытыўны, беларускі нацыяналізм, якога найв[ы]шэйшай мэтай зьяўляецца дабро свае Нацыі.
5/ Мы прызнаём права ўдзелу ў палітычным жыцьці Беларускай Рэспублікі выключна за Беларускім Народам.
Прызнаём за іншымі нацыянальнасьцямі правы на існаваньне і свабоднае жыцьцё ў выпадку іх лёяльных адносінаў да беларускага народу і Дзяржавы..
Мы проціў усіх народаў пасягаючых на сувэрэннасьць і тэрыторыяльнуюцэласьць Беларускае Рэспублікі.
Мы за сувязь і прыязьнь з народамі і дзяржавамі, зь якімі лучыць Беларускі народ супольнасьць палітычных і гаспадарчых інтэрэсаў.
6/ Мы прызнаём, што асновай дабра нацыі павінна быць поўная соцыяльная справядлівасьць, абапёртая на прынцыпе салідарызму ўсіх працоўных.
Мы змагаемся за ўвядзеньне агульнага абавязку працы,
за забясьпячэньне магчымасьці працы ўсім працоўным,
за дзяржаўнае забясьпячэньне дастатковае платы работнікам,
за забясьпячэньне жыцьця і здароўя працоўным,
за апеку над працаю жанчын і моладзі,
за дзяржаўную арганізацыю прафэсыянальных хаўрусаў,
за васьмігадзінны дзень працы,
за дзяржаўную апеку над няздольнымі да працы: інвалідамі, калекамі, старцамі.
Мы проціў клясавай барацьбы аслабляючай сілу Нацыі,
проціў нажывы адзінак бяз працы.
7/ Мы прызнаём у гаспадарскім жыцьці абмяжованую прыватную ўласнасьць,

прызнаём дзяржаўнай ўласнасьцяй усе натуральныя багацьці Краіны, лясныя масывы, воды і вялікія прадпрыемствы.
Прызнаём, што асновай зямельнае гаспадаркі зьяўляецца моцная непадзельная аднаасобная гаспадарка.
Мы прызнаём уласнасьцю адзінкі ўсё, што яна здабыла сваёю фізычнаю, ці духоваю працаю і прызнаём яе правы гэтым распараджацца з карысьцяй для нацыі.
Мы змагаемся за разбудову прыватнага дробнага промыслу і рамясла, за стварэньне моцнага г. зв. “сярэдняга стану” рамесьнікаў і гандляроў.
за дапаўненьне бяз выкупу дробных зямельных гаспадарак з падзелу абшарніцкіх, калгасных, асадніцкіх і грамадзка-абшчынных земляў.
за разьвіцьцё ўсіх галін зямельнай гаспадаркі.
за падняцьце культурнага і матэрыяльнага ўзроўню беларускага сялянства.
за цесную сувязь між беларускім сялянствам, работніцтвам і інтэлігэнцыяй.
Мы проці падзелу зямельных гаспадарак дарогай продажу, спадчыннага падзелу, дараваньня.
проціў задоўжаньня зямельных гаспадарак.
8/ Мы змагаемся за разьвіцьцё духовай і фізычнай культуры народу,
за разьвіцьцё ніжэйшага, сярэдняга і вышэйшага нацыянальнага школьніцтва,
за ўзорную разбудову прафэсыянальнага школьніцтва.
за абавязковае і бясплатнае навучаньне моладзі ад 7 да 14 гадоў,
за поўнае вывучэньне выбітна здольных дзяцей на дзяржаўныя сродкі,
за дзяржаўны кантроль прэсы і выдавецтва.
за дзяржаўную апеку над сям’ёй.
за дзяржаўную апеку над маткай і дзіцём.
9/ Мы прызнаём, што рэлігійнае жыцьцё павінна быць аддзеленае ад дзяржаўнага і зьяўляецца прыватнай справай кожнага грамадзяніна,
што навука рэлігіі ў школах павінна праводзіцца толькі на жаданьне бацькоў.
Мы прызнаем поўную свабоду кожнай рэлігіі, паколькі яна не зьяўляеццашкоднай для Народу.
10/ Мы прызнаём дабро нацыі перад дабром адзінкі,
прызнаем права грамадзян на апеку з боку дзяржавы.
Мы за роўныя правы і абавязкі ўсіх грамадзян.
за поўныя палітычныя, грамадзкія і эканамічныя правы ўсіх грамадзян,
за агульны абавязак творчай, фізычнай або духовай працы.
за агульны абавязак ахвярнасьці з маёмасьці і жыцьця для Народу і Дзяржавы.
11/ Мы за арганізацыю валасных і раённых самаўрадаў камунальных,
за стварэньне Б е л а р у с к а й  Н а ц ы я н а л ь н а й агульнаабавязковай Арміі.
за ўвядзеньне адзінага дзяржаўнага налогу з маёмасьці, абароту і даходу.
за ўласную валюту, абапертую на маёмасьці і прадукцыі Дзяржавы,
Мы проціў увядзеньня дзяржаўных налогаў натураю ў зямельнай гаспадарцы.

*******************************************************

Б Е Л А Р У С Ы

п а ш ы р а й ц е  і д э і  Б.Н.П.

у с ь в е д а м л я й ц е  Н а р о д.

р ы х т у й ц е с я  д а  б а р а ц ь б ы.

*******************************************************

Ч э с ь ц ь  п а м я ц і  з м а г а р о ў !

Дня 20 ліпеня мінулага году зьгінуў падступна замардаваны рукою бальшавіцкіх бандытаў ПЁТРА РАНДАРЭВІЧ, малады барацьбіт за Незалежную Беларусь.
У сьнежні мінулага году быў расстраляны Немцамі сябра ЎЛАДЗІМІР ЛУБЧОНАК за сьмелае выступленьне ў абароне беларускіх правоў перад бесправем акупантаў.

**********************************************************

Рэдагуе Цэнтральнае Бюро Б.Н.П.
Друкуецца паводле асобніка, які захоўваецца ў фондах Расейскага дзяржаўнага архіву сацыяльна-палітычнай гісторыі ў Маскве (РДАСПГ, ф.17, в.125, спр..251, арк.119-120 адв.).

Пільнуй, каб не папала ў рукі ворага
БЮЛЕТЭНЬ
БЕЛАРУСКАЙ НЕЗАЛЕЖНІЦКАЙ ПАРТЫІ
Орган Вызвольнага Сялянска-Работніцкага Руху.
№ 2

З Ь М Е С Т:

1.АПОШНІЯ ГАДЫ — аб сытуацыі на Беларусі сёньня.
2.МЫ НЕ ПАМРОМ — верш.
3.ДА МОЛАДЗІ.
4.ПАРТЫЗАНЫ! — заклік беларускага партызана.
5.МАЛАДАЯ БЕЛАРУСЬ — марш беларускіх партызанаў.
6.ЗЯМЕЛЬНАЕ ПЫТАНЬНЕ НА БЕЛАРУСІ.
7.НАШАЕ СУМЕЖЖА — весткі.
8.ВЕСТКІ З КРАЮ.
9.З УСЯГО СЬВЕТУ — весткі.
10.АГЛЯД ВАЕННАЙ СЫТУАЦЫІ.

І Н С Т Р У К Ц Ы Я
аб карыстаньні і перахоўваньні “Бюлетэню”.

1. Пільнуй, каб не папаў “Бюлетэнь” у рукі ворага.
2. Ніколі не пакідай у няпэўным месцы.
3. Як найменей насі пры сабе.
4. Прачытай сам, дай прачытаць свайму добраму знаёмаму — сьведамаму беларусу, каторы ня здрадзіць і забяры назад.
5. Матар’ял выкарыстоўвай у гутарках з сябрамі, але будзь пры гэтым асьцярожны.
6. Перадавай іншым толькі ў “чатэры вочы”, бяз прысутнасьці каго-небудзь трэцяга.
7. Аб загінуўшым экзэмпляры дакладай якнайхутчэй таму, ад каго атрымаў.

********

З Прысягі беларускага нацыяналіста:
“ЗДАБУДУ БЕЛАРУСКУЮ ДЗЯРЖАВУ — АЛЬБО ЗГІНУ Ў БАРАДЗЬБЕ ЗА ЯЕ”

З усяго сьвету.
Беларусы ў Амэрыцы.

З мамэнту ўступленьня Злуч. Гасп. Паўн. Амэрыкі да вайны і беларусы там пражываючыя паднялі дзейнасьць сваіх арганізацыяў. У межах свае палітычнай акцыі Беларускі Камітэт у ЗГПА высунуў перад паўночна-амэрыканскімурадам дам[а]ганьні выдзеліць мабілізаваных беларусаў у асобыя аддзелы.Гэтая прапанова моцна неспадабалася бальшавікам.

Польскія мроі аб “вуніі”.
Апошнім часам палякі на эміграцыі голасна загаварылі аб магчымасьцях “вуніі” з Беларусьсю на ўзор польска-чэхаславацкай. Што-ж — бяда прыціснула, дык паважаныя панкі і з “хамамі” гаварыць захацелі. Нажаль добра ўжо прыелася беларусам адна “вунія” з Польшчаю — абыдземся ўжо неяк і бязіхняй “апекі”.

Палонныя б е л а р у с ы.
Адносна афіцыяльных падлікаў у Нямеччыне знаходзіцца цяпер каля 50000 палонных беларусаў з польскай арміі і прыблізна ўдвая болей з савецкай. Адначасова вельмі шмат беларусаў з нямецкага палону служыць сёньня “дабраахвотнікамі” пры нямецкіх вайсковых частках, альбо ў розных “украінскіх” ці “казацкіх” аддзелах.

Рэвольта ў Румыніі.
Цераз Румынію перайшла хваля разрухаў, выкліканых падзеямі на фронцеі стратамі румынскай арміі. Пры ліквідацыі разрухаў удзел прымалі нямецкія дывізыі “СС”.

*******

П А Ш Ы Р А Й Ц Е І Д Э І Б Н П!

У С Ь В Е Д А М Л Я Й Ц Е Н А Р О Д!

Р Ы Х Т У Й Ц Е С Я Д А Б А Р А Д З Ь Б Ы!

.........................................................................................................................
Рэдагуе Цэнтральнае Бюро БНП
..........................................................................................................................

А П О Ш Н І Я Г А Д Ы
1939 год на Беларусі быў поўны тайнага чаканьня некіх вялікіх пераменаў, некай рашучай разьвязкі напружанага соцыяльнага і палітычнага жыцьця абапал польска-савецкай мяжы.
У Заходняй Беларусі польская акупацыя прыбірала што раз вастрэйшыя формы, сьпіхаючы беларусаў маною і тэрорам на самы ніз соцыяльнай і культурнай драбіны і выразна імкнучыся затапіць беларускую праблему хваляюасадніцтва, абшарніцтва і рознай “стшэльцкай” ці “КОП-аўскай” ваеншчыны. Гэта кінуло ўжо раней пазбаўлены сваіх павадыроў народ у капцюры бальшавіцкай прапаганды, альбо зацятай пасыўнасьці, будзячы адначасова глыбокую, заядлую ненавісьць да акупанта.
У гэтым самым часе БССР не магла яшчэ апомніцца ад жахаў 1937 году, калі рэшткі беларускае інтэлігэнцыі апынуліся ў камэрах НКВД сярод дзесяткаў тысячаў падобных сабе з усяго СССР. Выкарыстаны да апошніх межаў народ, аддаўшы ўсю маёмасьць і ўсе сілы на ўзбраеньне 10-мільённай арміі, баяўся думаць аб якіх небудзь зьменах, але падсьведама чакаў іх як збаўленьня.
Зьмены прыйшлі. Заходнюю Беларусь “вызвалілі” бальшавікі ад “белапольскага іга”, а інсцэніраванай на хуткую руку камэдыяй народнага плебісцыту далучылі яе да СССР. Аднак

за “вызваленьне” прыйшлося дарага плаціць — спачатку эканамічна, бо галодныя “вызваліцелі” з нечаканай хуткасьцю выелі і выкупілі ўсе “предразсудочные блага гнілого капіталістіческого запада”, а, пазьней жывою народнаю сілаю — тысячамі вывезеных, арыштованых, загінуўшых на фінскім фронце. Усходняя Беларусь крыху свабаднейдыхнула, пакольні апека НКВД сканцэнтравалася на нова занятых абшарах.
Вайну 1941 году народ спаткаў са страхам і радасьцяй адначасова. Аднак калі прайшла першая хваля зьнішчэньня, страх мінуў і народ радасна кінуўсяда супрацоўніцтва з новым “вызваліцелям”. Паверыўшы абяцаньням нямецкай прапаганды ўвесь актыў чэсна прыступіў да “адбудовы бацькаўшчыны”.
Прыйшлі першыя разчараваньні. Немцы 41 году ня былі немцамі 17 году — не адзначаліся ня толькі гуманнасьцю, але нават мінімальнаю дозаю здаровага палітычнага розуму. Пьяныя перамогамі папярэдніх гадоў і хворыя маніяй сваё надчалавечнасьці, упоенай недарэчнасьцямі расавай тэорыі — разглядалі прасторы ўсходня-славянскіх народаў як новаздабыты каляньяльны абшар. Аўтарам гэтае думкі быў партыйны ідэолёг — Розэнбэрг, тэорыі каторага можа нават часам і гэніяльныя на першы пагляд у практыцы аказваліся бязглуздымі і нерэальнымі.
Беларусь апынулася ў асяродзьдзі ўсходнекаляніяльнай нямецкай палітыкі. На месца праўна існуючай беларускай дзяржавы — БССР твораць нейкую дзяржаўную пародыю: “Генэральны камісарыят Беларусі”, каторы нават незьяўляецца самастойнай адміністрацыйнай адзінкай, бо ўваходзіць у склад “Усходняга краю — “Остлянду”. Пачынаюць у новаздабытай каленіі сваю працу нямецкія псэўда-палітыкі.. Пад акампаньямэнт казкі аб новай Эўропе і яе “штурмовым батальёне — Беларусі” пачынаецца паступовая эксплёатацыя беларускіх белых нэграў. Ідучы за славамі Кубэ, што “беларусы — народ мужыкоў”, адзін зь яго памочнікаў — поўпаляк, поўчэх — Сіваца заяўляе, што асьвета мужыкам не патрэбная — хопіць пачатковых чатырохгодак, у рэдкіх выпадках сямігодак, а далей хай вучацца рабіць боты альбо стругаць дзерава — рамесьнікі немцам патрэбныя. Аб сярэднім і вышэйшым школьніцтве няма і гутаркі.
Але затое калгасы зьмяняюцца ў “абшчыны” і польскіх абшарнікаў не дапускаецца на Беларусь. Цікавасьць якая ў гэтым розьніца — хіба тая, што з калгасу браў бальшавік, а з абшчыны немец і што на месца польскага пана сядзіць грубы нямецкі мужык з польскім лісьлівым поўпанкам за памочніка.
Мужыку можна ня толькі адмяраць 10 ці 20 палак як кару, але і не афіцыяльна лупіць пры кожнай нагодзе нагайкаю ці то ў вёсцы, ці нават калі ён служыць у самаахове ці “ахране”. Трэба нямецкаму мужыку парабкаў — праводзіцца “дабравольны набор” пры помачы жандармаў і паліцыі і едуць у Нямеччыну эшалоны “дабравольцаў” працаваць за 30 фэнігаў у дзень. Адначасова нямецкія ўрадаўцы і каляністы за дзесяткі тысячаў рублёў наладжваюць разкошныя памешканьні, праядаюць па меншай меры 10% пастаўленых для арміі прадуктаў, пьюць і бавяцца. Штоздабыў сваёю крывёю і сваім жыцьцём нямецкі салдат — тое нішчыць дурною палітыкай банда апранутых у жоўты мундзір чыноўнікаў — недарма названая беларускім селянінам “жоўтай заразай”.
Нажаль у гэтакім палітычным разладзе апынулася і беларускае грамадзянства. Частка кар’ерыстаў і амбіцыянэраў верачы ў нямецкую перамогу няможа адарвацца ад нямецкага бота. З пародыяй павадыра — умеючага толькі публічна біць брава і складаць голд сваім панам — Ермачэнкай на чале забаўляюцца ў народнае прадстаўніцтва альбо спэкулююць грамадзкай справай. Ім на забаву кінулі немцы БНС — калі ж арганізацыя гэтая выказала па акругах нечаканы ўздым — агранічылі яе правы.
Ім і часцы інтэлігэнцыі заінсцэніраваў благі палітык Юрда тварэньне беларускай праваслаўнай аўтакефальнай царквы: царквы са зьняволеным уманастыры мітрапалітам і некананічным саборам. Адначасова каталіцкіхбеларускіх сьвятароў разстрэльваюць альбо вывозяць, пакідаючы часткународу на ахвяру польскай ксяндзоўшчыны.

Другая частка грамадзянства, пераважна моладзь з радоў ахраны і паліцыі, ідучы ў сьляды сваіх “апекуноў” занялася пьянствам і грабяжом, настройваючы гэтым самым народ варожа да сябе. Трэба аднак памятаць, што толькі немцы здольныя падтрымоўваць падобнае сваявольле сярод службы парадку — у беларускай дзяржаве было-б яно найгоршаю ганьбаю і каралася-б як бандытызм.
Нялюдзкае абыходжаньне з палоннымі на пачатку вайны было аснаўною прычынаю паўстаньня партызаншчыны, а пазьнейшыя аблавы дзеля здабыцьця рабочай сілы ці ліквідацыі “камуністычнага актыву” колькасьць партызанаў усё зьвялічвалі, выганяючы ў лес тысячы нашае моладзі.
Гэтая моладзь, ідучы часта за фальшывымі бальшавіцкімі лёзунгамі, безадказна нішчыла свой-жа ўласны актыў нібыта супрацоўнічаючы з немцамі не разумеючы, што ў гэтакі спасаб ідзе толькі ўсім нашым ворагам на руку —аслабляючы сілы народу. Нямецкія ліквідацыйныя акцыі супроць партызанаў, праводжаныя пры помачы літвіноў, украінцаў, казакаў, латышоў ці наватсамых беларусаў агранічваліся пераважна да паленьня вёсак і разстрэлаў цывільнага жыхарства.
І гэтае вынішчэньне ня выклікало ніводнага пратэсту з боку “прадстаўнікоў народу” ў Менску — наадварот, розныя Казлоўскія з “Беларускай Газэты” хвалілі яго пад нямецкую дыктоўку. І калі народ сам захацеў справу вырашыць радасна вітаючы вестку аб стварэньні самааховы, дык немцы падразьніўшыся ашукалі народ, а нашыя дзеячы падпісаўшыя “гарачую” адозву данароду не здабыліся нават на найменшы пратэст супраць нямецкага ашуканства.
Бязумоўна, што ў гэтакіх абставінах аснаўная маса народу пахіснуласяў сваёй веры ў будучыню Беларусі. Пачалі вяртацца розныя сымпатыі да таго ці іншага з нашых даўных “апекуноў”. Адным заімпанавала казка аб арміiСікорскага і Польшчы “од можа до можа”, другія пачалі дароўваць усе віныі праступкі савецкаму НКВД, трэція паверылі ў нямецкую казку аб павароце царскіх залатых пагонаў.
Што казаць — нават партызаны з пад знаку чырвонае зьвязды паверылі ў нямецкі прапагандовы “трук” і пачалі прапаганду на карысьць “русской народной арміі”, увялі ў сябе афіцэрскае “благородіе” і пачалі купляць у насельніцтва заплесьнеўшыя царскія эпалеты.
Нажаль усё гэта казкаю панаГэббэльса толькі і застанецца, а чырвоны сьцяг будзе і далей крывава панаваць над савецкай рэчаістасьцяй.
І адзіная можа толькі моладзь не вярнулася лёгкаверна ў службу нашых даўных, як-жа нешчасьлівых для народу “-фільстваў”, трымаючы стойка фронтсупраць польскай, бальшавіцкай ці расейскай прапагандзе і чакаючы баявога кліча — за Незалежную Беларусь.
Ад гэтага палітычнага хаосу ў народзе мы мусім сёньня вызваліцца.
Ня будзем гаварыць аб нашых адносінах да немцаў, бо іх дыктуе кожнаму нацыянальнае пачуцьцё і нацыянальная гордасьць. Сёньня перад намі заданьне важнейшае — адзіночыць народ, не даваць яму разваліцца і зброіць маральна і фізычна на змаганьне, каторае надыходзіць.
Нам даволі вызваліцеляў і апекунства, нам ня трэба нацыянальнай ласкіад чужынцаў — мы самы здабудзем сабе нацыянальные правы.
А каб іх здабыць мусім зарганізавацца.
Мы ня маем права прымаць удзелу ў самазьнішчэньні альбо дапусьціць даяго, да барадзьбы беларуса-партызана з беларусам-валасным старшынёй, беларуса-паліцыянта з беларусам-партызанам. Сёньня мы ўсе беларусы зпад аднаго бела-чырвона-белага сьцягу, злучаныя адною ідэяю барадзьбы за незалежную Бацькаўшчыну, а кожная стрэльба ў беларускіх руках — гэта адзін козыр болей у вырашаючым розыгрышу.
А гэты розыгрыш ужо блізка. Нашыя ворагі змагаюцца між сабою і слабеюць з кожным днём — мы, гуртуючы свае сілы, мацнеем. Ні Нямеччына ні бальшавікі ўжо ня будуць у сілах вырашыць аб нашай будучыні — аб гэтым вырашыць сам узброены, зарганізаваны

народ. Аб гэтым павінен ведаць кожны і паліцыянт і партызан і кожны цывільны жыхар — здольны трымаць стрэльбу у руках.
Надыходзіць апошняе змаганьне, каторае вырашыць нашым і наступных пакаленьняў Беларусі. Мы спаткаем яго ў шчыльных радах, з паднятаю галавою, моцныя воляю перамогі — бо толькі моцныя могуць існаваць.
- с. [Вінцэнт Гадлеўскі]

***

Мы не памром, хоць шмат магілаў
На шляху нашым — на барознах:
Народ устае з магутнай сілай
Непераможны
горды
грозны…

********

У радах БНП мы марш пачнём па
НЕЗАЛЕЖНУЮ БЕЛАРУСЬ

********

ДА МОЛАДЗІ.
Дык наперад, покі сэрца
Рвецца, б'ецца на прастор,
Годзе млеці ў паняверцы!
Гэй да сонца! гэй да зор!

Мы паднялі сьцяг змаганьня за Незалежную Беларусь!
Прысягаем, што не апусьцім яго пакуль не асягнем нашай сьвятой мэты, гатовыя аддаць апошнюю кроплю крыві ў ахвяры Бацькаўшчыне!
Хто-ж падняў гэты сьцяг?
Хто горда і сьмела нясе яго сярод бураў і віхру?
Хто ператрывае на варце да апошняе перамогі?
Ты моцная і здаровая сялянская моладзь! Вы маладыя сэрцам, душою і целам!
Гэтымі першымі змагарамі за незалежніцкую ідэю былі можа ўжо старыя векам, але таксама з маладою душою грамадоўцы, ср-ы, нац-дэмы і інш.
І сёньня мы маладыя беларускія актывісты пераймаем ад іх гэты сьцяг-сымбаль векавога змаганьня за волю і прыракаем узьняць яго высока і павесьці за ім увесь Беларускі Народ да сьветлай будучыні, да волі і свабоды, дзе ня будзе больш ані польскай Бярэзы, ані бальшавіцкага Сібіру, ані нямецкіх разстрэлаў і сьвісту нагаяк, разлягаючыхся пад іранічныя гукі няўдалай песьні аб "новай Эўропе".
Мы навучаныя жыцьцём ніколі больш не паверым, што нехта нам нешта дасьць.
Годзі чакаць "асвабаджэньня" ці то з боку бальшавікоў ад панскага іга, ці з боку немцаў ад бальшавіцкага, або зноў нейкага трэцяга ад сёньняшняй пошасьці!
Асвабаджэньне сабе т о л ь к і мы самы здабудзем! Купім яго сваёю гарачай крывіцкай крывёю! І гэтая кроў будзе нам парукай моцнай і непахіснай будыніны.

Сябры і сяброўкі! Надыйшоў час, калі вочы нашай Маці-Краіны скіраваліся на нас — Яе дзяцей! Ці-ж Яна нас на сваім целе па..тое [нечытэльна — С.Ё.], кабмы цяпер Яе зрадзілі, каб ашукалі Яе надзеі і заламалі Яе веру ў нас.
Не, Маці! Мы паўстанем на твой кліч і парвём цяжкія ланцугі, якія вякамі скоўвалі Цябе! Сялянская моладзь, гатуйся да барацьбы! Будзьце гатовы і вы, якія яшчэ сёньня спакойна сядзіце ў вёсках і вы лясныя змагары з пад бел-чырвона-белага знаку! Памятайце, што вы ўсе сыны аднае Маці-Беларусі! Не дайцеся-ж ізноў павясьці сябе на жыдоўска-бальшавіцкім павадку да згубы нашай і ўсяго нашага Народу!
Тварэце свае нацыянальныя партызанскія аддзелы, якіх заданьнем будзе не забіваць сваіх братоў сялян, а здабываць аружжа, школіць свае беларускія маладыя вайсковыя кадры і быць гатовым да рашучага бою з кожным нашым ворагам!
А хто нашы ворагі — напэўна запытаеце.
Вораг наш кожны, хто пасягае на нашу свабоду, на нашую незалежнасьць, нанашу зямлю, на наш хлеб, ня гледзячы на тое, ці то будзе паляк, ці бальшавік,і нямецкі каляніст!
Дык да вас, сялянская моладзь, да вас змагары з лесу звaрочваемся з клічам: Усе як адзін у рады Беларускай Незалежніцкай Партыі!
Усе пад бел-чырвона-белы сьцяг!
Усе на змаганьне за НЕЗАЛЕЖНУЮ БЕЛАРУСЬ!!!

.........................................................................................................................................
МОЛАДЗЬ — а в а н г а р д НАЦЫЯНАЛЬНАЙ РЭВАЛЮЦЫІ!
.........................................................................................................................................

П А Р Т Ы З А Н Ы.
Вы сёньня апынуліся ў лесе — адны па сваёй волі, другія прымушаныя тэрорам акупанта. Ужо больш года змагаецеся за захаваньне свайго жыцьця. Ці-ж толькі за сваё жыцьцё гэтак змагаецеся.
Н [нечытэльна — С.Ё.] на духу вас падтрымоўвае агульная ўсім партызанамідэя, якая дадае вам сілы да далейшага змаганьня. Нажаль ня ўсе пранятыя гэтай ідэяй. Некаторыя забыліся аб высокім званьні партызана і ганьбяць яго нізкімі, нягоднымі сапраўднага партызана паступкамі як грабяжы, забойства сваіх братоў сялян, зьдзекі над безабароннымі беларускімі дзецьмі і маткамі.
Шмат хто падшываецца пад вашае імя дзеля матэрыяльнае карысьці і дапушчаецца самых падлейшых разбояў і забойстваў. Такімі ў першую чаргу зьяўляюцца жыды, якім не шкада праліць кроў "гоя". Зьдзек жыдоў над сялянамі пераходзіць граніцы ўсялякага ўяўленьня. Толькі яны здольныя забіваць дзяцей, паліць жыўцом сялян, ці грабіць бядоту.
Дык вось першым вашым заданьнем ачысьціць свае рады ад падобнага элемэнту, бо такія бандыты паніжаюць вас у вачох народу і ён замест пашаны адчувае перад вамі страх, ненавісьць і жаданьне помсты. А вы павінны здабыцьдавер у народзе, павінны стаць яго апекунамі і абаронцамі, а асягнеце гэта толькі тагды, калі імя вашае ня будзе абцяжанае падобнымі ўчынкамі.
Пры гэтым мусіце памятаць за што вы змагаецеся, за што праліваеце сваюкроў. Вы ясна павінны ўяўляць сваю мэту, сваю ідэю. Мала таго — увесь народ павінен ведаць аб вашых імкненьнях.
Хіба-ж не па тое вы вырваліся зпад нямецкай кулі, з лагеру і павольнай сьмерці ў ім, каб трапіць зноў у крывавые лапы НКВД, а народ аддаць на новы зьдзек. Гэта ня ёсьць ідэя. Гэта было-б змаганьне за новага пана, за іншага ката. Вашай мэтай можа быць толькі вольнае жыцьцё!

Для вас — Рас[е]йцаў — жыцьцё у незалежнай і вольнай ад крывавага чырвонага тэрору і жыдоўска-камуністычнага панаваньня Расеі. Для нас — беларусаў — у Незалежнай Беларусі! На гэтай плошчы мы спаткаемся не як ворагі але як сыныаднае славянскае сям'і. Напэўна, дайшлі ўжо да вас чуткі аб зьменах у СССР. Ня верце ілжывай прапагандзе! Чырвоны тэрор астаўся такім, якім вы ўжо яго бачылі раней: тая самая партыя, тое самае НКВД, тая самая чырвоная армія, з тою толькі розьніцай, што палепшаў быт жыдоў, каторыя прыкрыўшыся вашымі расейскімі прозьвішчамі, сядзяць у тылах і пхаюць народ на крывавае змаганьне да апошняга расейскага салдата за лепшае жыдоўскае будучае.
Дык пастановім сабе цьвёрда: годзі змагацца за чужыя інтарэсы! годзі праліваць брацкую сялянскую кроў! ці будзе яна ў жылах паліцыянта, самаахоўца, бурмістра ці настаўніка — яны бязьвінныя.
Ідзеце ў сьляды нашых нацыянальных партызанскіх аддзелаў, каторыя пад бел-чырвона-белым сьцягам гуртуюць моладзь, абвучаюць яе — твораць нацыянальную армію. Задзіночым свае сілы не на братабойчую барадзьбу, але ачысьціўшы сваерады пойдзем да канчатковай перамогі ў недалёкім будучым!

Штурмавік 7-га Партызанскага
Зьвязу "Маладой Беларусі"

МАРШ БЕЛАРУСКІХ ПАРТЫЗАНАЎ

З крыві братоў і ахвяр барадзьбы
мы бралі моц і змаганьня парыў,
На памяць іх прысягалі здабыць
волю дзецям патоптаных ніў.

Дык сьцеражысь акупанцкая зграя!
За сьвіст нагаяк, за зьдзекі й прымус
помсты песьню табе засьпявае
Баёвы Зьвяз — "Маладая Беларусь".

І грамадой у неабсяжную шыр
пайшлі, дзе вольныя толькі жывуць.
Нас вясною вітаў небасхіл:
"Гэта йдзе Маладая Беларусь!"

Дык сьцеражысь і г.д.

Крыжам дзядоў з над забытых магіл
мы гонар стальлю штыхоў аддаём,
З іх поту ўзросшай, з гарачай крыві
Радзіме слаўнай свабоду нясём.

Дык сьцеражысь…
І на Краіны ахвярны аўтар
за незалежнасьць складаем свой лёс.
Даволі стогнаў, бяздольнасьці, мар —
Народу стрэльбаю вызначым лёс!

Дык сьцеражысь…

********

## ЗЯМЕЛЬНАЕ ПЫТАНЬНЕ НА БЕЛАРУСІ

Стоячы на шляху будаўніцтва свае будучыні павінны мы перадусім на першым пляне паставіць пытаньне зямельнай гаспадаркі на Беларусі. Па першае таму, што Беларусь зьяўляецца краінай земляробскай, а па другое — што асновай беларускасьці цераз стагодзьдзі цяжкай нядолі, быў не абшарнік-шляхціц прадаўшы сваю народную годнасьць за некаторыя карысьці праўнага ці матэрыяльнага характару — а быў і застаўся, паміма найцяжэйшых формаў дэнацыяналізацыі, беларускі селянін. З сялянскіх хат вырастала і вырастае нашая нацыянальна сьведамая баёвая інтэлігэнцыя. І таму ў нашай незалежнай бацькаўшчыне дабрабыт сяляніна павінен быць асновай народнага дабрабыту.
Пасьля першай сусьветнай вайны на парэзаным межамі целе Краіны далі сяляніну нашыя “апекуны” на захадзе пад шумным назовам “зямельнай рэформы” — дзікую хутарызацыю, без дапаўненьня малазямельных гаспадарак і без дапамогі на перабудову. Гэта, пры вялікай у той час дарагавізьне будаўлянага мат[э]р’ялу і фабрыкатаў і адносна нізкіх цэнаў сельска-гаспадарчых прадуктаў, дэзарганізавала на некалькі гадоў большыя гаспадаркі і амаль што зусім развальвало малыя.
Нязначная колькасьць прамысловых прадпрыемстваў, якія палякі лічылі за непатрэбныя на Беларусі, не магла адцягнуць лішнія рукі з дробных сельскіх гаспадарак, што змушала і так нежыцьцяздольныя хутары разьбівацьяшчэ больш шляхам сямейнага падзелу.
Дзякуючы высокай цане на зямлю і абядненьню сяляніна, рост сялянскіх гаспадарак быў затармазаваны на карысьць абшарнікаў-палякоў.
БНП проціў гэтакай абшарніцкай палітыкі, якая давяла да руіны і жабрацтва нашых сялян.
- - - - -
Савецкі экспэрымэнт з каляктыўнымі гаспадаркамі ва ўсходняй Беларусі — уведзены ў жыцьцё людзьмі, якія ўмелі можа выступаць на сходах і мітынгах, але зусім не разумелі зямельнай гаспадаркі — быў у асновах нязгодны з псыхікаю народу. Служыў ён толькі дзяржаўнай эксплёатацыі сялян, патрэбнай дзеля зьбіраньня фондаў на аплату замежнай прапаганды і на падрыхтоўку да каштоўнай сусьветнай вайны.
Самое праводжаньне калектывізацыі адбылося коштам дзесяткаў тысячаў вывожаных у жудасные абставіны “кулакоў”, пад шыльду каторых падцягвалася ўсіх сялян, якія не згаджаліся аддаваць дзяржаве “ізлішков хлеба” па той простай прычыне, што гэтых лішак ня мелі. Тые, каторые засталіся ў калгасах, мусілі часта абыходзіцца нават ня сотнямі, а дзясяткамі грамаў зярна за трудадзень.
Усе пазьнейшыя вывазы, арышты і ўсялякага роду наборы і вэрбоўкі працоўнай сілы з калгасаў дэзарганізавалі пляновасьць іх працы, дапоўняную зьнеахвочаньням сялян.
У рэзультаце 15-ці гадоў калектыўнай гаспадаркі ў Беларусі яе земляробская і жывёлагадоўчая прадукцыя зьменшылася да мінімум пры адначасовымабніжэньні жыцьцёвага ўзроўня і выдайнасьці працы сяляніна.
- - - - -
Усё гэта было ўчора, усё гэта мы перажылі — “апекуны” зьмяніліся — паглядзім-жа, што нам дае ў зямельным пытаньні наш сёньнешні “вызваліцель”.. Прыкрываючыся ваеннасьцяй часу, стараецца ён прамаўчаць справу будучыні зямельнага пытаньня і афіцыяльна, апрача ліквідацыі калгасаў і таго,што нас “чакае зямля”, ня рупіцца нічога сказаць. А тымчасам усё большыя ілепшыя землі не забыўся ён прыдбаць сабе.
А праграму яны маюць — аб якой ад часу да часу неасьцярожна выкажуцца,як прыкладам у канцы лістапада 1942 г. у Позэне дзяржаўны сакратар Васкэ міжіншым сказаў: “нямецкі

работнік, сялянін, жаўнер павінен ведаць, што кожны зь яго сыноў будзе мець магчымасьць стацца свабодным гаспадаром на ўласнай сялібе на ўсходзе. Хто захоча пасяліцца на ўсходзе, той не патрабуе мець ніякай маёмасьці, складаць якісь экзамін, а толькі мець здаровыя рукі, нямецкае сэрца і фаховую веду".
Ды аб гэтым яшчэ прасьцей гавораць нам нямецкія гаспадарчыя адзінкі на мясцох, бьючы палкамі нашага сяляніна.
Калі мы возьм[е]м ранейшыя абшарніцкія землі, саўгасы і гаспадаркі памардаваных немцамі пры ліквідацыі "партызанаў" сялян, дык гэта ўжо сёньнястворыць амаль 50% нашай зямлі і значыцца, згодна славам пана Васкэ, знойдзецца ў руках нашых "вызваліцеляў", а мы будзем як і цяпер іх парабкамі, босваіх рук ім ня хопіць гэту зямлю абрабіць.

Сяляне-беларусы — Вы павінны сёньня ўсё гэта ясна зразумець і масава ўліцца ў вызваленчы рух, каб быць падрыхтаванымі ў адпаведны момант хапіць за аружжа ў абароне свае зямлі.
На Беларусі мусіць панаваць іншы парадак. Абшарніцкая зямля павінна быць разьдзеленая між малазямельнымі беларускімі сялянамі, бяз выкупу— так, як гэтую зямлю сваім потам і крывёю ён вякамі паліваў.
На Беларусі асновай зямельнага пар[а]дку павінны быць самастойныя, індывідуальныя, поўназямельныя, непадзельныя гаспадаркі, бо толькі такія гаспадаркі, кіраваныя выключна самім гаспадаром, на куску зямлі дастатковым для яго сям'і, зьяўляюцца найбольш справядлівымі і найкарысьнейшымі. Ніякае калгаснае нявольніцтва і эксплёатацыя ня можа мець на Беларусі месца.
Дзяржаўная дапамога пры наладжваньні будынкаў і асушваньні зямлі з аднаго боку і каапэратыўнае разьвіцьцё прамысловасьці наагул, а малочнай і мясной у прыватнасьці, пазволіць нашым новым гаспадаркам падняць хутка зямельную культуру і выцягнуць з зямлі максімум карысьці, што створыць дабрабыт нашага запраўды вольнага сяляніна і ўзбагаціць дзяржаву.
Але за гэта трэба змагацца — і мы гэтае змаганьне паднімаем.
Сяляне — Беларусы! Далучайцеся да нашай ідэі! Рыхтуйцеся да барадзьбы!
Чакайце нашага заклiку — час барадзьбы ўжо блізкі!
А.К.

************************************************************
П Р А Ц О Ў Н А Е   С Я Л Я Н С Т В А —
Ф У Н Д А М Э Н Т   Н А Ш А Е   Б У Д У Ч Ы Н І !
************************************************************

НАШАЕ СУМЕЖЖА.
Украіна.
Пасьля жорсткага прасьледваньня немцамі ўкраінскага нацыянальнагаруху, пасьля хвалі арыштаў і разстрэлаў — увесь украінскі актыў перакінуўся на працу ў глыбокім падпольлі і на партызанскую акцыю.
Украінскія партызаны ня выступаюць нідзе без патрэбы, гуртуюць зброю,школяць вайсковыя кадры і рыхтуюць народ да разгрому кожнага ворага ў мамэнце яго слабасьці.
У агульным палітычным жыцьці дайшло да кансалідацыі ўсіх палітычныхгрупаў дзеля вядзеньня супольнай вызвольнай акцыі.

Польшча.

Да падобнай кансалідацыі дайшло і ў Польшчы — нажаль у ад’емным кірунку. Усе арганізацыі і палітычныя групіроўкі падпарадкаваліся дэлегатуры эміграцыйнага ўраду, вырашаючы голас у катором мае Сікорскі. Гэта роўназначнае з тым, што кіруючым дзейнікам сёньня зьяўляюцца там тыя-ж абшарнікі і афіцэршчына, каторых мы ужо вельмі добра на сваіх землях пазналі.
Ня гледзячы на навуку гэтае вайны і сёньняшнія нямецкія рэпрэсыі, выкліканыя часта бальшавіцкай правакацыяй — палякі ня хочуць зрачыся свайго сну аб “моцарствовосьці” і дзяржаве “од можа до можа”.

Саветы.
Вайну вядуць Саветы бязумоўна вылучна коштам народу. Перакінуўшы свае базы глыбока ў тылы — на Урал і ў Сібір, гуртуюць там дзесяткі міліёнаў насельніцтва, прымушаючы да неабмежаванай працы ў ваенным промысьле і сельскай гаспадарцы. Акцыі “дабравольных ахвяраў” прадуктамі і грашмі на збраеньне чырвонай арміі перавысілі ў шмат разоў перадваенныя пастаўкі і займы і выклікалі зразумелае вострае незадаваленьне насельніцтва. Калі гэтага незадаваленьня не маглі апанаваць розныя патрыятычныя лозунгі, а карныя аддзелы выказалі выразную неахвоту да якіхколечы рэпрэсыяў адносна насельніцтва, бальшавікі выбралі з фронту ўсіх жыдоў і патварылі зь іх гарнізоны ў тылах. Заданьнем гэтых гарнізонаў — у першую чаргу ўтрымаць парадак у краі, а побач з гэтым — абвучаць нованабраныя аддзелы.
Для жыдоў нядрэнны паратунак ад сьмерці ці калецтва на фронце, а пры гэтым гонар кіраўніцтва і панаваньня над расейскім народам.

Прыбалтыка.
Літва сёньня ужо амаль поўнасьцю аголеная з моладзі і інтэлігэнцыі. Засталіся толькі людзі неабходна патрэбныя ў адміністрацыі — рэшта мабілізуецца альбо на працу ў Нямеччыну, альбо ў рады разпыляных па Беларусі,Украіне і прыфрантовых абшарах батальёнах. Нават у сельскай гаспадарцыі промысьле заступаецца літвіноў навезянымі работнікамі.
Латвія зьмяняецца памалу ў нямецкую калёнію. Паступова вяртаюцца туды нямецкія абшарнікі, прыяжджаюць новыя каляністы і апаноўваюць край, творачы Нямеччыне высунутую базу для экспансіі на ўсход і на поўнач.

*******

## В Е С Т К І З К Р А Ю.

Беласточчына.
У Беласточчыне перажываюць беларусы сёньня вялікі крызіс — адорваныя ад корняў, зданыя поўнасьцю на ласку акупантаў. Цэлыя вёскі высяляюццаальбо паляцца і на месца нашых сялян прыходзяць нямецкія каляністы. Высяляныя ўцякаюць альбо ў Беласток, альбо за межы Беласточчыны. Сытуацыю выкарыстоўваюць палякі, стараючыся якнайбольш ліквідаваць беларусаў нямецкімі рукамі, дарогаю даносаў і правакацыяў.

“Ліквідацыя партызанаў” у Слонімшчыне.
Яшчэ у восень мінулага году пачалі немцы вялікую “акцыю ліквідацыйную” супраць партызанаў у слонімскай акрузе. У рэзультаце акцыі згарэла каля 20 вёсак і ў іх разстрэляна альбо жыўцом спаляна блізу 5000 цывільнага жыхарства. А акруговы камісар хвалючыся гэтым перасьцярагае насельніцтва.
Перад чым перасьцярагаеш? — Ты-ж меўся змагацца з партызанамі, а не зь дзяцьмі і жанчынамі.
І каго перасьцярагаеш? — Дзяцей?

Пачакай — акупант! Няхай гэтыя дзеці крыху вырастуць, да дзесятага пакаленьня будзеш тады каяцца за свой тэрор.
А сёньня па Слонімшчыне тырчаць апаленыя каміны і нямецкі каляніст чакае вясны, каб загараць цаліну.
Не дачакаецеся!..

За Бярэзінаю.
Яшчэ адна граніца: сёньня на гістарычнай Бярэзіне немцы разгарадзіліся між сабою — партыйцы ад вайсковых. Але для іх толькі гэтая мяжа і існуе.. Абапал рэчкі жывуць тыя самыя думкі ў народзе і родзяцца аднолькавыя вызвольныя імкненьні.
У вынішчаным бальшавіцкімі вывазамі і эксплаатацыяй народзе расьце ненавісьць да якойколечы акупацыі. Нямецкі бот, хаця і лягчэйшы чым у захадняй частцы Беларусі, абрыдзеў усяму жыхарству і сёньня моладзь мроіць аб сапраўднай волі — бяз бальшавікоў і бяз немцаў, і пачынае брацца за рэалізацыю гэтага.

*******

Н А Р О Д —
Р ы х т у й с я   с т а н у ц ь   у   р а д ы!*

Друкуецца паводле асобніка, які захоўваецца ў фондах Расейскага дзяржаўнага архіву сацыяльна-палітычнай гісторыі ў Маскве (РДАСПГ, ф.17, в.125, спр..251, арк.121-126адв.).

*Напісана ад рукі

KAMUNIKAT.org

**Матэрыялы да гісторыі Беларускай Краёвай Абароны**

Гісторыя стварэньня і дзейнасьці ў 1944 годзе Беларускай Краёвай Абароны (БКА) зьяўляецца адной з найменш распрацаваных тэмаў, якія датычаць удзелу беларусаў у Другой сусьвет-най вайне. У свой час савецкая прапагандапрык-лала нямала намаганьняў у справе фальсіфікацыі гісторыі БКА, бо цалкам замаўчаць адну з першых у XX стагодзьдзі спробаў арганізацыі рэгулярнай беларускай арміі было немагчыма. І сёньня афіцыйная навука ў Беларусі працягвае савецкія традыцыі. У беларускага чытача імкнуцца стварыцьуражаньне, што ўсе спробы арганізацыі БКА, ад самага пачатку, ня мелі посьпеху. Маўляў, людзей у батальёны заганялі пад пагрозай зброі і пры першай жа магчымасьці яны ўцякалі да партызанаў. Аўтары падобных сьцьверджаньняў, як правіла, не абцяжарвалі сябе пошукам фактаў, заплюшчваючы вочына існаваньне вялікай колькасьці архіўных дакумэнтаў, што сьведчаць паадваротнае.
У гэтым нумары “БР” друкуюцца матэрыялы Нацыянальнага архіву Рэспублікі Беларусь, якія датычаць дзейнасьці БКА. Натуральна, яны не даюць абсалютна поўнага ўяўленьня аб усёй Беларускай Краёвай Абароне, паколькі датычаць толькі асобных батальёнаў Менскай акругі, але дапамагаюць узнавіць аб’ектыўную карціну тых часоў.
Андрэй Блінец

Дакумэнт №1
СПРАВАЗДАЧА
аб правядзеньні паклікаваньня па Смалявіцкаму павету
Менскай акругі
За 1.4.44.
1. Агульная колькасьць падлягаючых да паклікаваньня 1726
2. Агульная колькасьць зьявіўшыхся на камісію 1212
3. Агульная колькасьць не зьявіўшыхся на камісію 514
4. Прынята афіцэраў 4
5. Прынята падафіцэраў 15

Зь ліку зьявіўшыхся
1. Залічаны ў войска 457
2. Звольнена як няздольных да службы ў войску 534
3. Звольнена часова па сямейнаму становішчу 74
4. Звольнена як працуючыя ў вайсковых аддзелах і ў другіх прадпрыемствах 119
5. Другой нацыянальнасьці* 28

Прычыны не зьявіўшыхся
1. З прычыны хваробы 8
2. Уцяклі ў бандыты 4
3. Не зьявіліся ў зьвязку паралізаванасьці мясцовасьцей бандытамі зьЮраўскай, Кляньніцкай, Верхменскай і часткова Забалоцкай і Варстоўскайволасьцей 502

Увага
Уцякло з батальёну з прынятых у жаўнеры 1

СТАРШЫНЯ ПАВЕТУ [подпіс неразборлівы]

ПАВЯТОВЫ АХВІЦЭР [подпіс неразборлівы]
НА РБ, ф.382, воп.1, спр.3, арк.217)
*Згодна з інструкцыяй аб правядзеньні мабілізацыі, ад вайсковай службы вызваляліся псыхічна нездаровыя, фізычна няздольныя, хворыя людзі, шматдзетныя бацькі, навучэнцы і настаўнікі сярэдніх школаў. Акрамя таго, у шэрагі БКА не маглі прымацца жаўнеры іншых

нацыянальнасьцяў: украінцы, палякі, расейцы. Кіраўнік Вялейскай акругі Язэп Малецкі ўспамінаў, што на Вялейшчыне палякаў, якія зьявіліся на прызыўныя ўчасткі, накіроўвалі ва ўжо існуючы польскі аддзел пад нямецкім камандаваньнем, які за кошт гэтага вырас з 35 да 60 чалавек (Малецкі Я. Пад знакам Пагоні. Таронта, 1976, б. 135).

Дакумэнт № 2
Распараджэньне ГК БКА ад 19.04.44. №120-МТ
Здараюцца выпадкі, калі аддзелы БКА уступаюць у бой з бандытамі ня будучы на гэта вымушаны выступаць у собскай абароне.*
Дзеля таго, што аддзелы БКА значна горай узброеныя ад бандытаў, то ў выніку няроўнага бою аддзелы БКА нясуць вялікія страты. У прынцыпе баявыя парывы стральцоў і камандзіраў трэба пахваляць, аднак, каб унікаць непатрэбных ахвяр, што ўрэшце падрывае веру ў аддзелаў БКА ў собскія сілы, у актыўнае змаганьне з бандытызмам пакуль што ўступаць не належыць.
Батальёны БКА перш за ўсё павінны адпаведна ўзброіцца, прайсьці курс ваеннай падрыхтоўкі і тады толькі можа быць мова аб актыўным змаганьні збандамі. На гэта трэба чакаць загадаў Галоўнага Кіраўніцтва БКА, якія будуць выдадзены ў адпаведным часе.
(НА РБ, ф.382, воп.1, спр.3, арк.626)
*У першы месяц свайго існаваньня аддзелы БКА яшчэ ня мелі дастатковa сілаў, каб перайсьці ў наступ на партызанаў, аднак некаторыя камандзіры, выкарыстоўваючы высокі баявы дух байцоў, спрабавалі рабіць наступальныярэйды. Тут і далей заўвагі аўтара публікацыі.

Дакумэнт № 3
НАЧАЛЬНІКУ Б.К.А. МЕНСКАЙ АКРУГІ
РАПАРТ
Справаздача з батальёна № 4 Б.К.А.*
а/ Прыбыў 1-н афіцэр з батальёна № 10.**
Прыбыло 2-а стральцы ў якіх кончыўся срок водпуска дадзенага прызыўнойкамісіяй.
Убыло 2-ое стральцоў, адзін па балезьні, адзін па сямейнаму стану.
б/ Вайсковай падрыхтове матэрыял праароблен сагласна плана ад Б.К.А. (округа)
в/ Падтрымка з боку Нямеччыны добрая.
г/ Ухіленьня ад дысцыпліны не было.
д/ Зброі і амуніцыі недастатковa.
е/ Дзейнасьць ворагавай прапаганды незамечана.
ж/ Узаемныя адносіны жаўнера з жыхарствам добрыя.
з/ Вопратка і абутак дрэнны, кватэры дрэнныя, афіцэрскі састаў разьмешчаны разам з жаўнерамі, але ў той-жа час цывільныя жыхары занімаюць 4-ы кватэры ў распалажэньні батальёна. Цывільныя жыхары находзясь у распалажэньні батальёна садзейнічаюць разглашэньню ваеннай тайны, па гэтаму цывільных жыхароў патрэбна выселіць. Там можна будзе разьмясьціць камсастаў, зброю і г.д.
КАМАНДЗІР БАТАЛЬЁНА [подпіс] /Каборда/
Пастыпіла 27.4.44.
(НА РБ, ф.382, воп.1, спр.3, арк.186)
*Батальён № 4 дыслякаваўся ў Менску ў Пушкінскіх казармах. Камандзір батальёну старшы лейтэнант Сяргей Кабарда. На пачатак красавіка батальённалічваў 676 чалавек. Зь іх: 19 афіцэраў, 52 падафіцэры, 605 стральцоў. Удзелу ў баявых дзеяньнях батальён не прымаў.
**10-ты батальён разьмяшчаўся ў м. Заслаўе Менскай акругі.

Дакумэнт № 4

Акруговаму начальніку БКА Менскай акругі
РАПАРТ.
Даводжу да ведама, што ў ноч на 28 красавіка 1944 года вызначаныя ў каравул па ахове горада Лагойска жаўнеры мелі сутычку з бандытамі, якія хацелі абрабаваць жыхароў акраіны горада, але былі адбітыя і адабраны дзве каровы і адзін конь, дзякуючы мужнасьці і адвагі жаўнераў, якіх бандыты абстрэльвалі і кідалі гранаты.
Мужнасьць і адвага заслугоўвае ўзнагароды ніжэйнаступных жаўнераў:
1. Владзецкі Вікенці А. каравульны начальнік
2. Мытнік Вікенці В. стралец
3. Гавель Мікалай В.
4. Сінкевіч Паўла В.
5. Каборда Зыгмунд В.
6. Каборда Вацлаў В.
7. Слонскі Міхаіл Я.
Павятовы афіцэр [подпіс неразборлівы]
Рэзалюцыя: З ліку 750 марак выдаць грашовую дапамогу і вынесьці падзяку. Пугачоў*.
9.5.44.
(НА РБ, ф.382, воп.1, спр.3, арк.165)
*Капітан Міхась Пугачоў, былы афіцэр Чырвонай Арміі. У другой палове 1941 г.— начальнік шыхтавой часткі Менскай паліцыі. З лютага 1944 г. зьяўляўся Менскім акруговым начальнікам БКА. 20 чэрвеня 1944 г. перадаў гэтую пасаду старшаму лейтэнанту Міколу Асіповічу, а сам вярнуўся на службу ў паліцыю. Пасьля адступленьня зь Беларусі апынуўся ў апазыцыі да прэзыдэнта БЦР Р. Астроўскага. Выступаў за супрацоўніцтва з уласаўскім Камітэтам вызваленьня народаў Расеі.

Дакумэнт №5
Штаб Батальёну
БКА № 29
10 мая 1944 г.
НАЧАЛЬНІКУ БЕЛАРУСКАЙ КРАЁВАЙ АБАРОНЫ
МЕНСКАЙ АКРУГІ

РАПАРТ.
Даношу да Вашага ведама, што ў батальён №29 прыбыло з распалажэньня Смалявіцкай воласьці 12 чалавек дабраахвотнікаў нараджэньня 1925-1926 гг., якія жадаюць служыць у шэрагах Беларускай Краёвай Абароны і залічаны ў наш батальён.*
З гэтых дабраахвотнікаў утворана дабраахвотніцкая дружына.
Адначасова паведамляем: што яшчэ многія жадаюць паступіць дабраахвотнікамі ў наш батальён. Прашу даць Ваша ўказаньне па гэтаму пытаньню.
КАМАНДЗІР БАТАЛЬЁНУ [подпіс неразборлівы]**
АД'ЮТАНТ [подпіс неразборлівы]
(НА РБ, ф.382, воп.1, спр.3, арк.219)
*Прызыву падлягалі мужчыны, якія нарадзіліся ў 1908-1917 і 1921-1924 гг.(выключэньне рабілася для ўраджэнцаў 1918, 1919 і 1920 гг.). Папаўненьне батальёна дабраахвотнікамі зь ліку моладзі – не адзінкавы выпадак. У чэрвені 1944 г. у Менскі батальён дабраахвотнікам быў залічаны Мікалай Раменаў, 1927 г.н. (НА РБ, ф.382, воп.1, спр..3, арк.714)
**29-ым Смалявіцкім батальёнам камандаваў былы афіцэр царскай арміі, фельдфебель кавалерыі Раман Шчокалаў.

Дакумэнт № 6

Штаб Батальёна №29
Беларускай
Краёвай Абароны
ў Смалявічах

НАЧАЛЬНІКУ БЕЛАРУСКАЙ КРАЁВАЙ
АБАРОНЫ, МЕНСКАЯ АКРУГА
9 чэрвеня 1944 г.
Рапарт.
Даводжу да вашага ведама, што згодна загаду жандармэрыі з батальёну напрацягу траўня і чэрвеня месяца па хадайніцтву мясцовых улад, дзеля аховы вёсак разьмешчаных вакол м. Смалявічы з батальёна назначалася каля 50 жаўнераў, для дапамогі ў правядзеньні веснавога пасеву ад нападу бандытаўпа захвату жывёлы партызанамі.
На працягу 5 дзён батальён даў сваю згоду мець сталую ахову дзеля падрыхтоўкі лесаматар'ялу і паліва на зіму, таксама даў згоду рабіць выездына ахову транспарту па дастаўцы матарыялу і паліва для в/частак і батальёну сумесна і пад кіраваньнем жандармэрыі і паліцыйнага аддзелу Смалявіцкага павету. За гэтыя дні аховы ніякіх выпадкаў не здаралася. 9.6.1944 года здарыўся выпадак засады бандытамі ў напрамку шасе ад Смалявіч 7 км., куды быў накіраваны транспарт дзеля дастаўкі лесаматар'ялу пад аховай паліцыйнага аддзелу (18 чалавек) і 38 асоб батальёну Б.К.А.
Паліцыйны аддзел і жаўнеры батальёну сустрэліся з засадай банд, дзе прайшла вялікая бойка ахоўнікаў з бандытамі.
У часе бойкі на працягу каля 2 гадзін, з боку жаўнераў нашага батальёну аказаліся цяжка паранеымі: Філіповіч Алесь М. і Філіповіч Мікалай, з якіхпа цяжкасьці параненьня памёр Філіповіч Мікалай. Лёгка паранеымі аказаліся Міхалевіч Мікола і Пекарскі Алесь, якія знаходзяцца на лячэньні ўбатальённай амбуляторыі.
Адзначаю, што мужнасьць з боку пасланых 36 асоб радавога складу і 2 падафіцэраў праяўлена не кепская.
Усе жаўнеры і ўсе падафіцэры змагаліся да апошняга набою. Ім у часе адправы на ахову было выдана па 18 патронаў.
Камандзер зьвязу Філіповіч Сяргей бачачы, што апошнія набоі вышлі ў жаўнераў, скамандаваў ісьці назад. У часе адступленьня бандыты пачалі свой наступ з крыкамі "ура" і падбеглі к жаўнеру, які адыходзіў апошні — Лушчык Мікола — дабраволец, якому бандыт крыкнуў "Здавайся фашыская сволач" і хацеў яго ўзяць жывым у палон, але жаўнер, бачачы што пагражае яму жыцьцём, ён меўшы апошні набой выстраліў: бандыт адбегся, а ён тым часам скрыўся падь укрыціе і застаўся ў жывых.
З боку афіцэраў, падафіцэраў і жаўнераў батальёну выражаю наступную думку: прасіць Галоўнае Кіраўніцтва БКА і БЦР, каб найхутчэй нас узброілілепшай зброяй і вопраткай і даць магчымасьць хучэйшага выезду для барацьбы з бандытызмам.
КАМАНДЗЕР БАТАЛЬЁНУ [подпіс неразборлівы]
(НА РБ, ф.382, воп.1, спр.3, арк.374)

Дакумэнт № 7
Батальён №33
Б. К. А.
Лагойскага павету
15.VI. 1944 года
№20
г. Лагойск
СПАДАРУ АКРУГОВАМУ НАЧАЛЬНІКУ Б. К. А.

МЕНСКАЙ АКРУГІ

Пасьля акцыі да нас у Батальён із тых мясцовасьцей дзе былі заняты партызанамі, прыходзяць людзі якіх гады падлягалі мабілізацыі, я ўстаноўкі аб прыёме не маю. А пагэтаму прашу Вас даць устаноўку як паступаць з такімілюдзьмі, якія не былі ўдзельнікамі з бандытамі, а зьявіцца ў прызыўную камісію не маглі так як іх не пускалі партызаны.
КАМАНДЗІР БАТАЛЬЁНУ [подпіс неразборлівы]*
Рэзалюцыя: Прымаць. 19.6. Пугачоў.**
(НА РБ, ф.382, воп.1, спр.3, арк.374)
*Камандзірам 33-га батальёну БКА зьяўляўся лейтэнант Іван Кактур.
**Паводле зьвестак А. Салаўёва, вясной 1944 г. Лагойскі батальён быў распушчаны пасьля таго, як зь яго шэрагаў да партызанаў перайшлі 69 жаўнераў (Соловьев А. Они действовали под разными псевдонимами. Менск, 1994, б. 120). Якім чынам неіснуючы батальён мог праводзіць наступальныя акцыі і прымаць да сябе дабраахвотнікаў, Салаўёў не тлумачыць.

KAMUNIKAT.org

**Дэпартацыя Аляксандра Калошы**

Прапануем увазе чытачоў урывак з дасьледаваньня чэскага гісторыка Пётры Чука “Выкраданьні людзей савецкім КГБ”, зьмешчаным у кнізе Urad dokumentace a vysetrovanu zlocinu komunismu. SECURITAS IMPERII 7. Прага, 2001, б. 192-223. Ён піша пра трагічны лёс беларускага дзеяча Аляксандра Калошы, грамадзяніна Чэхаславаччыны, які ў 1949 г. быў арыштаваны ідэпартаваны ў СССР.

Арышты людзей і іх наступнае перамяшчэньне ў СССР пачаліся адразу ж папрыходзе Чырвонай Арміі на тэрыторыю Чэхаславаччыны ў 1944 годзе. Дэпартацыя працягвалася да пачатку 50-х гадоў. Спачатку гэтыя мерапрыемствы праводзіў СЬМЕРШ г. зн. падразьдзяленьні вайсковай контрразьведкі ў складзе асобных часьцей Чырвонай Арміі. Былы супрацоўнік аднаго з аддзелаў СЬМЕРШу Мікалай Сіневірскі ў сваіх успамінах піша, што яго падразьдзяленьне ў акцыі (маюцца на ўвазе выкраданьні) дэтальна рыхтавалася яшчэ да дня вызваленьня Прагі. Супрацоўнікі аддзела папярэдне падрыхтавалі сьпісы расейскіх эмігрантаў з 20-х гадоў, якія жылі ў Чэхаславаччыне. З наяўных дакумэнтаў відаць, што найбольшая колькасьць “зьніклых” асобаў адносіцца да першага году “вызваленьня”. Прыкладна 80% вядомых нам асобаў былі скрадзеныя ў пэрыяд травень — сьнежань 1945 году, калі выкрадальнікі найперш “арыентаваліся” на прадстаўнікоў “белай” эміграцыі з Савецкага Саюзу. У пэрыяд з 1946 году і да лютага 1948 году (28 лютага камуністы з Чэхаславаччыны зьдзейсьнілі пераварот і захапілі ўладу ў краіне — АР) “акцыі” праводзіў 3-ці аддзел МГБ.
У большасьці выпадкаў савецкія карныя органы не рабілі нават запыту наконт фармальнага дазволу ва ўладаў ЧСР на правядзеньне падобных мерапрыемстваў на тэрыторыі сувэрэннай дзяржавы. Органы ЧСР пра некаторыя такія “акцыі” даведваліся самымі апошнімі — пасьля заяваў сваякоў выкрадзеных людзей і г. д.
Падчас затрыманьня адной з такіх асобаў, якая была ў сьпісах, прадстаўнік савецкіх органаў паказаў чэскаму паліцыянту кнігу прыкладна з 500 бачынаў зь мяркуемым сьпісам “савецкіх вайсковых злачынцаў”, сярод якіх было і прозьвішча затрыманага.
Яшчэ адзін спосаб выкраданьня людзей, які выкарыстоўвала НКВД, была “тактыка прад”яўленьня абвінавачаньня да канкрэтнай асобы” — чалавек абвіняўся ў супрацоўніцтве зь немцамі. Гэтая тактыка была “пасьпяхова” ўжытая ў адносінах да інжынэра Аляксандра Калошы.
Аляксандар Калоша, беларус па нацыянальнасьці, нарадзіўся ў 1905 годзе ў тагачасным польскім горадзе Заям (насамрэч, гэта беларуская вёска Заямное, прыкладна ў 5 кілямэтрах на поўнач ад Стаўбцоў — АР) недалёка ад Менску.У 1930 годзе ён быў грамадзянінам Польшчы, а ў Празе пачаў вучыцца на агранома. Пасьля акупацыі Польшчы Савецкім Саюзам у савецкім пасольстве (у Празе –АР) Калоша падаў заяву на атрыманьне савецкага грамдзянства, дзе быўадначасова зарэгістраваны НКВД. У прадастаўленьні грамадзянства яму было адмоўлена, і Аляксандар Калоша падаў заяву на атрыманьне дазволу напражываньне на тэрыторыі Пратэктарату Чэхія і Маравія. Улады Пратэктарата выдалі яму пашпарт замежніка.
У 1941 годзе Калоша падаў заяву на атрыманьне грамадзянства Пратэктарату, бо жыў ужо на тэрыторыі Чэхіі прыблізна 11 гадоў і хацеў ажаніцца з чэскай дзяўчынай. У гэтым жа годзе яго паслалі ў Нямеччыну на прымусовыя працы.Падчас аднаго з адпускоў у 1942 годзе ён ажаніўся. Яго жонка пазьней пацьвердзіла, што яму “...было прапанавана нямецкае грамадзянства, ад якога ён адмовіўся ў сувязі з тым, што ўжо падаў заяву на атрыманьне грамадзянства Пратэктарату, у якім яму было пазьней адмоўлена...”.

У 1945 годзе Калоша скарыстаўся замяшаньнем падчас налёту авіяцыі на Бэрлін і прыехаў у г. Розток каля Прагі, дзе жыла яго жонка. Разам з іншымі жыхарамі Розтака ўдзельнічаў у праскім паўстаньні.
У чэрвені 1946 году зноў падаў заяву на атрыманьне чэхаславацкага грамадзянства. Грамадзянінам ЧСР стаў пасьля двух з паловай гадоў чаканьня. Гэтае рашэньне было прынятае краёвай народнай радай г. Прага 9 чэрвеня 1947 году.
Калоша ня мог меркаваць, што спакойнае сямейнае жыцьцё з жонкай і двума дочкамі будзе нядоўгім. Адна з дзяржаваў-пераможцаў — Савецкі Саюз, а канкрэтна супрацоўнікі яго рэпрэсіўнага органу МГБ, згадалі асобу, якая ў 1939 годзе падавала заяву на атрыманьне савецкага грамадзянства. За адзіндзень да камуністычнага путчу ў Чэхаславаччыне г. зн. 27 лютага 1948 году, савецкае пасольства ў Празе перадало чэскаму боку ноту пра выдачу “ваеннага злачынцы”, які нібыта супрацоўнічаў зь беларускімі антысавецкімі арганізацыямі — тут вялося пра Аляксандра Калошу.* [...]
Між тым стала вядома, што маюць справу з грамадзянінам ЧСР. 1 красавіка 1948году рашэньне аб прадастаўленьні грамадзянства было адменена, а 3-га ліпеня было прынятае рашэньне пра дэпартацыю Калошы з тэрыторыі ЧСР (вяртаньне было забаронена пад пагрозай сьмяротнай кары).
8 жніўня 1948 году Калоша быў пераведзены ў спэцыяльны лягер ў Празе-7, 20 студзеня 1949 г. ён быў вывезены ў Савецкі Саюз.
Вярхоўны суд БССР яго яшчэ ў тым жа годзе асудзіў на 25 гадоў. У дзясятыя ўгодкі заканчэньня вайны Крэмль прыняў рашэньне пра амністыю, дзякуючы якой значная частка ваеннапалонных і інтэрнаваных асобаў, якія насамрэчці верагодна супрацоўнічалі з нацыстамі, была вызвалена. 20 верасьня 1955 г. Калоша быў перададзены чэхаславацкім уладам і зьмешчаны ў турму Прага-Рузына.
Тут толькі праз сем дзён — 27 верасьня 1955 году — ён быў афіцыйна перарадзены пракуратуры як асоба, што супрацоўнічала з нацыстамі. Пасьля допытаў і заявы зь Міністэрства замежных спраў, у якім было заяўлена, што, у адпаведнасьці з афіцыйным зваротам Міністэрства замежных спраў СССР пра тое,што Калоша на тэрыторыі СССР неадкладна быў бы вызвалены, і пасьля рашэньня 120-га паседжаньня палітбюро ЦК КПЧ быў яго арышт, як безпадстаўны, 1 ліпеня 1956 году адменены.
Застаецца парадаксальным у даным выпадку факт, што Калоша аж да сваёй сьмерці ў 1985 годзе жыў на тэрыторыі дзяржавы, зь якой быў назаўсёды дэпартаваны, і, нягледзячы на тое, што быў пазбаўлены грамадзянства ЧССР, пасьля вяртаньня з СССР грамадзянства яму не было ні адноўленае, ні прадстаўленае зноў. Такім чынам, хаця ў 1948 годзе Калоша быў афіцыйна пазбаўлены грамадзянства, чэхаславацкія ўлады з 1956 г. рабілі выгляд, што ніякага пазбаўленьня грамадзянства не было.

*Яшчэ 10 лютага 1948 г. МУС Чэхаславаччыны атрымаў ад Міністэрства замежныхсправаў “мэмарандум”, у якім паведамлялся, што савецкія ўлады патрабуюць выдачы трох “ваенных злачынцаў”: Аляксандра Калошы, Івана і Ларысы Генiюшаў. Паводле гэтага дакумэнта, Калоша “актыўна ўдзельнічаў у працы беларускіх антысавецкіх арганізацыяў у 1940 — 1942 гг.”, быў намесьнікам старшыні пражскага аддзела Беларускага прадстаўніцтва ў Нямеччыне. У 1944 г. ён, нібыта, “зьвярнуўся да немцаў з заклікам пра дапамогу ў супраціве СавецкайАрміі”. У лютым 1948 г. А. Калоша пражываў у Клатаўскай вобласьці, раёне Нірска, населеным пункце Худэрэйн (Генiюш Л. Выбраныя творы. Менск, 2000, б. 580). У згаданым вышэй дакумэнце Калоша называецца Аляксандрам Міхайлавічам. Аднаку сьпісе грамадзянаў Чэхаславаччыны, асуджаных за цяжкія злачынствы, ённазываецца Аляксандрам Якаўлевічам. Як, дарэчы, згадваецца і ў працы Аляксея Салаўёва “Белорусская центральная рада: создание, деятельность, крах” (Менск, 1995, б. 158). Паводле Салаўёва, А. Калоша з 1943 да 1945 г. ачольваў упраўленьне апекі пры цэнтральным “Рабочым фронце” ў Бэрліне, а

ў сакавіку 1944-га быў абраны старшынём Беларускага камітэту самапомачы ў Бэрліне. У жніўні 1944 г. быў уведзены ў склад Беларускай Цэнтральнай Рады (Тамсама, б. 99).

Публікацыя Алеся Раманюка

KAMUNIKAT.org

## УСПАМІНЫ

***П. Дзеравенскі***

### Аддзел атамана Трухана і паўстаўшая вайсковая арганізацыя Люцька

Гэты партызанскі аддзел паўстае адразу пасьля Слуцкага Паўстаньня.
Камандзер аддзелу Якуб Трухан 1, пасьля адыходу Слуцкай паўстанцкай дывізіі 2 за раку Лань, на тэрыторыю Беларусі, захопленую Польшчай, арганізуе з паўстанцаў дывізіі 40-асабовы партызанскі аддзел і вяртаецца ў Случчыну.Тут адразу-ж і пачынаецца збройная партызанская барацьба з расейска-бальшавіцкім акупантам.
Аддзел дзее па ўсёй паўдзённай Случчыне. Партызанскі асяродак знаходзіцца недалёка вёскі Працавічы. Партызаны атамана Трухана зьнішчалі чырвонагвардзейскія карныя аддзелы, якія забіралі сялянскі хлеб; нападалі на бальшавіцкія абозы, адбіралі нарабаванае сялянскае дабро і вярталіяго собсьнікам, вызвалялі паарыштаваных сялян, расстрэльвалі бальшавіцкіх камісараў і завадатых.
Дзякуючы даносу, у 1927 годзе атаман быў схоплены агентамі ГПУ ў аднэй вёсцы, бяз зброі і свайго аддзелу, сябры якога таіліся па асобных сёлах і хутарох. З Засуджаны тройкай ГПУ на 10 год катаргі ў Сібіры, атаман Трухан, па выладаваньні з цягніка, уцякае ў тайгу Прыбайкальля. Па нейкім часе ён, крадучыся, вяртаецца на радзіму, але ў вельмі цяжкім стане здароўя: апухлыя ногі і пад[обнае]. Ачуняўшы, праз пару месяцаў Трухан зноў пачынае навязывацькантакты з былымі сябрамі свайго аддзелу, якія засталіся жывымі і перахоўваліся на Случчыне па вёсках, каб узнавіць партызанскае дзеяньне.
У 1929 годзе, зноў такі па даносу, атамана Трухана ізноў арыштоўваюць. Ня гледзячы на нялюдзкія катаваньні, Трухан ні да каго не прызнаецца, засуджаецца і зноў вывозіцца ў Сібір. На гэты раз ён даконвае ўцёкаў з дарогі і ўжо на вясну 1930 году зьяўляецца на Случчыне. Аднаўляе партызанскую арганізацыю, якую стварыў у 1928 годзе пасьля павароту з Сібіры. Гэта ўжо арганізацыяіншага тыпу, чым першы партызанскі аддзел атамана Трухана, які існаваў у 1920—1927 гадох.
Новая арганізацыя, прыстасоўваючыся да зьмяніўшыхся абставінаў, ня выступае збройна вялікімі групамі і не хаваецца ў лясох, але знайходзіцца на мейсцы ў вёсках і трымаецца формы нелегальнае сялянскае збройнае арганізацыі. Заданьні арганізацыі — не вялікія збройныя выступы, але падрыхтоўка вайсковых кадраў да адпаведнага моманту. Апрача гэтага арганізацыя выконвае ў асобных выпадках зьнішчэньне агентаў, камуністычных асяродкаў, сабатаж бальшавіцкіх акцыяў і г. д.
Аддзел атамана Трухана навязывае сувязі з іншымі партызанскімі аддзеламі і арганізацыямі на Палесьсі, плянуючы арганізаваць шырокае супрацьбальшавіцка-маскоўскае паўстаньне.
Арганізацыя атамана Трухана наладжвае сувязь з беларускімі нацыянальнымі аддзеламі Савецкае арміі ў Слуцку і Менску. На чале патайной вайсковай арганізацыі становіцца аднавясковец атамана Трухана, у той час камандзір роты Люцька.
Камандзер Люцька пашырае беларускую паўстанцкую акцыю на іншыя ротыў сваім палку і ў суседнія вайсковыя часткі. Адозвы арганізацыі атаманаТрухана распаўсюджваюцца нат сярод студэнтаў Беларускага ДзяржаўнагаЎнівэрсытэту ў Менску.
Пашырэньне дзейнасьці арганізацыі на войска і студэнтаў, яе выдавецкая дзейнасьць: адозвы, лістоўкі і пад., навялі на сьлед яе ГПУ.
Пачалося з правалу камандзера Люцька сэксотам ОО (асобы аддзел) Дывізіі. Але сябры вайсковай беларускай арганізацыі мелі сваё вуха і ў ОО Дывізіі і камандзер Люцько быў папярэджаны аб прадбачаным уначы ягоным арышчэ. Забраўшы ручны кулямёт, усю колькасьць набояў, якая мелася да кулямёту,і некалькі зьвязкаў ручных гранатаў, камандзер

Люцько і пара ягоных супрацоўнікаў уцякаюць у Слуцкія лясы, мяркуючы прарвацца праз мяжу на польскі бок.
Аднак ня спалі ГПУ і ОО. З Слуцку высылаецца адумысловая карная пагоня— аблога за Люцко 4 і ягонымі таварышамі, а мяжу з Польшчай вартуюць павялічаныя аддзелы ГПУ і пагранічнае аховы. Малая група камандзера Люцько была выкрытая ў прыгранічных балотах з дапамогаю адпаведна дрэсыраваныхсабакаў савецкіх пагранічнікаў. Абложаныя з усіх бакоў беларускія нацыянальныя змоўшчыкі адбіваліся каля 2 дзён з пазыцыяў у балоце. КамандзерЛюцька згінуў у баі. Ягоны сябра — старшыня роты быў схоплены цяжка параненым у палон. Доля іншых удзельнікаў групы дагэтуль невядомая. Пасьля захопу пазыцыяў чырвоныя каты там болей нікога не знайшлі. Страты чырвоных былі вялікія і іх затоілі ад ваколічнага сялянства, бо забытых і параненых вывозілі з мейсца бою толькі ўночы, калі выхад з хатаў насельніцтву быў забаронены.
У той самы час у Слуцку, Случчыне і ў Менску ГПУ праводзіць масавыя арышты і хапаецца некалькі сот людзей.
Падлечаны крыху цяжка паранены старшына, пад катаваньнямі выдае некаторыя дадзеныя арганізацыі і колькі імёнаў сяброў яе. ГПУ лютуе і зноў хапае соткі людзей. Падлечаны было старшына быў расстраляны разам з іншымі схопленымі людзьмі.
Атамана Трухана НКВД ужо здолела схапіць толькі ў 1938 годзе, калі і быў засуджаны на 20 год катаргі, вывезены ў адзін з концаў поўначы, дзе і згінуў.5
Плян паўстаньня арганізацыі, меркаваны на 1930 год, прадбачыў [наступнае]:усё пачыналася ў палку камандзера Люцька да якога, праз паўстанскія групы ў вайсковых частках, далучыліся-б аддзелы з усяе дывізіі. Адначасна, партызаны Случчыны захапілі-б усе апорныя пункты па вёсках у правінцыі. Разьлічвалася, што паўстаньне ў Случчыне выкліча збройныя выступы па ўсёй Беларусі, сялянства якой у той час гвалтоўна гналі ў калгасы. Меліся нейкія сувязі і з Менскам, але аб гэтым яшчэ ня час гаварыць, бо некаторыя яго ўдзельнікі жывуць яшчэ сяньня. Разьлічалася, што гэтыя збройныя выступы выльлюцца ў суцэльнае агульнанароднае супрацьбальшавіцкае паўстаньне, якое прывядзе да аднаўленьня незалежнасьці Беларусі.
Застаецца дакінуць колькі слоў аб загінуўшым сьмерцю гэроя ў баі камандзеры Люцько. Паходзіў ён з Случчыны і ў 1924-25 годзе скончыў Аб’яднаную Беларускую Ваенную Школу (АБВШ) ў чыне камандзера ўзводу, а пазьней дастаў падвышку на камандзера роты.6

*Перадрукоўваецца паводле публікацыі: Дзеравенскі П. Беларускі Партызанскі Рух у Усходняй Беларусі // Дакуманты і факты (Таронта — Нью-Ёрк), 1955, № 8, ліпень-жнівень, б. 42-43.*

Спасылкі:
1 Былы ўдзельнік ягонага партызанскага аддзелу Алесь Яцэвіч у сваіх успамінах называў Трухана Якавам. Паводле Яцэвіча, ат. Трухан быў былым камандзірам аддзелу арміі генэрала Булак-Балаховіча (Змагар А. Мой жыцьцяпіс //Юрэвіч Л. Беларуская мэмуарыстыка на эміграцыі. Нью-Ёрк, 1999). Гэтая і наступныя заўвагі — “БР”.
2 Насамрэч, брыгады.
3 Частку сваіх людзей ат. Трухан яшчэ ў пачатку 20-х легалізоўваў. Алеся Яцэвіча і Ільлю Кобера ён адправіў у Менск паступаць у БДУ, і яны там уладкаваліся (Змагар А. Мой жыцьцяпіс // Юрэвіч Л. Беларуская мэмуарыстыка на эміграцыі. Нью-Ёрк, 1999).
4 Аўтар успамінаў у тэксьце ўжывае некалькі варыянтаў прозьвішча паўстанца.
5 Паводле Алеся Змагара (Яцэвіча), атаман Якуб Трухан актыўна дзейнічаўда 1937 году (Змагар А. Вызвольныя шляхі. Кліўлянд, 1965. б. 46).
6 Пра арганізацыю П. Люцко ў сваіх успамінах згадвае Аўген Калубовіч (Накрыжовай дарозе // Спадчына, 1992, № 3, б. 78; На крыжовай дарозе. Менск, 1994, бб. 31-32.):

“У 1930 г. у беларускім пяхотным палку ў Слуцку ГПУ выкрыла вайсковую арганізацыю. Полк гэты (у вадрозьненьне ад кадравых войск Чырвонай арміі) належыў да г. зв. беларускіх тэрытарыяльных вайсковых фармаваньняў, што засталіся яшчэ ад часоў грамадзянскае вайны й першых гадоў БССР. Падобна іншым такім аддзелам, ягоныя жаўнеры й афіцэры — беларусы. На чале арганізацыі стаяў ротны камандзер П. Люцко, які паходзіў із с. Працавічы Слуцкагараёну. Па сканчэньні Аб”яднанай беларускай вайсковай школы ймя ЦВК БССРу Менску ён быў прызначаны на камандзера роты ў гэты полк, рэзыдаваны ў ягоным родным Слуцку й Случчыне. У найбольшы разгар прымусовае калектывізацыі й масавых арыштаў і вывазаў сялян у Сібір ён, разам із сваімі вайсковымі сябрамі, уплянаваў узьняць роту ў Слуцку на паўстаньне, спадзяючыся,што да іх далучацца іншыя роты палка й сяляне. Змову, аднак, хтось зрадзіў.Калі пра гэта стала ведама, П. Люцко і ягоны бліжэйшы сябра, старшына зь ягонае роты, добра ўзброіўшыся, вырашылі перайсьці ў Заходнюю Беларусь.Блізка мяжы іх насьцігла пагоня пагранічнікаў і аддзелу ГПУ. У перастрэлцы П. Люцко быў забіты, а старшына, цяжка паранены, схоплены й пасьля допытаў расстраляны. Лёс рэшты арыштаваных змоўнікаў невядомы. (Хутка пасьлятаго як ненадзейныя былі расфармаваныя й тыя беларускія тэрытарыяльныя вайсковыя аддзелы: усе яны былі ўлучаныя ў кадравыя войскі).

**Беларуска-польскія перамовы**
**ў сакавіку 1944 году**

Дачыненьні польскага і беларускага нацыянальнага рухаў падчас нямецкай акупацыі 1941-1944 гг. застаюцца малавывучанымі. Ёсьць згадкі пра перамовыз падпольлем АК прадстаўнікоў Арганізацыі беларускіх нацыяналістаў. Менш вядомыя факты кантактаў паміж польскімі партызанамі і беларускімівайсковымі фармацыямі. Антыбеларускі тэрор, які разгарнула на Лідчыне польскае падпольле, мог справакаваць адэкватныя захады з боку беларускіх збройных сілаў. З мэтай недапушчэньня гэтай “малой вайны” у 1944 г. адбываліся перамовы паміж беларускімі і польскімі вайскоўцамі.
Паводле былога камандзіра Навагрудзкага беларускага эскадрону Барыса Рагулі, у сакавіку 1944 г. галоўны камандзір БКА Ф.Кушаль паслаў яго ў Вільню на перамовы з кіраўніцтвам польскай АК. Сустрэча з “Вількам” (палкоўнікам Аляксандрам Крыжаноўскім, камандантам Віленскай акругі АК) адбылася на канспірацыйнай кватэры. Рагуля паведаміў, што ён прыбыў ад Кушаля.“Падчас перамоваў я спытаў, ці могуць палякі нам дапамагчы зброяй, — успамінае Б.Рагуля. — Зброі яны не маглі нам даць, бо самыя атрымоўвалі яе аднемцаў. Я запатрабаваў, каб яны спынілі антыбеларускі тэрор. Сказаў, што калі яны яго будуць працягваць супраць беларусаў на Лідчыне, дык мы можам зьнішчыць палякаў на Навагрbody Навагрудчыне, дзе мы маем больш сілы. Палякі пачалі казаць, што не яны забіваюць беларусаў, а нейкія бандыты. Я мусіў пагадзіцца, што гэта робіцца бяз іх загаду” (Паведамленьне Б.Рагулі аўтару ад 5 ліпеня 1997 г., Вільня). Пра імкненьне Кушаля ў 1943—1944 гг. устанавіць сувязь з польскім эміграцыйным урадам сьведчыў на допыце ў турме савецкай дзяржбясьпекі маёр БКА Ўсевалад Родзька. У Вільні перамовы з кіраўніцтвам польскага падпольля вясной 1944 г. вёў Станіслаў Грынкевіч, які, нібыта, дзейнічаў упаразуменьні з прэзыдэнтам БЦР Р.Астроўскім. Акрамя выключна палітычных прапановаў зь беларускага боку быў і пункт пра падзел “зонаў уплыву” беларускіх вайсковых аддзелаў і польскай партызанкі, спыненьня “ўсялякіх варожых дзеяньняў паміж імі” і распрацоўкі сумеснага пляну “барацьбы як супраць немцаў, так і супраць чырвоных партызанаў”. Але перамовы аказаліся безвыніковымі (Акшевский И., Сенюков Г. Откровения бургомистра Витебска // Белорусская нива, 1994, 20 студзеня).

У тым жа сакавіку 1944-га беларуска-польскія перамовы праходзілі і на Навагралчыне. Яны праходзілі па схеме віленскай сустрэчы, калі ніякіх пісьмовых дамоўленасьцяў не прымалася, а ішло толькі абмеркаваньне тагачасных беларуска-польскіх стасункаў. Беларусы патрабавалі спыніць антыбеларускі тэрор, пагражалі, а палякі ўсё адмаўлялі. Пагаварылі, пабразгалі зброяй і разыйшліся. Як бачым, беларускія вайскоўцы былі настроеныя вырашыць гэтую праблему мірным шляхам. Адпраўляючы ў Бярозаўку аддзел Уладзімера Сіўка, Рагуля сказаў яму, каб "ён пастараўся не праліваць крыві, бо яеўжо шмат праліта" .
У гэтым нумары "БР" мы друкуем успаміны пра беларуска-польскія перамовы ў сакавіку 1944 г. на Навагралчыне. Адным з аўтараў гэтага тэксту, які ўпершыню быў надрукаваны ў эміграцыйным часопісе "Наперад!" (1953, № 24-26; перадрук— Юрэвіч Л. Жыцьцё пад агнём. Партрэт беларускага военачальніка і палітычнага дзеяча Барыса Рагулі на фоне яго эпохі. Менск, 1999) пад псеўданімам "Рагулявец", быў Барыс Рагуля. З-за таго, што ўсе тры ўдзельнікі перамоваў зь беларускага боку апынуліся пасьля ў савецкіх канцлягерах, успаміны пісалі не непасрэдныя сьведкі тых падзеяў, адсюль памылкі і недакладнасьці.. Іх выпраўляе сваім камэнтаром Уладзімер Сіўко. Ягоныя ўспаміны друкуюцца ўпершыню.
Сяргей Ёрш

Аднэй сакавіковай раніцы прыйшла ў Наваградак навіна, што Палякі перайшлі Нёман і занялі шкляную гуту ў Бярозаўцы. Гэта была першая паважная акцыя польскіх партызанаў зь Лідчыны ў Наваградзкай Акрузе. Тут трэба даць колькі словаў паясьненьня адносна польскага партызанскага руху ў тых ваколіцах. Пачатак польскага руху датуецца прыблізна з пачатку 1942 году. Асноўнай ягонай базай была якраз Лідчына. Жыхарства Лідчыны ў сваёй аснове амаль стопрацэнтна беларускае, ня лічачы невялікае колькасьці асаднікаў і былых польскіх урадаўцаў, насланых польскім урадам у часе існаваньня польскае дзяржавы. Жыхарства гутарыць прыгожай беларускай мовай і незважаючы на надлюдзкія палянізатарскія высілкі польскага ўраду, яно засталося ў сваёй аснове беларускае. Аднак дзякуючы таму, што ў пераважальнай бальшыні было яно каталіцкага веравызнаньня, польскія сьвятары мелі тут шырокае поле дзеяньня. Выкарыстоўваючы свой духоўны сан і глыбокую традыцыйную рэлігійнасьць беларускага народу, яны вязалі паняцьце веравызнаньня з нацыянальнасьцяй. Зразумела, гэная акцыя не закранала сьведамай часткі беларускай інтэлігенцыі, якая бачыла ўсю пэрфіднасьць тактыкі польскага клеру, але сярод шырэйшых масаў гэта пакінула ці малы сьлед. Тыя нешматлікія беларускія каталіцкія сьвятары, якім нейкім цудам удалося здабыць сьвятарскі сан, залежалі ад польскай каталіцкай герархіі,якая пры першай праяве нацыянальнай дзейнасьці гэткага сьвятара высылала яго ў польскія асяродкі.
Вось гэная акцыя польскага клеру і падрыхтавала падатны грунт для польскіх партызанаў у Лідчыне. У часе нямецкае акупацыі Палякі захапілі ўсе ключавыя адміністрацыйныя і гаспадарскія становішчы. Яны абставілі Немцаў сваімі перакладнікамі, засноўвалі польскія школы. Касьцёлы сталіся асяродкамі польскае акцыі. Беларускія патрыёты прадстаўляліся Палякамі як камуністыя, былі перасьледаваныя нямецкім СД. Наваградзкая Акруга старалася дапамагаць у меру магчымасьцяў беларускаму актыву Ліды, высылаючы туды першым чынам маладых настаўнікаў. Трэба адцеміць, што яны прарабілі там вялізарную нацыянальную працу. Нельга не адцеміць той фізычнай і духовай апоры для Беларусаў Лідчыны, якую ім даў чыгуначны баталён,зарганізаваны ў Наваградку капітанам Сажычам1, ды высланы ў Ліду. Зразумела, што насельніцтва Наваградзкае Акругі зь непакоем сачыла за падзеямі ў Лідчыне. Кажны новы атэнтат Палякаў на беларускі актыў выклікаў хвалю абурэньня й жаданьне помсты. Змаганьне аднак было тым цяжэйшае, што пачынаючы ад канца 1943 году польскія партызаны зьмянілі тактыку й спынілі змаганьне супраць Немцаў, дамовіўшыся з апошнімі на супольную акцыю супраць чырвоных партызанаў. Немцы давалі

ім зброю, амуніцыю й уніформы, а таксама пакрывалі іх крымінальныя вычыны ў дачыненьні да беларускага жыхарства.
Зусім зразумела, што заняцьце шкляной гуты ў Бярозаўцы Палякамі выклікала абурэньне сярод наваградчан. Жаўнеры эскадрону дамагаліся неадкладнага дзеяньня. Гульня Немцаў была тут ясная: Палякі занялі гуту із згодай нямецкіх уладаў, якім залежала адначасна аслабіць эскадрон.
Для эскадрону сутычка з добра ўзброенымі Палякамі, нат пераможная, была нявыгадная. Аднак пакінуць Палякаў на “сваёй” тэрыторыі было абсалютна недапушчальна. На нарадзе камандзераў зьвязаў з камандзерам эскадрону было пастаноўлена здабыць гуту, але раней папрабаваць прымусіць Палякаў пакінуць гуту бяз бою. Каманду пераняў ст. лейт. С[іўко].2
Цэлы дзень кіпела рыхтоўля да маршу. Папаўняліся стужкі “максімаў”, набіваліся дыскі “дзехцяроў”. На сьвітаньні эскадрон выйшаў у паход. Каля паўдня перад жаўнерамі зарысаваліся коміны гуты, а на найвышэйшай зь іх вісеў польскі сьцяг. Зацісунуліся рукі на стрэльбах.
Зьвязы занялі вызначаныя пазыцыі. Мінамёты і на той час адзіная супрацьпанцырная гармата з гатовай да бою абслугай чакалі на загад каб пачаць бой.
Ст. лейтэнант С[іўко] меў гатовы плян. Ліст да камандзера польскага аддзелу ляжаў у ягонай кішані. У ім было сфармуляванае ўльтыматыўнае дамаганьне неадкладнага адступу Палякаў за Нёман. С[іўко] падклікаў аднаго селяніна і даручыў яму перадаць ліст собскаручна камандзеру польскага аддзелу. Палякам было дадзена дзьве гадзіны часу. Камандзер глянуў на гадзіньнік. Роўна поўдзень. Ён дапісаў нешта ў ліст, заклеіў і перадаў селяніну.За некалькі часінаў той ужо быў каля першых забудоваў вёскі. Два польскія жаўнеры выскачылі з-за хаты насупраць яго і неўзабаве зьніклі ў забудовах.
Памаленьку пасоўваецца стрэлка гадзіньніка. Жаўнеры гараць нецерпялівасьцяй. Ніхто ня верыць у мірнае палагоджаньне канфлікту. У іхных вачох устаюць постаці дзесяткаў і сотняў забітых беларускіх патрыётаў. Тыпічны праяў рыцарскасьці польскіх партызанаў: данос у СД або куля ў плечы.
Стрэлка мінае першую гадзіну. Камандзеры зьвязаў маюць апошнюю нараду з С[іўко].
— Пачынаем пунктуальна ў дзьве гадзіны. Другі зьвяз павінен заняць якнайхутчэй мост цераз Нёман. Пакінуць адну дружыну і атакаваць Бярозаўку з паўночнага боку. Трэйці зьвяз пад прыкрыцьцём мінамётаў і цяжкіх кулямётаў зойме першыя забудовы. Першы зьвяз у рэзэрве. На белую ракету заняць першыя забудовы ўправа ад гуты! — палі апошнія словы С[іўко].
Гадзіна 1,45. На дарозе паказваецца постаць селяніна. Адначасна польскі сьцяг на коміне гуты паволі апушчаецца. За некалькі часін камандзер трымае ліст у руках.
Палякі пастанавілі адступіць за Нёман. Роўна а 2-й гадзіне эскадрон увайшоў баявым парадкам у гуту. Тэлефанічная сувязь з Наваградкам была навязана неадкладна. І паплыла па дроце радасная вестка аб бяскрывавай перамозе эскадрону. [...]
На наступны дзень Палякі прыслалі дэлегацыю з прапановаю наладжаньня сустрэчы камандзераў польскіх партызанскіх аддзелаў у Лідчыне з ахвіцэрамі эскадрону. Як месца сустрэчы, яны запрапанавалі адзін хутар каля двух кілямэтраў ад Бярозаўкі. З кажнага боку будзе трох дэлегатаў. Адны й другія павінны забавязацца прыйсьці бяз эскорты і толькі з бакавой зброяй. Мэта сустрэчы: шуканьне паразуменьня між двума бакамі ў супольным змаганьні супроць чырвоных партызанаў. Ст. лейт. С[іўко] пасьля кароткае нарады даў сваю згоду. Трэба сказаць, што пры наяве ведамых падступных мэтадаў Палякаў, такая сустрэча была больш чым рызыкоўная і вымагала вялікай адвагі нашых камандзераў. Ст. лейт. С[іўко] ў таварыстве лейт. М. і падахвіц. У.роўна а дванаццатай гадзіне выйшаў на ўмоўленае месца сустрэчы. Дзьве дружыны ў поўнай баёвай гатоўнасьці былі вызначаны на ўсялякую непрадбачаную эвэнтуальнасьць. На хутары сустрэў нашых камандзераў маёр Рогэр (так ён прынамся прадставіўся). Перад быстрым аднак вокам падахвіцэра У. не схаваўся аддзел

польскіх партызанаў у сіле каля 30-х чалавек, што залёг ў кустах мэтраў 300 ад хутару. Ён паінфармаваў аб гэтым камандзераў. Маёр Рогэр, зразумеўшы сказанае, зрабіў выгляд, што ён аб гэтым нічога ня ведаў,і што гэтыя жаўнеры апыніліся там безь ягонага ведама. Ім ён даў загад неадкладна пакінуць раён хутару.
Атмасфэра была даволі напружаная. Паміма добрага абеду і самагону, гутарка ня клеілася. Нашы адмовіліся піць. Нарэшце Палякі прыступілі да справы. Пасьля доўгага ўступу аб міжнароднай сытуацыі ды няўхільным прыходзе бальшавікоў, яны імкнуліся пераканаць, што польскі лёнданскі ўрад будзе мець дастаткова ўплываў на міжнародныя падзеі, каб захаваць Польшчу незалежнай дзяржавай у старых межах ды што для Беларусаў адзіны выхад —гэта супрацоўніцтва цяпер з Палякамі. Гэта будзе дастаткова ацэнена апошнімі, і ў будучыні належна ўзнагароджана ў шырэйшым нацыянальным маштабе. На вуснах С[іўко] паявілася дабратлівая нядвузначная ўсьмешка.
— За нашон вольносьць і вашон, ня так? — папытаў ён.
— Як сен цешэн жэ пан мне зрозумял, власьне о то ходзі, — ускрыкнуў радасна маёр, пасьпяшаўшыся з высnавамі.
— Вось у гэтым і справа, — ужо паважна адказаў С[іўко]. — Нельга ашукваць два разы на тую самую прынаду. Гэта не бярэ. Зрэштай такога характару гутаркі павінны весьціся ў дзяржаўным маштабе. Вашую вольнасьць мы пазналі і нацешыліся ёю дастаткова за дваццаць гадоў вашага панаваньня. Маем годзе. Прапаную гутарыць больш аб нашых лякальных справах. Мне ведама, штовы атрымоўваеце зброю ад Немцаў. Мы таксама. Мы змагаемся супраць чырвоных партызанаў. Вы ад некаторага часу таксама павярнулі зброю супраць бальшавікоў. Але ёсьць адно ”але”: вы змагаецеся першым чынам супраць Беларусаў, вынішчаючы нацыянальна сьведамы элемэнт, які ў канчальным выпадкутаксама як і вы змагаецца супраць бальшавікоў. Не за Немцаў, але за лепшуюбудучыню свайго народу. Нашая мэта — незалежная Беларусь. Зразумела, што пажадана, каб нашыя народы жылі ў добрасуседзкіх дачыненьнях, але дзеля гэтага трэба ўжо сяньня палажыць да гэтага асновы. Вашая праступная тактыка адносна Беларусаў у Лідзкай акрузе ў ніякім выпадку ня спрыяе гэтай мэце. Дайце выясьненьні што да забойстваў Беларусаў.
Маёр быў выразна занепакоены.
— Бачыце, цяжка ўтрымаць дысцыпліну ў партызанскім жыцьці. Гэта былі выпадкі, зробленыя бязь ведама галоўнага камандаваньня. Вы разумееце, што існуюць паасобныя нездысцыплінаваныя банды, і нам цяжка мець над імі кантролю. Але ў нас ёсьць загад не чапаць беларускага насельніцтва. Вы павінны гэта зразумець…
— Так, я добра разумею і раблю з гэтага адпаведны высnаў: нельга дагаворвацца аб супольнай акцыі з камандзерамі, якія ня маюць аўтарытэту над сваімі жаўнерамі. З майго боку наступная прапанова: вы павінны неадкладна спыніць тэрарыстычную акцыю супраць беларускага актыву. Даём вам час да пераканаyньня нас у вашых добрых намерах. Прапаную пасьля аднаго месяцасустрэцца зноў. У выпадку аднак, калі тэрарыстычная акцыя паўторыцца, мыбудзем змушаны адказаць тэрорам на тэрор і пачнем сыстэматычную акцыю вынішчаньня Палякаў на тэрыторыі Навагрудзкае Акругі. Я скончыў. Разьвітваючыся, С[іўко] дадаў: — Прапаную Вам да сяньня вечара вывесьці ўсе вашыаддзелы за Нёман, каб ухіліцца ад непатрэбных сутычак.3
Увечары нашая дэлегацыя, расказваючы аб сустрэчы, знайшла поўную падтрымку ў занятым у гутарках з Палякамі становішчы.

Спасылкі:
1 Язэп Сажыч (нар. у 1917 г.) — актыўны ўдзельнік беларускага вайсковага руху часоў Другой сусьветнай вайны, сябра Беларускай Незалежніцкай Партыі. З 1944 г. жыў на эміграцыі. У 1982-97 гадах ачольваў Раду БНР, генэрал. Жыве ў ЗША.

2 Уладзімер Сіўко (1916 — 2003) — беларускі вайсковы дзяяч, паэт. Летам 1944 г. ня змог выехаць на Захад, жыў у Вільні. Арыштаваны ў жніўні 1945 г., зьняволеньне адбываў на Калыме. Памёр у Магілёве.
3 Сам Ул.Сіўко, пасьля прачытаньня гэтага тэксту ў ліпені 1996 г., прапанаваў такую вэрсію таго, як праходзілі перамовы: "Акоўцы першыя прапанавалі нам сустрэцца. Ад іх на сустрэчы былі "Жбік", "Рысь" і "Вільк", а са мною прыехалі Язэп Крака і Іван Прасьняк. Канешне, у часопіснай публікацыі тут пераблыталі, бо я не магу не памятаць, хто там быў са мной. Крака тады яшчэ быў падафіцэрам. Сустракаліся мы з палякамі не на хутары, а ў палацы графа Штольле (месьціўся ў кілямэтры ад Бярозаўкі). Акоўцы ведалі, што я падхарунжы польскі, і што Крака — былы падафіцэр. Ён служыў у "Першым пулку шолізэраў Язэпа Пілсудскего", гэта быў такі род войскаў, кавалерыйская частка. Былым польскім падафіцэрам быў і Прасьняк.
Мы сядзелі з палякамі за сталом, выпівалі (стол сарганізавалі яны). І мы дагаварыліся, каб яны нас не трывожылі, тады й мы іх трывожыць ня будзем. Няхай яны сядзяць там, за Нёманам, хай твораць там сваю "рэспубліку". А мы будзем бараніць Бярозаўку, так, як нам і загадана. А ў Бярозаўцы жыло польскае насельніцтва, каталікі. І яны мелі сувязь з АК. Мы іх ня крыўдзілі, не рабілі ім нічога дрэннага. Так што нашых хлопцаў бярозаўцы нават у госьці запрашалі. Былі такія факты.
Іван Прасьняк быў родам з Запольля Ятранскага. Яго пасьля судзілі бальшавікі. Адсядзеў і вярнуўся на Наваградчыну. Працаваў Прасьняк у Запольлі. Зь ім я спаткаўся толькі аднойчы, калі ён прыяжджаў у Любчу. Прасьняк ужо памёр. Язэп Крака родам зь вёскі Віньніца, што знаходзіцца недалёка ад Наваградку. Нарадзіўся ён, прыблізна, у 1914 годзе. Быў ён лейтэнантам, як і ўсе камандзіры зьвязаў. Калі пачалася мабілізацыя ў Беларускую Краёвую Абарону, Крака быў прыкамандзіраваны ў Любчу. Тут таксама быў арганізаваныбатальён. Язэпа Краку арыштавалі саветы. Сядзеў ён у лягерах, а пасьля быўу Комі, у Карэліі. Жыў на Ўкраіне, некалькі разоў прыяжджаў да мяне". (Паводле дыктафоннага запісу ўспамінаў Ул. Сіўка ад ліпеня 1996 г. Захоўваецца ў асабістым архіве С. Ярша)

**ПАВЕДАМЛЕНЬНІ**

## Група беларускіх нацыяналістаў на Вялейшчыне. 1943 год

Падчас нямецкай акупацыі ў шэрагу раёнаў Беларусі ўтварыліся нацыянальныя падпольныя і партызанскія групы, якія змагаліся і супраць нацыстаў, і супраць бальшавікоў. Сьлед такой групы на Вялейшчыне знайшоўся ў архіўных дакумэнтах.

Камандзір савецкай партызанскай брыгады зь Вялейшчыны Фёдар Маркаў1у пачатку вясны 1943 году паведамляў у Маскву пра сытуацыю ў раёне сваёй дзейнасьці:

"Акрамя польскіх арганізацыяў існуе група беларускіх нацыяналістаў,якія вядуць барацьбу супраць немцаў і савецкай улады. Гэтая група выпусьціла за ўвесь час толькі адну недапісаную ўлётку. Гэтая бязыменная група ня мае ніякага значэньня".2 Заслугоўвае ўвагі згадка, што ўдзельнікі групы "вядуць барацьбу" з акупантамі, значыць, іх дзейнасьць не абмежавалася выпускам улёткі (верагодна, "непадпісанай", а не "недапісанай"). На жаль, больш ніякай інфармацыі пра "групу беларускіх нацыяналістаў" выявіцьняўдалося.

Ёсьць зьвесткі пра існаваньне на Вялейшчыне групы нейкай "беларускай нелегальнай арганізацыі", сябрам якой быў беларускі дзяяч Пётра Радзевіч, зьнішчаны нацыстамі вясной 1943 г. Радзевіч, нібыта, да арышту "шырака вядзець антынямецкую працу".3 Верагодна, гэта была мясцовая суполка Арганізацыі беларускіх нацыяналістаў.4 Яшчэ адным сябрам вялейскай арганізацыі мог быць беларускі дзяяч Аляксандар Калодка, які, праўдападобна, і схаваўся пад псеўданімам "Алесь Маханеўскі".

Зноў жа ў архіве ўдалося выявіць яшчэ адзін цікавы дакумэнт — "Уласнаручныя паказаньні затрыманага Калачова" савецкім партызанам ад красавіка 1943 г. пра ягонае знаходжаньне ў Вялейскай турме, дзе яму давялося сядзець у адной камэры з А.Калодкам.

"На другі дзень майго знаходжаньня ў турме да нас у камэру быў пасаджаны міравы акружны судзьдзя Вялейскага Гэбіта, да гэтага начальнік Вялейскай паліцыі, юрыст, беларус, нацыяналіст, гр. Калодка Аляксандар Андрэевіч, — пісаў Калачоў. — Асоба аўтарытэтная і ўсёй беларускай інтэлігенцыяй паважаная. Зьяўляецца нам[есьнікам] старшыні Белар[ускай] Нар[однай] Самапомачы Вялейскага Гэбіту. Пасьля некалькіх дзён сумеснага знаходжаньня ў турме мы сталі сьмела выказваць свае палітычныя погляды на розныяпытаньні. З гутаркі высьветлілася, што ў Кал[одкі] было кола сваіх знаёмыхбеларусаў-інтэлігентаў, начальнік Вялейскага раёну, начальнік Вялейскай паліцыі і шэраг іншых вядомых асобаў. Пры сустрэчах паміж сабой яны выказвалі незадавальненьне палітыкай немцаў у Беларусі, што дагэтуль няма і не прадастаўлена самастойнасьць Беларусі, што няма беларускага ўраду, што шалее нечуваны тэрор, што толькі зь беларусаў-сялянаў бяруць, а даваць нічога не даюць. Што яму вядомы даклад нач-ка тайнай паліцыі Вялейскага Гэбіта пры СД (был[ога] расейскага палкоўніка Перамыкіна) шэфу Гэстапа пры тое, што ўсім беларусам верыць нельга, што ўсе беларусы зьяўляюцца памочнікамі партызанаў і г. д., і што яму, Перамыкіну, вядома, што на яго рыхтуюць замах і ачольвае гэтую змову той жа Калодка. Гэта ўсё ён мне перадаў на словах, што калі я выйду раней з турмы, каб я перадаў яго сябру і таварышу [нечытэльна] Вялейскай [нечытэльна] — Крэсла. Я гэта зрабіў. Мне таксама [нечытэльна] паведамілі, што [нечытэльна] Вялейскага р-ну расстраляны, а за Калодку хадайнічае Менск, рэдакцыя газэты "Беларускі Голас" і г. д.

На маё наўпроставае пытаньне да Калодкі пра тое, што ён, адукаваны, культурны чалавек, і да гэтага часу не разабраўся ў палітыцы фашызму і не абраў правільны палітычны шлях — гэта савецкая ўлада і камуністычная партыя, ён мне адказаў, што ён падзяляе погляды і палітыку Сав[ецкага] ўраду, алеяму не падабаліся два пытаньні з боку Савецк[ай] Улады: гэта вывазы народаў НКВД і сьпешная калектывізацыя. Пры далейшых размовах ён шкадаваў прасвае палітычныя памылкі, цалкам пагадзіўся са мной, назваў сябе ідыётам,што

ён патрапіў у турму — у яго была магчымасьць ўцякчы. Я зь ім разьвітаўся па-сяброўску і [мы] далі слова на далейшае, калі яго не расстраляюць, сустракацца таварышамі".5
СЁ

Спасылкі:
1 Фёдар Маркаў (1913—1958), герой Савецкага Саюзу. З 1944 г. быў намесьнікам старшыніВялейскага аблвыканкаму.
2 НА РБ, ф. 3500, в.2, спр.46, арк. 79, 80.
3 Маханеўскі А. Вялейская турма // Бацькаўшчына (Мюнхэн), 1948, 25 сакавіка.
4 За й супраць // Бацькаўшчына, 1948, 18 красавіка.
5 НА РБ, ф. 3601, в.1, спр. 21, арк. 31адв.-33. Рукапіс. Пераклад з расейскай.

## Партызанскі аддзел лейтэнанта Бандыка. 1944 год

Летам 1944 г. у Аўгустоўскай пушчы ўтварыўся беларускі партызанскі аддзел лейтэнанта Бандыка, які налічваў каля 150 байцоў. Лёс гэтага аддзелу невядомы.
Пра ягонага камандзіра Антона Бандыка вядома ня шмат. Ён нарадзіўся ў 1913 годзе. Падчас Другой сусьветнай вайны ўключыўся ў беларускі вайсковырух. У верасьні 1942 г. Бандык скончыў другі афіцэрскі курс Беларускай Самаахovы ў Менску і застаўся ў сталіцы служыць зьвязовым (НА РБ, ф.3500, в.2, спр.46, арк..201). Калі ў пачатку 1943 г. пачаў стварацца 13-ты беларускі паліцыйны батальён пры СД, Бандык стаў яго афіцэрам. Служыў спачатку ў Менску, а пасьля — у Вялейцы, камандаваў ротай у ранзе лейтэнанта. Ф.Кушаль прыгадвае канфлікт,які ўзьнік у Вялейцы паміж Бандыкам, падтрыманым афіцэрамі-беларусамі, і немцам-камандзірам батальёну. Залагодзіць яго здолеў толькі прэзыдэнтБЦР Р.Астроўскі (Кушаль Ф. Спробы стварэньня беларускага войска. Менск, 1999,б.66-67).
Летам 1944 г. падчас эвакуацыі зь Беларусі, роты 13-га батальёну павінны былі сабрацца каля Аўгустова. Менавіта там, нібыта, зноўку з-за канфлікту зь нямецкім камандаваньнем, лейтэнант Бандык аддаў загад сваёй роце сыходзіць у лес. Разам зь ім пайшлі 150 добра ўзброеных жаўнераў і 3 афіцэры (Іваніцкі, Мохарт і Дрозд). Вядома, што на наступны дзень лейтэнанты Мохарт і Дроздвыйшлі зь лесу і далучыліся да сваіх сем'яў, якія адступалі на Захад. Аднак былі распазнаныя і расстраляныя немцамі (Спробы стварэньня беларускага войска, б.68; Акула К. Змагарныя дарогі. Менск, 1994, б.33).
Пра тое, што аддзел Бандыка ня думаў далучацца да савецкай партызанкі,а меў на мэце арганізацыю беларускага партызанскага аддзелу, фактычна, сьведчыць Кушаль: "Афіцэры, якія пакінулі батальён у Аўгустове, ня мелі намеру здрадзіць" (Спробы стварэньня беларускага войска, б.68). Варта зазначыць, што 13-ты батальён браў удзел у баях супраць партызанаў у Беларусі, меў немалы вайсковы досьвед. Таму, калі партызаны Антона Бандыка летам-восеньню 1944 г. разгарнулі антысавецкую барацьбу, дык, верагодна, прынесьлі бальшавікам немалыя клопаты.
У справаздачы з акцыі "Бура" акругі "Ольхы" аддзела 1-га палка ўланаў крэхавэцкіх Арміі Краёвай ад 25 лютага 1945 г., праўдападобна, згадваецца ротаБандыка. У дакумэнце паведамляецца пра пераход 14 ліпеня 1944 г. на бок польскіх партызанаў каля Аўгустова роты 11-га беларускага батальёну СС (4 афіцэры, 19 падафіцэраў, 90 шэрагоўцаў). Тут відавочная памылка, бо вядзецца якраз пра 13-ты батальён. Польскія партызаны ў сваёй справаздачы пасьпяшылі прыпісаць на сваю карысьць заслугі ў пераходзе ў лес беларускага аддзелу (нібыта, спрацавалі ўлёткі АК). Але ў гэта слаба верыцца — байцы Бандыка, відаць, натрапілі на акоўцаў ужо ў лесе. З дакумэнта вынікае, што за аддзелам Бандыка ішла яшчэ адна рота, якая "заблукала ў лесе", і яе не знайшоў патруль АК.

Палякі не пакінулі асобную беларускую вайсковую адзінку, а сфармавалі на яе аснове атрад “Шчапа” пад камандаваньнем падпаручніка Станіслава Кота (складаўся з 60 чалавек і дзеяў на прамежку Саенэк — Аўгустоў, Балінка — Кольніца — Аўгустоў). Яшчэ да таго акоўцы вельмі апэратыўна праверылі нацыянальны склад бандыкаўцаў і высьветлілі, што сярод іх 60% — беларусы, 40% — палякі. Нам падаецца, што гэты падзел рабіўся хутчэй па канфэсійнай прыналежнасьці байцоў і большасьць гэтых “палякаў” былі каталікамі. Ужо 15 ліпеня атрад “Шчапа” раззброіў пастарунак чыгуначнай варты на станцыі Саенэк, здабыўшы зброю, боепрыпасы і 7 палонных. У той жа дзень партызаны зрабілі засаду на шашы Саенэк — Ліпск, у выніку якой зьнішчылі 4 нямецкіх аўтамашыны, і адыйшлі на базу бяз страт. Па разьвязаньні АК усе партызаны гэтага атрада былі дэмабілізаваныя і распушчаныя па хатах.. (A.Suchcitz. Dzieje 1 pulku ulanow krechowieckich. 1941 — 1947. Londyn, 2002. S. 295-297)
Са згаданай справаздачы ўсё ж не ясны лёс большасьці беларускіх жаўнераў. Калі дапусьціць, што ў атрадзе “Шчапа” сярод 60 партызанаў усе былі бандыкаўцамі (а гэта малаверагодна, падпаручніка Кота не маглі прызначыцьу аддзел аднаго), дык застаецца невядомым лёс яшчэ паўсотні чалавек і самога Бандыка. Альбо іх раскідалі па іншых аддзелах, альбо некаторыя на наступны дзень вярнуліся, як Мохарт і Дрозд, альбо арганізаваным парадкам частка роты накіравалася на ўсход, на беларускія землі. У апошнім выпадку сьлед групы мог застацца ў апэратыўных дакумэнтах дзяржбясьпекі.
Сяргей Ёрш, Юры Грыбоўскі

**Выкрыцьцё антысавецкай групы капітана Чугунова**

Летам 1944 г. вайсковая пракуратура Беларускай вайсковай акругі выкрылападпольную антысавецкую афіцэрскую групу, якая на гэты момант дзейнічала ўжо восем месяцаў. Паводле “Агляду пра судзімасьці афіцэрскага складу па БВА за III квартал і кастрычнік месяц 1944 году”, падрыхтаванага ў лістападзе 1944-га старшым памочнікам ваеннага пракурора БВА падпалкоўнікам юстыцыі Ўласавым, група дзейнічала ў 7-ым гвардзейскім мэханізаваным корпусе, які дысьлякаваўся ва Ўсх. Беларусі. Сябрамі яе былі, прынамсі, тры чалавекі: “нач. ПФС брыгады” старшы лейтэнант Іпатаў, намесьнік камандзіра батальёну па шыхтавойчастцы капітан Чугуноў і малодшы лейтэнант Сінюкоў. Толькі Чугуноў быў сябрам камуністычнай партыі, астатнія — беспартыйныя. Са сьнежня 1943 г. янывыдавалі “нелегальны часопіс “Пшено” антысавецкага кірунку”, нібыта, таксама займаліся антысавецкай прапагандай.
У чэрвені 1944 г. адбылося штосьці незразумелае. Сябры групы вырабілі нейкія пячаткі і штампы, зрабілі дакумэнты, з дапамогай якіх Чугуноў 11 чэрвеня “дэзэртыраваў”. Альбо ён адчуў, што ім зацікавіліся асабісты, і ўцякаў адмагчымага арышту, альбо шукаў кантакты з антысавецкім падпольлем. Два месяцы шукалі капітана Чугунова, пакуль урэшце не схапілі 12 жніўня. Праўдападобна, на допытах ён назваў сяброў. А ўжо 15 верасьня ўсе тры афіцэры былі пазбаўленыя вайсковых рангаў і асуджаныя на 10 гадоў зьняволеньня кожны.
“Такім чынам на працягу 8 месяцаў антысавецкая група мела магчымасьцьправодзіць сваю варожую працу, ня будучы выкрытай”, — пісаў падпалкоўнік Уласаў.* Многія расейскія, беларускія ды ўкраінскія антысавецкія арганізацыі ў 1944-1945 гг. спадзяваліся на магчымую “рэвалюцыю ў Чырвонай Арміі”. Спадзяваліся дарма, бо ўсе армейскія “вальнадумцы” у афіцэрскім асяродзьдзі альбо знаходзіліся пад кантролем савецкіх спэцслужбаў, альбо арыштоўваліся на самым пачатку сваёй дзейнасьці. Нешматлікія “рэвалюцыйныявыступленьні” хутка падаўляліся “Сьмершам” і войскамі НКВД, а “паўстанцы” у лепшым выпадку пасьпявалі сыйсьці ў лес.
Аляксей Кавалёў, г. Менск

Спасылка:

*НА РБ, ф.4, в.37, спр.157, арк.113. Машынапіс.

## Арышт у Менску актывіста БНП. 1945 год

У сьценаграме аднаго са сходаў партактыву Менскага гаркаму КП(б)Б ад 1945году ёсьць тэкст выступу сакратара партарганізацыі НКГБ Марозкіна. Ён, у прыватнасьці, паведаміў камуністам пра выкрыцьцё у сталіцы "небясьпечнага злачынцы", які аказаўся сябрам Беларускай незалежніцкай партыі.

Прозьвішча гэтага чалавека Марозкін не называе, пазначыўшы яго літарай "В". "Некаторы час таму назад да аднаго савецкага грамадзяніна, на нацыянальнасьці беларус[а], папрасіўся на кватэру нехта [...] у форме вайскоўца", — пачаў ён свой расповяд. Неўзабаве гаспадар кватэры заўважыў дзіўныя паводзіны свайго кватаранта: "вайсковец, а ня мае пэўных заняткаў". Ён паведаміў пра свае падазрэньні ў НКГБ.

"Дзякуючы пільнасьці гэтага грамадзяніна і добра праведзенай праверкі "В", было ўстаноўлена, што "В" у гады нямецкай акупацыі з 1942 г. зьяўлўсяактыўным сябрам нямецка-беларускай нацысцкай арганізацыі, т. зв. "БНП", па заданьням якой праводзіў вярбовачную работу і ўцягнуў у "БНП" некалькі чалавек. Пасьля, як сябра гэтай арганізацыі быў залічаны ў адзін з батальёнаў т. зв. "БКА" на камандную пасаду. Удзельнічаў у баях супраць сыноў беларускага народу — беларускіх партызанаў", — гаварыў таварыш Марозкін.

Летам 1944 г. згаданы сябра БНП дзесьці "з-пад Менску" адступіў у Польшчу, дзе быў накіраваны ў распараджэньне варшаўскага Беларускага камітэту. Тады ж ён патрапіў у разьведвальную школу ва Ўсходняй Прусіі (праўдападобна — Дальвіц), якой кіравалі і немцы, і "ўпаўнаважаныя "БНП". Паводле Марозкіна, "школа рыхтавала тэрарыстаў, дывэрсантаў і яны ж павінны былі быць арганізатарамі і кіраўнікамі падпольных ячэек "БНП". "В" быў закінутына тэрыторыю Беларусі, але, як вынікае з гэтага дакумэнту, неўзабаве быў арыштаваны. (Дзяржаўны архіў Менскай вобласьці, ф. 69-П, в.1, спр. 28, арк. 165, 166).

На жаль, выкладзеная вышэй інфармацыя не дае магчымасьці ўстанавіць прозьвішча арыштаванага сябра Беларускай незалежніцкай партыі.

Падрыхтаваў Людвіг Цыбульскі, г. Менск

## Дывэрсіі на лініях сувязі ў Беларусі ў лістападзе 1945 году

Восеньню 1945 году ў БССР пачасьціліся выпадкі пашкоджаньняў лініяў сувязі невядомымі асобамі. У верасьні-кастрычніку паміж вёскамі Пеліпы і Земцы ў Шаркоўшчынскім раёне Полацкай вобласьці былі зафіксаваныя 4 выпадкі зьняцьця дратоў з унутраёнай тэлефоннай лініі. 1-2 лістапада 1945-га падобная дывэрсія адбылася ў Папоўскім сельсавеце (Шаркоўшчына), дзе невядомыя зьнялі тры пралёты дроту ў трох месцах лініі, а паміж вёскамі Курыловічы і Земцы, каля Гарадзішча, разьбілі ізалятары.

14 лістапада 1945 г. на ўчастку Ашмяны — Меднікі (3 км ад Меднікаў) былі сьпілаваныя два слупы і зьняты дрот. У выніку дывэрсіі, было парушана дзеяньне магістральнай тэлеграфна-тэлефоннай сувязі Менск — Горадня, Масква — Вільня, Масква — Кэнігзбэрг. Праз пяць дзён, 19 лістапада 1945 г., на ўчастку Фаніпаль — Дзяржынск на 590 слупе быў зроблены наўмысны накід тонкага чорнага дроту, які быў выяўлены пасьля доўгіх пошукаў. Некалькі гадзінаў не працаваў магістральны ланцуг Менск — Берасьце — Варшава — Бэрлін. А менавіта праз гэтыя тэлефонныя і тэлеграфныя каналы Масква трымала сувязь са штабамі акупацыйных войскаў у Польшчы і Нямеччыне.

Упаўнаважаны наркама сувязі СССР пры СНК БССР Краўчук пісаў 4 сьнежня 1945-га ў лісьце да сакратара ЦК КП(б)Б Маліна і наркама ўнутраных спраў БССРБельчанкі: "Улічваючы, што ўсе сродкі сувязі, асабліва ў цяперашні час, у сувязі з правядзеньнем падрыхтоўкі і правядзеньня выбараў у Вярхоўны Савет Саюза ССР неабходна ўзмоцніць барацьбу са зламысьнікамі і ўзмацніць назіраньне за лініямі сувязі з прыцягненьнем на гэты час мясцовага партыйнага, савецкага і камсамольскага актыву" (НА РБ, ф.4, в.18, спр.50, арк.22).
Падрыхтаваў Людвіг Цыбульскі

**Падпольная беларуская арганізацыя дзеяла 10 гадоў**

У кнізе INFORMATOR o nielegalnych antypanstwowych organizacjach i bandach zbrojnych dzialajacych w Polsce Ludowej w latach 1944-1956 (Ministerstwo Spraw Wewnetrznych, Biuro"C", Tajne!, Warszawa, 1964), перавыдадзенай у Любліне ў 1993 годзе, ёсьць згадка пра невядомую нам дагэтуль беларускую падпольную арганізацыю — "Bialoruscy Nacionalisci" ("Беларусы Нацыяналісты"). Паведамляецца, што арганізацыя мела разьведвальны характар і дзейнічала ў Быдгашчы, Лодзі і Варшаве ў 1944 — 1954 гадах. Гэта значыць 10 гадоў! "Беларусы Нацыяналісты" налічвалі каля 25 чалавек. У кнізе называюцца і некаторыя яе кіраўнікі: Завадзкі (ён жа Яворскі – Zawadski vel Jaworski), Васіль Макарэвіч (Bazyli Makarewicz) і Дзіянісі Зыбайла (Dionizy Zybajlo) (б. 181).
Колькі слоў пра самую кнігу. Яна была выпушчаная пад грыфам "сакрэтна"ў якасьці навучальнага дапаможніка для супрацоўнікаў польскай дзяржбясьпекі. Пераважная частка кнігі прысьвечаная акаўскім, эндэкаўскім і іншым польскім антысавецкім групоўкам, а таксама ўкраінскім, гітляроўскім і клерыкальным арганізацыям, бандам бяз вызначанай ідэалягічнай афарбоўкі, якія дзейнічалі на тэрыторыі ПНР у пэрыяд з 1944-га да 1956 г. Толькі адна арганізацыя мае відавочна беларускую арыэнтацыю — гэта згаданыя вышэй"Беларусы Нацыяналісты" (раздзел "Маладзёжныя арганізацыі – Organizacje mlodziozowe).
Інфармацыя пра гэтую нелегальную беларускую арганізацыю была зьмешчаная і ў бюлетэні Instytuta Pamieci Narodowej: http://www.ipn.gov.pl/biuletyn/3/biuletyn3_34.html Там пазначана, што яна дзейнічала ў 1945 — 1954 гадах.
Алесь Раманюк

## РЭЦЭНЗІІ

### Момант ісьціны

*Супрацьстаяньне. Дакумэнтальны фільм АТН. Аўтары — Ксенія Бахарава,Ігар Валахановіч. Працягласьць — 20 хвілін. У арыгінале — па-расейску. Прэм’ера — БТ, 28 чэрвеня 2004 г. (паўторны паказ — 28 верасьня 2004 г.).*

Гэты фільм прэтэндуе на тое, каб стаць сэнсацыяй айчыннай дакумэнталістыкі 2004 году. Пакуль беларускія незалежнікі на працягу апошніх гадоў безпасьпяхова спрабавалі зрабіць дакумэнтальны фільм пра паваенны Беларускі Супраціў, праект рэалізавала дзяржава. Зразумела, без “гура-патрыятызму”, як робяць прыбалты, але і без старых савецкіх ідэалягічных штампаў,як дагэтуль было ў нас. Факты — сур’ёзная рэч. Тысячы патрыётаў змагаліся за незалежную беларускую дзяржаву супраць савецкага панаваньня, таму для Масквы яны былі “сэпаратыстамі”, “здраднікамі”, “бандытамі”. З 1991 г. існуе дзяржава Рэспубліка Беларусь, якая, аднак, упарта ня хоча разьвітвацца з савецкай міталёгіяй ды не прызнае заслугаў людзей, якія ваявалі заяе незалежнасьць. Сытуацыя абсурдная. Рана ці позна, але ўлады РБ вымушаныя будуць даць санкцыю на аб’ектыўнае адлюстраваньне, у тым ліку і ў электронных СМІ, змаганьня беларускага вызвольнага руху ў XX стагодзьдзі. Ёсьць, праўда, яшчэ праверана дзесяцігодзьдзямі варыянт замоўчваньня, але ў рэаліях сёньняшняга сьвету гэта будзе адназначна пройгрышны ход.

Фільм “Супрацьстаяньне”, як пробны шар. Ягоная місія, на першы погляд, не зусім зразумелая. Зьдзівіць беларускага гледача сэнсацыйнымі фактамі пра антысавецкую барацьбу аж да 1955 году? Паспрабаваць аб’ектыўна разабрацца ў складаным пасьянсе палітычных гульняў Другой сусьветнай вайны,па розныя бакі якой апынуліся беларусы? А можа зрабіць уцечку інфармацыі? Асабіста мне імпануе апошняя вэрсія, бо столькі інфармацыі, дакумэнтаўі фотаматэрыялаў пра беларускі антысавецкі ўзброены супраціў не абнародвалася за ўсю пасьляваенную гісторыю. Відаць, хаваць ад грамадзтва архіўныя матэрыялы пра “невядомую вайну XX стагодзьдзя” надалей ужо немагчыма ды і няма сэнсу. Але, здымаючы пячаткі з тайных справаў, дзяржбясьпека вырашыла пакінуць за сабой ролю манапаліста і першапраходца. У выніку,выйшла кніга супрацоўніка КДБ Ігара Валахановіча “Антисоветское подполье на территории Беларуси в 1944-1953 гг.” (Менск: БДУ, 2002), а цяпер, праўдападобна, менавіта спэцслужба выступіла ініцыятарам стварэньня дакумэнтальнага фільма “Супрацьстаянь-не”.

Агучваючы раней прыхава-ную інфармацыю, КДБ ня мог яе папярэдне не адфільтраваць. Можа таму фільм выглядае сьпеш-на і неахайна скампанаваным, асцэнар — прымітыўным. У падзеях, якія асьвятляліся ў “Супраць-стаяньні”, была маса цікавых сюжэтных ліній, якія на жаль не былі скарыстаныя. Манатоннае пералічэньне Валахановічам перад тэлекамэрай закінутых у БССРдэсантных групаў “Дальвіца” ніяк нельга параўнаць з расповядам пра лёсы некаторых герояў фільма (тых жа Родзькі, Гелды, Барысіка). А чаму б не згадаць, што ў канцы 1944 г. група сябра БНП Шпакава аказалася ўцягнуная ў буйнуюрадыёгульню савецкай разьведкі зь нямецкімі разьведвальнымі органамі пад назвай “Бярэзіна”? На справе ж атрымалася, што аўтары фільма дапусьцілі некалькі памылак. Напрыклад, Усевалад Кароль з Баранавічаў ніколі ня быў у Дальвіцы — летам 1944 г. ён не выяжджаў зь Беларусі. Таму ў верасьні 1944 г.у раёне Смаргоні дэсантаваўся іншы Кароль. У “Супрацьстаяньні” нічога не было сказана пра лёс Міхала Вітушкі, затое былі паказаныя здымкі чалавека, крыху падобнага на яго (фота да арышту і ў зьняволеньні). Навошта гэтабыло зроблена — не зразумела.

“Нягледзячы на сваю разрозьненасьць, усе кірункі антысавецкага падпольля былі адзіныя ў адным — імкненьні да новай дзяржаўнай палітычнай перабудовы. Ідэя пабудовы беларускай

незалежнай дзяржавы прысутнічала ўпраграмных дакумэнтах практычна ўсіх падпольных арганізацыяў і групаў.... У выніку гэтага супрацьстаяньня галоўная мэта дзяржаўнай палітычнайперабудовы не была дасягнутая”, — такімі словамі заканчвала свой фільмК. Бахарава.
Нягледзячы на рэкляму, дакумэнтальны фільм “Супрацьстаяньне”, відаць, пабачыла няшмат людзей (прычына — нязручны час паказу). Для тых жа, хто зь ім азнаёміўся, фільм стаўся сапраўдным момантам ісьціны. А таксама магчымасьцю зазірнуць у архіўныя зборы Камітэта дзяржаўнай бясьпекі Беларусі, якія сёньня адчыняюцца толькі ў выключных выпадках.
Сяргей Ёрш

P.S. 25 кастрычніка 2004 г. БТ паказала працяг фільма “Супрацьстаяньне” К. Бахаравай, прысьвечаны польскаму паваеннаму антысавецкаму падпольлю і партызанцы на тэрыторыі Заходняй Беларусі. На гэты раз браліся інтэрвію ў вэтэранаў савецкай дзяржбясьпекі — удзельнікаў барацьбы з “бандытызмам”. Аднак ніякіх сэнсацыйных зьвестак агучана не было. Наступная сэрыя, якая выйшла на БТ 20 сьнежня (паўтор - 21 сьнежня), прысьвечаная паваеннаму падпольлю АУН на тэрыторыі БССР.

## Падагульненьне зробленага

*Супрун В. Штрыхі з успамінаў. Слонім, 2003, 130 б., іл.*

На жаль, вельмі рэдка мы становімся сьведкамі выхаду з друку ўспамінаўудзельнікаў Беларускага Рэзыстансу. Яшчэ больш сумна тое, што і ў шуфлядах не багата ляжыць ненадрукаваных рукапісаў. Толькі адзінкі зь яшчэ жывых камбатантаў, удзельнікаў моладзевага супраціву занатавалі падзеі свайго жыцьця і змаганьня, пакутаў у турмах і канцлягерох. Зь вялікімі цяжкасьцямі іх кніжкі друкуюцца і даходзяць да чытача. Праблема, аднак, не ў адсутнасьці попыту на такую літаратуру, а ў абыякавасьці беларускай дзяржавы да ўдзельнікаў змаганьня за яе незалежнасьць. А беларускія незалежныя інстытуцыі, грамадзкія арганізацыі альбо таксама абыякавыя да гэтага, альбо проста ня маюць сродкаў на выданьне.
І тым не менш, час ад часу бачаць сьвет кнігі ўспамінаў вэтэранаў нацыянальнага руху. Яны часта бываюць схэматычнымі, даюць агульныя зьвесткі і мала цікавых дэталяў, партрэтаў патрыётаў, зь якімі даводзілася сустракацца. Кніга Супруна ў гэтых адносінах напісаная цікава і вобразна, хоць іне заўсёды роўна вытрыманы стыль. Але сам аўтар у прадмове папярэдзіў, што гэта “чарнавыя нататкі”, якія “не прызначаліся да друку”. Васіль Супрун меркаваў, што яшчэ будзе час для працы над вялікімі ўспамінамі ды сабранымі навуковымі матэрыяламі. Жыцьцё ж вырашыла інакш: здароўе, моцна падарванае ў сталінскіх турмах і канцлягерох, не давала магчымасьці зьдзейсьніць шмат што з задуманага. У гэтай сытуацыі Супрун прыняў слушнае рашэньне, калі вырашыў надрукаваць чарнавы варыянт успамінаў. У гэтым яму дапамагло Слонімскае маладзёвае аб’яднаньне “Ветразь”.
Успаміны Васіля Супруна ахопліваюць пэрыяд ад часу нямецкай акупацыі, калі ён атрымліваў адукацыю ў беларускіх навучальных установах у Слоніме ды пазнаёміўся з некаторымі мясцовымі дзяячамі нацыянальнага руху, да аднаўленьня незалежнасьці Беларусі ў 1991 г. Яшчэ некалькі разьдзелаў прысьвечаныя цяжкаму шляху да чытача паэтычных твораў Васіля Супруна, якіяён пачаў пісаць і друкаваць яшчэ ў гады вайны, яго краязнаўчым нарысам і, нарэшце, праблеме рэабілітацыі. Дагэтуль Васіль Супрун, у 1946—1947 гг. кіраўнік падпольнай маладзёвай арганізацыі “Чайка”, а пазьней і Цэнтру беларускага вызваленчага руху, не рэабілітаваны беларускай дзяржавай!..

Аўтар падрабязна спыняецца на прычынах, якія падштурхнулі яго да арганізацыі беларускага незалежніцкага падпольля, малюе невясёлыя карціны жыцьця ў Заходняй Беларусі ў першыя пасьляваенныя гады. Зноўку шалее тэрор НКВД, распачынаецца калектывізацыя, людзей сем'ямі высылаюць у Расею і Казахстан, а на моладзь ладзяцца аблавы — для высылкі на прымусовыя працы. Можна было прамаўчаць, ціха адсядзецца, дачакацца лепшых часоў, але патрыёты маўчаць не схацелі! Супрун быў арганізатарам легендарнай арганізацыі "Чайка" з цэнтрам у Слоніме, якая праіснавала каля году і была разгромленая органамі савецкай дзяржбясьпекі. Многія яе сябры павандравалі ў савецкія турмы і канцлягеры. Адпакутаваў за свой патрыятызм і Супрун. У канцлягерах ён завочна, праз тайнае ліставаньне, пазнаёміўся з паэткай Ларысай Геніюш. Убачыцца ж ім давялося толькі пасьля вызваленьня, у Зэльве...
У Слонім Супрун вярнуўся ў сьнежні 1956 году і адразу ж патрапіў пад строгі нагляд спэцслужбаў. "На ўсіх кватэрах, дзе давялося жыць, устанаўліваліся падслухоўваючыя ўстройствы (аб чым стала вядома пазьней)", — чытаему ўспамінах. Не давалі працаваць па спэцыяльнасьці, не вярталі канфіскаваныя дакумэнты, якія сьведчылі пра атрыманую да зьняволеньня адукацыю, фактычна, выжывалі зь Беларусі. Але В.Супрун вытрымаў усе гэтыя зьдзекі, упарта зноў і зноў здабываў навуку, у вольны час захапляўся краязнаўствам і архэалёгіяй. Ягоныя навуковыя публікацыі зьявіліся ў друку ўжо ў 1960-ыя гады. З часам Супрун пачаў рэгулярна друкаваць краязнаўчыя артыкулы ў мясцовым друку. Удалося выдаць і некалькі кніжак. Іх сьпіс і абставіны, пры якіх яны ствараліся і як ішлі да чытача, аўтар падае ў кнізе. Тым самым падагульняе зробленае. Мы ж, у сваю чаргу, спадзяемся, што гэтая кніга Васіля Супруна не апошняя. Што калісьці ўдасца выдаць ягоныя вершы, успаміны і дасьледаваньні асобным, салідным выданьнем.
Андрэй Турук, г. Слонім

**Найперш трэба здабыць незалежнасьць**

*Пазьняк З. Гутаркі з Антонам Шукелойцям. Варшава — Вільня, 2003. — 144 б., іл.*

На жаль, пераважная большасьць беларускіх дзеячоў, якія па вайне апынуліся на Захадзе, не пакінулі ўспамінаў. Пісалі пра сябе і сваю дзейнасьць нямногія, пераважна людзі, якія не адыгрывалі першых роляў у беларускай палітыцы часоў Другой сусьветнай вайны. Затое прамаўчалі Радаслаў Астроўскі, Ян Ермачэнка, Мікола Шчорс. Антон Шукелойць ня быў у тыя часы сяродлідэраў нацыянальнага руху, але ведаў многіх і многае. Даўно мусіў напісаць успаміны, але, па-за рэдкімі публікацыямі ў друку, нічога з перажытага не занатаваў. Дапамог Зянон Пазьняк, які з запісаных на дыктафон размоваў з 89-гадовым Шукелойцем, склаў добрую кніжку.
Антон Шукелойць распавядае ня толькі пра сябе і сваё жыцьцё, але падае даволі шмат фактаў пра сваіх сяброў, знаёмых, пра беларускія арганізацыі, якія існавалі ў даваеннай Польшчы, пра міжнацыянальныя адносіны. Ён згадвае шмат цікавых дэталяў, якія зьяўляюцца сапраўдным скарбам для дасьледчыкаў. Напрыклад, дагэтуль ніхто ня згадваў пра прыём, ладжаны ў 1941 г. у Менску Юльянам Саковічам у гонар ксяндза Вінцэнта Гадлеўскага, з нагоды прыезду апошняга з Бэрліну. (Некаторыя дасьледчыкі неапраўдана запісалі Саковіча ў "праваслаўныя экстрэмісты".). Шукелойць ня мог не запомніць той падзеі, бо менавіта тады яго хацеў застрэліць Фабіян Акінчыц...
Здавалася, што А. Шукелойць, нарэшце, прыадкрые завесу тайны хаця б над такой справай, як забойства згаданага кіраўніка беларускіх нацыянал-сацыялістаў Акінчыца.* Прынамсі, у сваіх публікацыях у пачатку 90-х ён дазіраваў інфармацыю, у некаторых выпадках шматзначна недагаворваў (прынамсі, так нам падавалася). Даўно ўжо прыйшоў час сказаць

усю праўду, расставіць акцэнты. Але гэтага вэтэран нацыянальнага руху не зрабіў. І цяжка сказаць,па якой прычыне.** Можа таму, што сам мала абазнаны ў беларускіх падпольных справах часоў вайны? На нелегальную нараду ў ліпені 1941 г. Шукелойць трапіўвыпадкова, прыйшоў ва ўправу, а Антон Адамовіч яго адразу запрасіў на нелегальны сход. Вось вам і ўся канспірацыя...

Нічога новага няма ў расповядзе Шукелойця пра Беларускую Незалежніцкую Партыю. Чытачу цікава было б даведацца, чым жа займаліся беларускія падпольшчыкі (пра падрыхтоўчы этап да стварэньня партыі ў 1941-42 гг. ён распавёў падрабязна)? Інфармацыя пра гэта ў кнізе адсутнічае. Ніякай канкрэтыкі!Можна падумаць, што дзейнасьці ніякай не было. Затое аўтар успамінаў неаднаразова згадвае "розных пісакаў", якія няправільна асьвятляюць гісторыю БНП. Закід, відаць, у наш бок. Але яшчэ пры падрыхтоўцы кнігі "Вяртаньне БНП. Асобы і дакумэнты Беларускай Незалежніцкай Партыі" ён не захацеў падзяліцца сваімі ўспамінамі, як, дарэчы, не паведаміў свае заўвагі і па яе прачытаньні. Шукелойць сьцьвярджае, што БНП "жыла доўгі час на Беларусі, з той групы (так званай "Дальвіц"), якую скінулі ў БССР і якая праіснавала да 1957 году" (б.. 59). І больш ні слова. Дагэтуль за дату спыненьня арганізаванага супрацівуБНП на Беларусі мы бралі дату, прапанаваную кіраўнікам Замежнага сэктару БНП Дзьмітры Касмовічам — канец 1956 г. Касмовіч у сваіх успамінах таксама не даваў падрабязнасьцяў — яны пісаліся, калі "халодная вайна" яшчэ не закончылася, таму гэта было апраўдана. Шукелойць жа, як адзін з апошніх абазнаных у справах БНП чалавек, мог бы прыадчыніць яшчэ адну таямніцу — пасьляваенны беларускі Супраціў. І зноў маўчанка! Затое колькі ўвагі надаецца Вільгэльму Кубэ, які лічыў беларусаў "тоже арыйцамі"! У свой час захапленьне некаторых беларускіх апазыцыйных лідэраў нямецкім гаўляйтэрам было на ўсе 100% выкарыстанае антыбеларускай прапагандай.***

Трэба адзначыць, што ў кнізе няшмат памылак. Адзначу некаторыя. ВацлаўПануцэвіч (Папуцэвіч) ніколі ня быў "Падлуцэвічам" (б. 31). Быў дзеяч БНП Аляксей Сянькевіч, а не Сінкевіч (б. 55). На б. 57 згадваецца Вячаслаў Родзька, хоць на б. 55 ён яшчэ быў Усеваладам. Але гэта дробязі, якія не псуюць агульнай карціны.

Хібай выданьня, на наш погляд, зьяўляюцца зьмешчаныя ў форме пытаньняўальбо меркаваньняў ацэнкі З. Пазьняка сёньняшніх падзеяў на Беларусі і розных палітычных сілаў. А камусьці з чытачоў можа падацца, што ў некаторых выпадках ён намагаецца скарыстаць кнігу для апраўданьня сваёй эміграцыі. Зрэшты, аўтар мае на гэта права. Затое вельмі дакладным і лягічным атрымалася "Пасьляслоўе". У ім Пазьняк, у прыватнасьці, піша: "Беларусы-адраджэнцы розных сьветапоглядаў, розных партыяў і накірункаў супрацоўнічалі пад акупацыямі між сабой, і працавалі ў адно, — дзеляволі і незалежнасьці Беларусі. Беларусь была для іх найвышэйшым. Іх аб'ядноўвала агульнае беларускае пераканаsuccessfulньне, разуменьне таго, што пад акупацыяй не існуе "сацыялістаў", "кансэрватараў" ці "дэмакратаў". Партыйныя дактрыны тут ня маюць значэньня, бо яны нерэальныя, неажыцьцяўляльныя, пакуль несвабодная, акупаваная Бацькаўшчына.

Найперш трэба здабыць незалежнасьць, павінна быць вольная Айчына і свая дзяржава. Толькі тады ўзьнікае сэнс у дэмакратыі і зьмест у партыйнайсыстэме".

Пазьняк гаворыць пра "сфальшаваны вобраз вайны" (яшчэ за саветамі), пра "цынічную мэтодыку прапагандысцкай вайны супраць беларускай нацыі", якая "атруціла галовы цэлым пакаленьням беларусаў". Спасылаючыся на выказваньні Ю. Туронка, Пазьняк разважае над праблемай калябарацыі ды прыходзіць да высновы, што калябарантамі былі маскоўскія камуністычныя стаўленікі ў Беларусі, якія зьнішчалі ўсё беларускае. Беларускія ж дзеячы"ня толькі палітычна супрацоўнічалі зь немцамі дзеля Беларусі, але адначасна і змагаліся зь імі, пра што сьведчыць стварэньне беларускага падпольля ("Незалежніцкай Партыі")". Гэтая думка З. Пазьняка вельмі слушная. Нажаль, многія дасьледчыкі ня ўлічваюць альбо не

даацэньваюць уплыў Беларускага Рэзыстансу на тагачасныя легальныя беларускія ўстановы і рашэньні, якія імі прымаліся.
“Дзейнасьць беларускіх адраджэнцаў за часы нямецка-фашыстоўскай акупацыі — гэта быў высокі і складаны ўзровень дзейнасьці. Іхняя справа была сапраўдным подзьвігам дзеля Беларусі. Шлях іхны ўсланы ахвярамі і адзначаны героямі”, — піша Пазьняк.
На наш погляд, варта было б усё ж адзначыць, што да “адраджэнцаў” залічваюцца ня ўсе дзеячы, што працавалі ў грамадзянскай адміністрацыі ці служылі ў вайсковых і паліцыйных фармацыях. Праўдападобна, аўтар мае на ўвазе заслужаных беларускіх патрыётаў і моладзь, якія пераважна мелі сувязь з беларускім нацыянальным падпольлем ды працавалі на карысьць Бацькаўшчыны і народу. Бо, на жаль, ва ўсе часы хапае розных кар’ерыстаў, прыстасаванцаў, агентаў, здраднікаў, злачынцаў, сьвядомых калябарантаў. Некаторыя зь іх нават дапамагалі нацыстам і бальшавікам нішчыць дзеячоў беларускага нацыянальнага Супраціву.
Сяргей Ёрш

Спасылкі:
*Адну з вэрсіяў забойства Ф. Акінчыца мы друкавалі ў № 1/2004 “БР”. — Заўвага рэдакцыі.
**У Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь захоўваецца расьпіска А. Шукелойця аб згодзе супрацоўнічаць з разьведкай савецкіх партызанаў. На жаль, Шукелойць так і не высьветліў абставінаў зьяўленьня гэтага дакумэнту і няведама, як яго будуць трактаваць будучыя дасьледчыкі Беларускага Рэзыстансу.
*** Ня ўсе дзеячы беларускай эміграцыі ўспрымалі Кубэ, як станоўчую асобу ў нашай гісторыі. “Кажуць, што ён [Кубэ] па-беларуску размаўляў і пісаў вершы. Я пра гэта ня ведаю. Але ведаю дакладна, што Кубэ — добрае паскудства!” — гаварыў паэт Міхась Кавыль (Літаратура і мастацтва, 1995, 30 чэрвеня).

**ЗГАДКІ**

**МІХАСЬ НАЎМОВІЧ**
1922 — 2004)
У Францыі памёр вядомы беларускі эміграцыйны дзеяч, сябра Рады Беларускай Народнай Рэспублікі, мастак. Паходзіў з Наваградчыны. Быў бліжэйшым паплечнікам Янкі Філістовіча ў выданьні ў Парыжы ў другой палове 1940-х часопіса “Моладзь” ды ў наладжваньні арганізацыйнай працы беларускай моладзі ў Францыі. Недачакаўся колькі тыдняў да выхаду кнігі, прысьвечанайчасопісу “Моладзь”.
Сьветлая памяць!

**ГЕНАДЗЬ ПЯТКЕВІЧ**
Прыйшла да нас сумная вестка пра сьмерць вэтэрана беларускага вызвольнага руху Генадзя Пяткевіча.
Ён нарадзіўся ў 1925 г. у в. Новы Сьвержань на Стаўбцоўшчыне. Гэтая вёска далабеларускаму вызвольнаму руху шмат адданых і актыўных дзеячоў. З 1942 г. Г. Пяткевіч вучыўся ў Баранавіцкай мэдычынскай школе, выкладчыкі якой прывівалі сваім выхаванцам любоў да Бацькаўшчыны-Беларусі. Ён быў сябрам Саюзу беларускай моладзі, у 1944 г. кіраваў баранавіцкай гарадзкой арганізацыяйюнакоў. На Захад не адступаў — бальшавікоў не баяўся і ніякай віны за сабой не адчуваў. Працаваў настаўнікам, а пасьля быў прызваны ў Чырвоную Армію. Там яго і арыштавалі ў 1949 годзе, у Віньніцы. Абвінавачвалі ў навучаньніў “нацыяналістычнай прафашысцкай мэдыцынскай школе”, у сяброўстве ў СБМ. Пяткевіч атрымаў 25 гадоў пазбаўленьня волі з канфіскацыяй маёмасьці. Тэрмін адбываў у Казахстане, спэцлягеры ў Экібастузе, разам з Пятром Бітэлям. Пасьля сьмерці Сталіна тэрмін Пяткевіча быў зьменшаны да 10 гадоў, але яго яшчэ чакала жыцьцё на высылцы. У 1956 г. ён быў рэабілітаваны.
Генадзь Пяткевіч на працягу ўсяго свайго доўгага жыцьця заставаўся шчырым беларускім патрыётам, адданым незалежніцкім ідэалам. Браў актыўны ўдзел у палітычным жыцьці краіны, быў кіраўніком Стаўбцоўскай раённайарганізацыі Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Народная Грамада).
9 кастрычніка 2004 году Генадзь Пяткевіч памёр у сваёй роднай вёсцы Новы Сьвержань.
Сьветлая памяць!

**ВАСІЛЬ МЯДЗЕЛЕЦ**
20 сьнежня 2004 г. у Полацку памёр вэтэран беларускага вызвольнага руху Васіль Мядзелец.
У першыя паваенныя гады В. Мядзелец быў адным з кіраўнікоў падпольнай маладзёжнай арганізацыі “Саюз Беларускіх Патрыётаў” у Глыбокім. За сваю патрыятычную дзейнасьць у 1947 г. атрымаў ад савецкай улады сьмяротны прысуд, пазьней заменены на 25 гадоў зьняволеньня. На волю выйшаў у 1956 г. На працягуўсяго свайго жыцьця быў палымяным беларускім патрыётам.
Васіль Мядзелец паходзіў зь Мёршчыны, дзе нарадзіўся ў 1928 годзе.
Сьветлая памяць!

**КАСТУСЬ ШЫШЭЯ**
Напрыканцы мінулага году дайшла да нас вестка пра сьмерць у Вільні вэтэрана беларускага вызвольнага руху Кастуся Шышэі.
У час другой сусьветнай вайны К. Шышэя быў сябрам Беларускай Незалежніцкай Партыі, жаўнерам Наваградзкага беларускага эскадрону. У жніўні 1944 г. ёнуступіў у беларускі спэцыяльны батальён камандасаў “Дальвіц”, які ва Ўсходняй Прусіі рыхтаваўся да антысавецкай партызанскай барацьбы на Бацькаўшчыне. Пасьля дэсанту 17 лістапада 1944

г., Шышэя больш месяца знаходзіўся на нелегальным становішчы ў Беларусі, быў арыштаваны. Пасьля сталінскіх канцлягераў жыў у Вільні, напісаў успаміны. Памёр К. Шышэя 11 сьнежня 2004 г. і быў пахаваны на віленскіх Спаса-Эўфрасінеўскіх могілках. Сьветлая памяць!

**КАСТУСЬ РАМАНОВІЧ**

30 студзеня 2005 г. памёр вэтэран беларускага вызвольнага руху Кастусь Рамановіч.
Ён нарадзіўся 1 студзеня 1927 г. у вёсцы Лозкі на Наваградчыне ў сялянскай сям'і. Вучыцца давялося ў польскай школе, але адчуваў цягу да беларускага роднага слова, да сваёй літаратуры і гісторыі. Нарэшце, верыў, што калісьцібудзе незалежная беларуская дзяржава, пра што ня раз даводзілася спрачацца нават са сваякамі. Падчас другой сусьветнай вайны К. Рамановіч вучыўся ў Наваградзкай настаўніцкай сэмінарыі, быў сябрам СБМ. Вясной 1944 г. стаў курсантам афіцэрскай школы БКА ў Менску. На Захад вырашыў не адступаць — ня мог жыць без Беларусі. 13 сьнежня 1944 г., разам зь іншымі эсбээмаўцамі, быў арыштаваны НКВД у Наваградку, амаль два гады правёў у зьняволеньні. Увосень 1946 г. вярнуўся з Варкуты з цьвёрдым рашэньнем змагацца за Беларусь. Разам з сябрамі засноўвае падпольны "Саюз Вызваленьня Беларусі", які ў 1947г. быў разгромлены чэкістамі. Зноў Рамановіч апынуўся ў канцлягерах Расеі і Казахстану, на Бацькаўшчыну вярнуўся толькі ў 1956 г. Жыў у Пінску, браў удзел у грамадзка-палітычным жыцьці, вэтэранскай дэмакратычнай арганізацыі. У 2003 г. закончыў напісаньне сваіх успамінаў, якія, на жаль, ня выйшлідрукам пры яго жыцьці. Чытачы "БР" мелі магчымасьць азнаёміцца з урыўкам зь іх, які быў зьмешчаны ў першым нумары нашага часопіса.
Сьветлая памяць!

**ЮЗЭФА НАЙДЗЮК (БРЭЧКА)**

Са ЗША надыйшла сумная вестка — 19 лістапада 2004 г. ня стала вялікай беларускай патрыёткі Юзэфы Найдзюк (Брэчкі). За пару тыдняў рэдакцыя "БР" атрымала ад яе кнігу, якая доўгія месяцы вандравала да нас праз акіян. Фактычна, разам з гэтай бандэрольлю мы даведаліся і пра сьмерць спадарыні Юзэфы…
Яна нарадзілася 1 лютага 1927 г. у Мазурках у Ляхавіцкім павеце. Падчас вайны Юзэфа Брэчка вучылася ў баранавіцкай сярэдняй гандлёва-адміністрацыйнай школе, была актывісткай СБМ. Летам 1944 г. выехала зь Беларусі на эміграцыю, але не перарывала свайго змаганьня за вольную і незалежную Беларусь.У 1944-1945 гг. служыла ў беларускім батальёне парашутыстаў "Дальвіц" у Нямеччыне і Чэхіі. Летам 1945 г., перамагаючы перашкоды, здолела перабрацца з савецкай зоны акупацыі на Захад. Спачатку жыла ў Заходняй Нямеччыне, дзе скончыла беларускую гімназію імя Янкі Купалы, была актыўная ў скаўтынгу, у беларускім грамадзкім жыцьці. З 1956 г. Ю. Брэчка жыла ў ЗША, выйшла замуж за брата Язэпа Найдзюка Чэслава, нарадзіла двух дачок і сына.
Яшчэ пры жыцьці пра яе хадзіла шмат легендаў. У адной беларускай кніжцы, не называючы прозьвішча, аўтар распавядаў, як яна, радыстка дэсантнай групы, была параненая, але здолела вярнуцца зь Беларусі на Захад. Юзэфа Брэчка заўсёды казала, што на Беларусі не была ад лета 1944 г., і ніколі не ляцела туды з дэсантам. Праўда, яна ведала многіх з тых дэсантнікаў (хлопцаў і дзяўчатаў), што вярнуліся ў Беларусь, каб змагацца за яе незалежнасьць. У іх былі пераважна трагічныя лёсы.
Да сваіх апошніх дзён Юзэфа Найдзюк сачыла за падзеямі на Бацькаўшчыне, на свае грошы падпісвала беларускія школы на незалежныя выданьні, рабіла безьліч іншых добрых справаў. Мела шмат сяброў на Захадзе і на Бацькаўшчыне.
Пахавалі Юзэфу Найдзюк (Брэчку) на могільніку Forest Lawn Cemetery, Hollywood Hills, Pasadena, California. Няхай будзе лёгкай для яе чужая зямля. Сьветлая памяць!
Сяргей Ёрш

**Пра тых, каго ўжо сярод нас няма**

З кожным годам усё менш і менш застаецца сярод нас вэтэранаў беларускага вызвольнага руху сярэдзіны XX стагодзьдзя. І толькі адыход часткі зь іх фіксуюць некаторыя беларускія выданьні, пра сьмерці іншых амаль ніхто ня ведае. Гэтую сытуацыю спрабавала выправіць газэта “Голас камбатанта”, якая ў 2000-2001 гг. зьмяшчала нэкралёгі і зацемкі пра памерлых вэтэранаў. Цяпер гэтую справу працягвае часопіс “Беларускі Рэзыстанс”.

**ЗЬМІЦЕР ЧАЙКОЎСКІ**

Пра сьмерць у Нямеччыне вядомага беларускага мастака-эмігранта Зьміцера Чайкоўскага на Бацькаў-шчыне даведаліся выпадкова. Адзін вядомы беларускі фатограф, які бываў у гасьцях у Чайкоўскага, у лістападзе 2002-га патэлефанаваў у Нямеччыну. Слухаўку падняў сын мастака, які і паведаміў сумную навіну: Зьміцера Чайкоўскага ўжо няма. Дзякуючы гэтаму выпадку, у “Нашай ніве” (2002, № 44, 29 лістапада) зьявіўся маленечкі нэкралёг з фотаздымкам:

“in memoriam

У Мюнхэне памёр Зьміцер Чайкоўскі, дзяяч беларускага замежжа, а таксама вядомы мастак. Вечная памяць!”.

Усё! Не згадалі нават пра тое, што ў гады вайны ён быў афіцэрам беларускіх нацыянальных фармацый, служыў ад’ютантам у падпалкоўніка Ф. Кушаля. Некалькі сказаў пра яго біяграфію я адшукаў у кнізе Барыса Сачанкі “Беларуская эміграцыя” (Менск, Голас Радзімы, 1991). Зьміцер Чайкоўскі нарадзіўся ўКлецку. У 1937—1939 гг. вучыўся ў Кракаўскай акадэміі мастацтваў. Па вайне жыў у Нямеччыне. “Вядомы як партрэтыст, малюе таксама абразы і пэйзажы. Яго жанравыя палотны адлюстроўваюць багатую беларускую прыроду і выстаўляліся на розных выстаўках у Эўропе і Амэрыцы”, — пісаў Сачанка.

У час вайны Чайкоўскі быў адным з найбольш дзейных беларускіх афіцэраў. У 1942-43 гг. у ранзе лейтэнанта быў камандзірам роты беларускага чыгуначнага батальёну ў Менску. Па эвакуацыі зь Беларусі, ужо ў лістападзе 1944 г. атрымлівае рангу надлейтэнанта (са старшынством ад 30 жніўня 1944-га; Загад Галоўнага кіраўніцтва вайсковых спраў БЦР № 10 ад 27 лістапада 1944 г.). Ужо праз тры дніпа нейкай прычыне ён вызваляецца ад пасады ад’ютанта Кушаля. ЗаступнікКамандуючага БКА палкоўнік Язэп Гуцька 30 лістапада 1944 г. выдаў загад № 52, дзе адзначалася:

“Ад’ютант Камандуючага Беларускай Краёвай Абаронай надлейтэнат Дзімітры Чайкоўскі, па яго просьбе, звальняецца з днём 27-га лістапада 1944 г. са становішча Ад’ютанта Камандуючага БКА і адкамандзіроўваецца з сяньняшнім днём у 1-шы Кадравы Батальён БКА для службовага прыдзелу ў афіцэрскуюроту на становішча камандзіра зьвязу. Надлейтэнанту Чайкоўскаму дзякую за яго сумленную працу” (НА РБ, ф.383, воп.1, спр.3, арк.51).

У 1-м Кадравым батальёне ў Бэрліне Чайкоўскі быў у складзе афіцэрскай школы, быў сябрам Статутовай камісіі ГКВС БЦР. 1 студзеня 1945 г. ён стаў капітанам і неўзабаве быў адкамандзіраваны на папаўненьне “1-й Грэнадзёрскай Брыгады “Беларусь”. Там ён камандаваў 2-ім стралковым батальёнам. У канцы красавіка 1945 г. разам з брыгадай перайшоў праз фронт да амэрыканцаў. Па адных дакумэнтах ГКВС БЦР, З. Чайкоўскі быў 1912 г.н., па іншых — 1918 г.н. Якая дата праўдзівая, невядома.

**ПАВАЛ ГУЗ**

17 жніўня 2003 г. у далёкай Аўстраліі памёр Павал Гуз (Дуброўскі). Зь ім я трымаў сувязь ад 1994 году. Ён быў блізкім сябрам, паплечнікам па партыі (Беларускай Незалежніцкай

Партыі) і грамадзкай працы прэзыдэнта БЦР Міхася Зуя. Дапамагаў мне трымаць з апошнім кантакт, перасылаў ад яго архіўныя дакумэнты, перадрукаваў з рукапіса аўтабіяграфію Зуя, якая пасьля ўвайшла ў кнігу “Вяртаньне БНП”.
П. Гуз нарадзіўся 15 жніўня 1924 г. у в. Дуброва ў былым Рэчыцкім павеце ў сялянскай сям’і. Са школьных гадоў быў актыўны ў спартовых арганізацыях, драматычным гуртку. На пачатку нямецка-савецкай вайны быў мабілізаваны дляэвакуацыі на ўсход дзяржаўнай маёмасьці. У родныя месцы вярнуўся толькіўвосень 1941-га з-пад Курску, перажыўшы, па ягоных словах, “вялікія прыгоды”. Савецкія партызаны забіваюць яго бацьку-самаахоўца, пасьля чаго ў самаахову запісваецца і Павал. У 1943 г. ён разам з сям’ёй пераяжджае ў Берасьце, а ў 1944 г. — у Нямеччыну. Працаваў на прымусовых працах. Канец вайны застаў Гуза ў Аўстрыі, у Тыролі, дзе ён і застаецца на некалькі гадоў. Разам з братам Алесем стварае беларускую групу ў лягеры ДП у Куфштайн, вядзе беларускія радыёперадачы, арганізоўвае скаўтынг (Зьвяз імя Івана Луцкевіча). Адначасова зьвязваецца зь беларускімі дзеячамі ў Нямеччыне (Уладзімерам Тамашчыкам і Віталём Кажаном), Францыі (а. Львом Гарошкам) і Канадзе (Сяргеем Хмарам), распаўсюджвае беларускі друк і сам дасылае туды допісы і публіцыстыку. У 1949 г. з Італіі выехаў у Аўстралію. Цэлы месяц плыў на караблі, пазнаёміўся з Міхасём Зуём, які прыняў Паўла Гуза ў сябры БНП. Усё сваё далейшае жыцьцё на чужыне яны працуюць разам, сябруюць. На працягу дзесяцігодзьдзяў Гуз быў адным з лідэраў беларускага грамадзкага жыцьця ў Мэльбурне.. Займаў пасаду сакратара аддзелу Беларускага Аб’яднаньня ў штаце Вікторыя, браў удзел у стварэньні беларускай нядзельнай школы, футбольнай каманды “Зубар”, быў сябрам рэдакцыі часопіса “Новае жыцьцё”. Гуз — адзінз заснавальнікаў беларускага праваслаўнага прыходу сьвятой Эўфрасіньні Полацкай. Пазьней ён становіцца сакратаром-скарбнікам Беларускага Цэнтральнага Камітэту, сакратаром Беларускай Фэдэральнай Рады Беларускіх Арганізацыяў у Аўстраліі. На сьвяткаваньнях беларускіх нацыянальных сьвятаў Гуз заўсёды выступаў з рэфэратамі, турбаваўся, што няма маладой зьмены — новыя эмігранты не вызначаліся нацыянальнай сьведамасьцю. Ня мог спакойна глядзець на тое, што адбывалася на Бацькаўшчыне. Ад імя беларускіх арганізацыяў пісаў звароты, адозвы, якія часта накіроўваў у дзяржаўныя ўстановы Беларусі. Быў сябрам Аўстралійска-чарнобыльскага дзіцячага фонду. Дапамагаў экспанатамі беларускаму музэю ў Ляймэне (Нямеччына).
Павал Гуз на эміграцыі быў прыхільнікам Беларускай Цэнтральнай Рады,браў удзел у яе пленумах. Ад прэзыдэнтаў БЦР Р. Астроўскага, а пасьля Н. Мядзейкі ён атрымаў рангі капітана (у 1974 г.), а пазьней маёра (у 1987 г.) Беларускай Краёвай Абароны. Меў узнагароды — тры мэдалі: “Беларускія вэтэраны на чужыне”, “Беларуская Краёвая Абарона” і “Жыве Беларусь”.
Сяргей Ёрш
(працяг будзе)

**ПОШТА**

## Сакрэтны бок дзейнасьці патрыётаў

Што да беларускага рэзыстансу падчас вайны, дык мне прыйшла думка, штоадной зь ягоных формаў пад нямецкім займом было ратаваньне нашых людзейпраз подкуп ці хабар. Прыкладам гэтага можа быць набор работнікаў у Нямеччыну ў 1943-м годзе [на Слонімшчыне], калі майму бацьку праз пляменьніка Анатоля Данілюка, што служыў лёкаям у гэбіц-камісара Эрэна, удалося падкупіць салам, маслам і яйкамі памочніка начальніка арбайтсамту Легмана, у выніку чаго з 70-ці, здаецца, чалавек, двойчы пакліканых на аглядную камісыю, у Нямеччыну ўзялі толькі аднаго, што ўжо сядзеў у турме за сувязь з партызанамі. А гэта ня быў адзіны выпадак, калі ўдавалася вытаргаваць у немцаў свабоду або і жыцьцё нашых людзей ды, нажаль, гэты дабрадзейны, але сакрэтны бок дзейнасьці беларускіх патрыётаў, што рабілі беларускую справу пад немцамі, апаганены таўром “калябарацыі”.
Барыс Данілюк, ЗША

## Калі ў закладніках цэлы народ

[...] Дзякую за часопіс. З цікавасьцю чытаю. Сустрэў прозьвішча свайго земляка з Шаркоўшчыны, знаёмага, харошага чалавека Ў. Ляскоўскага. Пра падзеі пачатку 50-х гадоў таго стагодзьдзя добрая дзіцячая памяць і ў мяне. Зганялі мужыкоў у калгасы. Хадзілі чуткі — там і там расправіліся з актывістамі, з калгаснымі чынамі, часта па начах палалі пажары. Сяляне ў масавым парадку зрываліся з родных каранёў. Ад нас зьяжджалі ў Эстонію на распрацоўку сланцаў.
Уяўляю, як няпроста вам давядзецца выдаваць часопіс. Ого, зачапіць афіцыйную вэрсію падзеяў на Беларусі падчас мінулай вайны! Сёньня ва ўсім сьвеце здрыгаюцца, калі гінуць у школе закладнікі. А нашы беларусы падчас мінулай вайны не былі закладнікамі? А колькі было партызанскіх кіраўнікоў, якія спыніліся б падрываць на міне якую-небудзь грузавую машыну з прадуктамі, бо за гэта ж акупанты спаляць бліжэйшую вёску, а то і не адну? Ці ад добрага жыцьця, ад нейкіх каварных задум у галаве каторага беларуса ўзьнікла ідэя пра стварэньне атрадаў самааховы? Яшчэ трэба разабрацца, як было, ці валам валілі беларусы ў партызанскія атрады.
Г. К., г. Полацак

## Пісаць пра памылкі мінулай гісторыі

Маё сардэчнае прывітаньне!
[...] Шчыра дзякую за памяць і вестку аб далёкіх нашых бацькаўшчынах. Вядома,што мы ўжо дажываем свой век. Старасьць і хваробы бяруць сваё. Хаця мне 82, яяшчэ бадзёры, бо ў маладосьці грунтоўна займаўся фізкультурай...
Быў час, калі мы лятуценьнямі былі багатыя. Нажаль, злая доля, сама гісторыя сыграла з намі злы жарт. Грузін абмануў і Чэрчыля, і старога Рузвэльта, і свой народ. Маем тое, што большасьць стогне, а “новые” “пляшут и поют”. Маё пакаленьне памылкова абапіралася на [тэзу] паўтарэньня гісторый. Лічыла, што дзьве магутныя сілы сатруцца, на іх касьцях вырасьце сьвядомы наш беларускі народ, які стагодзьдзямі цярпеў пад ігам сваіх суседзяў. Цяпер, калі добра падумаць, дык усё ідзе іншай каляінай.
[...] У сучасны момант, лічу, што варта чытачоў прэсы знаёміць ня толькі з сучаснай, але, галоўным чынам, з памылкамі даўно мінулай гісторыі. [...] Што датычыць нас, “легіянэраў-

швадронаўцаў”, мы заглушаныя, “чорнаскурыя другой катэгорыі”, хаця сумленьне ў нас чыстае. [...]
Шчасьця і здароўя жадаю Вам
Я. С., Расея

**Вярнуцца на радзіму не дазволілі**

У 1942 г. на ўсходзе Магілёўшчыны пераважна з мясцовых беларусаў стварыўся партызанскі атрад імя Катоўскага (камандзір — Каленчанка), які ваяваўсупраць нямецкіх акупантаў. Напрыканцы 1942 году ён вымушаны быў адыйсьці на ўсход, на Арлоўшчыну (Клетнянскія лясы). У красавіку 1943-га партызанскі атрад налічваў ужо 320 чалавек і падначальваўся “Заходняму штабу партызанскага руху” (ён камандаваў савецкім партызанскім рухам на акупаваных немцамі расейскіх тэрыторыях, на Смаленшчыне і Браншчыне). Але партызаны-беларусы хацелі ваяваць на роднай зямлі, таму 1 красавіка 1943 г. іх камандзір зьвярнуўся з лістом у “Цэнтральны штаб партызанскага руху”. У ім ён прасіўсавецкае партызанскае кіраўніцтва дазволіць атраду выйсьці ў раён Бабруйску. Матываваў камандзір Каленчанка гэта тым, што раён “яму добра знаёмы, і што асабовы склад атрада складаецца з беларусаў, імкненьне якіх дзейнічаць у гэтым раёне і прынесьці значна большую карысьць Радзіме”. ЦШПР спачатку пагадзіўся на перавод атрада Каленчанкі пад Бабруйск, але 1 траўня 1943 г. гэтаму запярэчыў “Заходні штаб партызанскага руху”. Невядома, якія былі ўжытыя аргументы, але ЦШПР зьмяніў сваю ранейшую пазыцыю. Такім чынам савецкі партызанскі атрад, які складаўся зь беларусаў, у той час на Бацькаўшчыну ня быў дапушчаны. На ўсялякі выпадак. А раптам яны, апынуўшыся на сваёй зямлі, не захацелі б змагацца за савецкую Радзіму і таварыша Сталіна, і далучыліся б да тых незалежніцкіх групаў, што ваявалі на два фронты?
Мікалай Шыбіцкі

**Статыстыка тэрору**

У дакумэнтах “Беларускага штабу партызанскага руху”, які кіраваў савецкай партызанскай дзейнасьцю ў Беларусі, маецца даволі шмат статыстычных матэрыялаў. Напрыклад, вядома, што на 1 кастрычніка 1943 г. савецкія партызаны забілі 13697 паліцыянтаў і “здраднікаў радзімы” (толькі 4795 чалавек зь іхзагінулі ў 1941 — 1942 гг.), паранілі — 1231, узялі ў палон — 776, дабраахвотна перайшлі ў партызаны — 444 чалавекі са згаданай катэгорыі. Невядома, колькі сярод забітых было беларускіх настаўнікаў, работнікаў культуры, сьвятароў і проста нацыянальна сьведамых людзей. Усіх іх савецкае кіраўніцтва залічала да “здраднікаў радзімы”.
М. Ш.

**Як Кушаль пасварыўся з маёрам Вітушкам**

З цікавасьцю прачытаў у № 1 “БР” згадку пра канфлікт Ф.Кушаля і К.Езавітава. Са свайго боку хацеў зазначыць, што і зь іншымі беларускімі вайскоўцамі ў Кушаля ня склаліся адносіны. Працытую ўспаміны таго ж Лявона Галяка,у 1944-45 гг. супрацоўніка Галоўнага кіраўніцтва вайсковых спраў БЦР:
“Гэткае самае адношаньне было ў Ф.Кушаля й да іншых вайскоўцаў. Калі даКушаля зьяўляліся вайскоўцы з вайсковых аддзелаў паза БКА — твораных ібудучых пад беспасярэднім нямецкім камандаваньнем, дык калі афіцэры гэтых аддзелаў выражалі ахвоту далучыцца да БКА, дык Кушаль не прызнаваў вайсковых ступеняў, здабытых у баёх і наданых нямецкімі вайсковымі ўладамі, а дамагаўся абніжэньня гэтых рангаў на адну ці

дзьве ступені. Асабліва вялікі скандал быў зь інжынерам Міхалам Вітушкам, які хацеў далучыццада БКА з тытулам маёра, які ён здабыў у баёх з савецкімі дэсантнікамі, а Кушаль запрапанаваў яму далучыцца як старшы лейтэнант. М.Вітушка несымбалічна, а дакладна плюнуў на Кушаля й паехаў у Дальвіц, дзе ачоліў групу парашуцістаў, якія былі скінутыя на Беларусі й даўжэйшы час пасьля капітуляцыі Нямеччыны вялі змаганьне супраць расейскіх акупантаў. Іхняя баявая клічка называлася “Чорны кот”. Падобная гісторыя была й з Д.Касмовічам дызь іншымі” (Л. Галяк. Успаміны. Кн. II. ЗША, 1983, б.15-16).
Здаецца, праблема з рангай у Вітушкі ўзьнікла “дзякуючы” Ф.Кушалю, алегэта ня ўся праўда. У той час у беларускім войску (Беларускай краёвай абароне) дзейнічала палажэньне “Аб устанаўленьні афіцэрскіх рангаў Беларускай Краёвай Абароны” (падрыхтаванае, дарэчы, Кушалям), якое было зацьверджана прэзыдэнтам БЦР Астроўскім 5 красавіка 1944 г. У адпаведнасьці зь ім, уБКА ўводзіліся наступныя афіцэрскія рангі: лейтэнант, старшы лейтэнант,капітан, маёр, падпалкоўнік, палкоўнік. У пастанове пісалася:
“2. Афіцэрскія рангі надае Прэзыдэнт Беларускай Цэнтральнай Рады па прадстаўленьні Начальніка Галоўнага Кіраўніцтва Беларускай Краёвай Абароны.
3. За афіцэрамі царскай, польскай, савецкай і іншых арміяў захоўваюцца іх рангі. Доказам дзеля захаваньня ранга зьяўляюцца атэстаты аб сканчэньні афіцэрскіх школаў і вайсковыя загады аб наданьні вышэйшых афіцэрскіх рангаў, альбо загады аб наданьні ранга за выключную баявую адвагу. У выключных выпадках пры адсутнасьці адпаведных дакумантаў прыналежнасьцьда афіцэрскага ранга можа быць — пасьведчаньне двух, заслугоўваючых даверу сьветак (вайскоўцаў).
Пацьверджаньне афіцэрскіх рангаў праводзіцца пастановай Прэзыдэнта Беларускай Цэнтральнай Рады.
4. За выключную баявую адвагу на полі бою па прадстаўленьні НачальнікаГалоўнага Кіраўніцтва Краёвай Абароны Прэзыдэнтам Беларускай Цэнтральнай Рады могуць быць наданы афіцэрскія рангі падафіцэрам.
5. Афіцэры, не прайшоўшыя ніжэйшых рангаў, ня могуць быць прадстаўлены для наданьня ім вышэйшых афіцэрскіх рангаў...” (За дзяржаўную незалежнасьць Беларусі, Лёндан, 1960, б.99-100).
Але справа ў тым, што калі ў Міхала Вітушкі не было адпаведных дакумэнтаў, напэўна ён меў шмат сьведкаў. Толькі прасіць сьведчыць іх маёр Вітушка ня стаў, а мог зьвярнуцца непасрэдна да прэзыдэнта БЦР Р.Астроўскага, зьякім працаваў на Смаленшчыне і Браншчыне ў 1941-1943 гг. Дарэчы, пра гэта ня мог ня ведаць Кушаль.
Пятро Казак, г. Менск

**ДАЙДЖЭСТ**

**“Я быў намесьнікам Акінчыца”**

У мінулым нумары “БР” друкавалася дасьледаваньне, прысьвечанае загадкавым абставінам забойства ў сакавіку 1943 г. у Менску кіраўніка беларускіх нацыянал-сацыялістаў Фабіяна Акінчыца. У лютым 2004 г. нью-ёркская газэта “Беларус” зьмясьціла запісаныя ўспаміны Мікалая Чупракова, які жыве ў ЗША, выпісвае беларускія выданьні і называе сябе намесьнікам Акінчыца. Перадрукоўваем гэты цікавы матэрыял, у якім падаецца яшчэ адна вэрсія забойства вядомага беларускага палітычнага дзеяча.

Я нарадзіўся ў 1918 годзе ў Менску, але ў 1920 мы выехалі ў вёску Смык Асіповіцкага раёну, дзе жылі матчыныя бацькі. Бацька быў пастухом, а пазьней, у 1921, як пераехалі ў Асіповічы, пачаў працаваць на чыгунцы. Працаваў там да самай сваёй сьмерці ў 1956 годзе. Маці працавала пры сярэдняй школе, на кухні, памерла ў 1958 годзе.
Мае старэйшыя сястра і брат вучыліся ў школе нямецкай мовы, а я браў іхныя падручнікі й вучыўся самастойна, бо надта цікава было тое мне ды й лёгка ішло. То калі ў пятай клясе па праграме пачаў вучыць, ведаў ужо ўсё. І настаўніца, немка Мара Густаўна, любіла мяне выклікаць на дапамогу, калі ніхто ня ведаў адказу. Ейны муж, дарэчы, афіцэр царскай арміі, выкладаў беларускую мову. Веданьне нямецкай мовы ўратавала мяне ў палоне, дзе я быў перакладчыкам.
Вучыўся я ў Менскім Пэдагагічным інстытуце, на філялягічным факультэце, беларуская мова і літаратура. Памятаю прафэсара Замоціна — выключны чалавек! Калі яго арыштавалі, на месца дэкана паставілі студэнта 4 курсу Мішу Белкіна.
Скончыў інстытут у 1940 годзе, апошнім перадваенным выпуску, але лёс яшчэнеаднойчы вяртаў у тыя сьцены. Там у час вайны была турма, і як мяне прывезьлі на расстрэл, пасадзілі туды. А яшчэ там была беларуская вайсковая ўстанова, штаб, у якім кіраваў Кушаль, да якога я прыходзіў па справах Акінчыца. А пазнаёміўся з Акінчыцам я так.
У Вустраве быў лягер для ваеннапалонных Чырвонай Арміі. Там былі беларусы, расейцы, украінцы. І быў створаны цэнтар па падрыхтоўцы прапагандыстаў. Кожная нацыянальная група займалася паасобку. Беларусаў з украінцамі пазьней перавялі ў іншы лягер, які называўся Вуцыц, але ў новым лягеры заняткі ішлі асобна. У кожнай групы была свая частка лягеру.
У першай групе нас было чалавек каля дваццаці. Памятаю імёны: Бедрыцкі,Старавойтаў, Сапега, Пётра Сахон, Сымон Шаўцоў, што пазьней апынуўся ў Аўстраліі. Быў Генрык Барановіч, ён дапамагаў Акінчыцу ў зносінах зь немцамі. Здаецца, выехаў па вайне ў Канаду. Быў Міхась Ганько, адзін з самых вялікіх патрыётаў беларускага народу, ён потым зь першаю групаю выйшаў. Быў ённастолькі адданы беларускай справе, што не зусім уяўляў, як мне здаецца, што навокал адбывалася. Калі ішло да канца, і зь Менску ўсе выехалі, ён прыехаў у Вустраў да мяне і пачаў казаць, што нам трэба арганізоўваць сваё кіраўніцтва, урад ды прапанаваў мне быць міністрам прапаганды. Я адказаў,што зь ім на ўсё гатовы ісьці, але запытаў, што з таго можа выйсьці, бо справа падыйшла да канца, трэба хавацца і ні пра якую ўладу ня можа ісьці гаворка. Больш я яго ніколі ня бачыў.
Акрамя Акінчыца, заняткі праводзіў я зь Юркам Зямёнкам. Расказвалі, што такое савецкая ўлада, давалі прыклады з уласнага жыцьцёвага вопыту. У Юркі бацька, пісьменьнік, быў арыштаваны, высланы, у мяне сваякоў поўна пасадзілі. Так што ведалі, пра што казаць. Расказвалі й пра гісторыю Беларусі,пра Вялікае Княства Літоўскае.
Галоўную ролю на тых курсах адыгрываў Фабіян Іванавіч Акінчыц. Гэта быў чалавек невысокага росту, спакойны. Нічым асаблівым зьнешне не вылучаўся. Быў ён вельмі добрым, спагадлівым, імкнуўся памагчы ўсім. Ягонаю мэтаюбыло вызваліць як мага больш

беларусаў-ваеннапалонных. Бо, што нямецкі палон — сьмерць, ведалі ўсе. Немцы намагаліся як мага болей зьнішчыць славянаў. І гэта Фабіян Іванавіч пачаў адчуваць надта моцна. А ён-жа меў непасрэдныя дачыненьні з Розэнбэргам, галавою акупаваных усходніх абласьцей. Вось на просьбу Акінчыца распусьціць калгасы й даць зямлю сялянам, гэтым самым здабыць давер ды настроіць супраць камуністаў, што загналі ўтыя калгасы, Розэнбэрг адказаў, што рабіць таго ня будзе, а зробіць толькітады, калі сялянаў прывязуць назад зь Сібіры. Так, туды было выслана багата так званых "кулакоў", але чакаць на іхняе вяртаньне было неразумна. Нават болей, немцы выкарыстоўвалі калгасы. У кожным сядзеў іхны чалавек, сачыў за сялянамі. Немцам было выгадна: прасьцей спаганяць харчы ды сачыць за людзьмі таксама, як яны ў гурце. Другая справа. Фабіян Іванавіч хацеўарганізаваць сваю беларускую нацыянал-сацыялістычную партыю, аб'яднаць народ вакол яе, калі папытаў дазволу Розэнбэрга, той адказаў: ніколі! Толькі адна нацыянал-сацыялістычная партыя будзе існаваць у сьвеце — гэта нашая партыя!
Фабіян Іванавіч радзіўся аб усім з намі дваімі — Юркам Зямёнкам і мною.. Мы заўсёды сустракаліся, калі ён прыяжджаў з Бэрліну, сядалі разам ды абмяркоўвалі навіны. І ён казаў, што быў вельмі расчараваны ў немцах. Ня быў ён фашыстам, а быў змагаром за інтарэсы беларускага народу і вызваляў насз палону, каб выратаваць ад сьмерці, бо ў лягерох для ваеннапалонных людзі гінулі тысячамі. І ўсе, каму ён дапамог, вельмі ўдзячныя яму. Аднаго гэтага дастаткова, каб цаніць высока чалавека. А ён-жа яшчэ даваў ваеннапалонным беларускую загартоўку, адукацыю нацыянальную.
Акінчыц зразумеў, што не адзін вораг у беларускага народу, ня толькі Саветы, але і гітлераўцы такія-ж ворагі, як Сталін. І вось тут паўстае праблема: што-ж далей рабіць?
Мы лічылі, што весьці антыкамуністычную прапаганду сярод насельніцтва вельмі выгодна зараз. Ніхто не замінае. Другая рэч — што ня трэба ўсхваляць немцаў! Беларускае насельніцтва часта сустракала немцаў у першыя дні вайны з хлебам-сольлю.
Гэта была цяжкая работа — весьці прапаганду. І небясьпечная. Мы прасілі Акінчыца, каб кожны, хто едзе ў Беларусь, перамяніў сваё прозьвішча, і каб людзей пасылалі не туды, дзе яны жылі да вайны, а туды, дзе ніколі не былі раней. Мы ведалі, што Саветы вельмі хутка пачнуць паляваць за намі, а як ня змогуць злавіць, пачнуць шантажаваць: маўляў, схопім бацьку, матку тваіх ды расстраляем.
Першую групу павёз сам Акінчыц, я застаўся ягоным заступнікам на гэты час. Усяго было 3 ці 4 выпускі, ня памятаю дакладна, гэта прыкладна 60-70 чалавек.Акінчыц меў сувязі зь беларускім кіраўніцтвам у Менску. Празь іх, праз Кушаля, наладжваў сувязі зь беларускімі арганізацыямі й прыстройвалі нашых людзей на працу, дзе яны маглі-б весьці прапаганду. Адзін, напрыклад, быў прыкамандзіраваны да Беларускай Вайсковай школы. Але Акінчыц у нейкай ступені не давяраў кіраўніцтву ў Менску, да асобных ставіўся адмоўна,казаў, што яны былі ня лепшымі людзьмі. Відаць, прычыны ляжалі яшчэ ў даваенным жыцьці. Асабліва складаныя адносіны былі з М.Шкялёнкам, лепшыя з Ф.Кушалем.
Акінчыц быў у прыгнечаным настроі, разьлічваў, што немцы дапамогуць беларусам вызваліцца ад Саветаў, быў вельмі пранямецкім, праз гэта і разышоўся зь беларускім актывам, які не давяраў яму і лічыў чалавекам немцаў. Але ягоныя пагляды на сытуацыю мяняліся. Сваю памылку ён зразумеў даволіхутка, толькі нешта мяняць ужо было позна.
Яго забілі ў Менску. Акінчыц спыняўся заўсёды ва Ўл.Казлоўскага, якогаведаў з даваенных часоў. Аднойчы ў дзьверы пагрукалі, Казлоўскі папытаў,хто. Адказалі, што прыйшлі з газэты, прынесьлі матар'ял на перагляд. Казлоўскі адчыніў, уварваліся двое з пісталетамі, адціснулі яго ўбок — і да Акінчыца. Застрэлілі ў ложку. Пахавалі яго ў Менску, а дзе, ня ведаю. Пазьнейзабілі й Казлоўскага.
Я быў арыштаваны ў 1944-м годзе і мяне, пэўна, расстралялі-б, каб не начальнік беларускай сакрэтнай паліцыі, які па сваіх паглядах быў антысавецкім і антыгітлераўцам, ён разумеў нашае становішча. Імя ягонае — Мікалай Алферчык. Сам ён зь Пінску, але ў Беларусь

прыехаў з Смаленскага СД, нейкі часбыў пры Астроўскім. Ён расьследаваў нашую зь Зямёнкам справу (немцы насарыштавалі разам у Бэрліне і прывезьлі для допытаў у Менск). І Алферчык сказаў, што такія людзі, як мы, яшчэ патрэбныя беларускаму народу, і вызваліў нас. Дапамагло яшчэ тое, што я зь ягонай сястрою вучыўся разам у інстытуце. А арыштаваных было багата, і ўсе загінулі. Нас ён забраў з сабою і апошнім цягніком вывез у Бэрлін.
А прычына арышту была вось у чым. Адзін з хлапцоў з маёй групы, Шаўчэнка,зьвязаўся з партызанамі. Відаць, яго шантажавалі. А працаваў ён у вайсковай школе і падначальваўся начальніку менскай паліцыі, цяпер ня памятаю імя. І вось таму генэралу даносяць, што Шаўчэнка не зьяўляецца на працу. Праз які час генэрал на вуліцы заўважае хлапца, загадвае спыніць машыну дыпытаецца, чаму на працы няма. Шаўчэнка адказвае, маўляў, мяняў хату, заняты моцна быў, але ўжо высвабадзіўся і заўтра вернецца працаваць. Генэрал пытаецца, а дзе тая хата. Недалёка тут, адказвае Шаўчэнка, хадземце пакажу. Яны пайшлі. А Шаўчэнка завёў іх у нейкі двор, выхапіў пісталет, застрэліў іўцёк. Увесь Менск паднялі на ногі, яго схапілі. І немцы, відаць, палічылі, што ўсе нашыя прапагандысцкія курсы былі супрацьнямецкімі. Нас зь Зямёнкам арыштавалі ў Бэрліне і прывезьлі ў Менск на страту.
З жывых засталіся, відаць, толькі я ды паэт Міхась Кавыль.
*Беларус (Нью-Ёрк), 2004, № 493, люты.*

**“Зялёны Дуб” і прыпіскі**

У кастрычніку 1920 г. пры садзейнічаньні 2-га аддзела Генштабу Польшчы быўствораны Беларускі палітычны камітэт (БПК), у склад якога ўвайшлі П. Аляксюк, В. Адамовіч, Ю. Сянкевіч. 12 кастрычніка БПК заключыў пагадненьне з Булак-Балаховічам аб вярбоўцы дабраахвотнікаў у яго армію, такое самае пагадненьне камітэт падпісаў і з Савінкавым.*
У канцы 1920 г. 2-гі аддзел Генштабу зрабіў спробу выкарыстаць у сваіх мэтахБеларускую сялянскую партыю “Зялёнага Дуба”, якая была перададзеная ў падначаленьне Балаховічу Беларускім палітычным камітэтам. Партыя “Зялёнага Дубу” была створаная старшынёй БПК В. Адамовічам** у 1918 г. і да студзеня 1921 г., паводле паведамленьня начальніка Інфармбюро РПК Віктара Савінкава ў 2-гі аддзел Генштабу, “валодала партызанскімі атрадамі каля 10, колькасьцю кожнага зь іх ад 12 да 150 чалавек”. Тэрыторыя дзеяньня сялянскай партыі — ўсходнія ўскраіны Беларусі (Смаленская, Віцебская, Магілёўская, Гомельская губэрні). “Штаб яе, — паведамляў В. Савінкаў, — кіруемы сотнікам Дзергачом***, нягледзячы на параўнаўча высокія якасьці апошняга, незадавальняючы. Сама партыя “Зялёнага Дуба” пазбаўленая аўтарытэтнага кіраўніцтва”. Сялянскія арганізацыі “Зялёнага Дуба” канспірацыйныя, з-за чаго іх распаўсюджанасьць і сіла ня могуць быць дакладна ўлічаны” (Расейскі дзяржаўны вайсковы архіў, ф.461, воп.1, спр.164, арк.176).
У канцы 1920 г. начальнік штабу партыі “Зялёнага Дубу” паведамляў В. Савінкаву, што “арганізацыя пакрывае густым павуціньнем усю Беларусь”. “Арганізацыя магла б працаваць больш жывей і цікавей, — меркаваў начальнік Інфармаддзела, — але адсутнасьць сродкаў прымушае абмежавацца вельмі слабой у параўнаньні з праектам працай. Цяпер праца заключаецца ў друкаваньні адозваў, фармаваньні пяцёрак па вёсках, пасылкай туды зброі і падрыўнога матэрыялу, але ўсё гэта здабываецца зь вялікімі цяжкасьцямі і рызыкай. Зброю даводзіцца літаральна скрадаць у палякаў” (РДВА, ф.461, воп.1, спр..164, арк.188).
Сябра Цэнтральнага выканаўчага камітэту сялянскай партыі “ЗялёнагаДуба” В. Адамовіч прасіў Б. Савінкава падтрымаць партыю грашыма і людзьмі, “якія добра ўмеюць лавіраваць у палітычных хвалях”. “Калі мы здолеем стварыць Беларусь, — пісаў ён, — то гэтым створым Раду для агульнай нашайсправы, ратаваньня Радзімы. У партыі “Зялёнага Дуба” ўсе сябры камітэтунастроеныя вельмі прыхільна да расейцаў, гэта, вядома, застаецца тайнайдля палякаў” (РДВА, ф.461, воп.1, спр.164, арк.187). Пры пасярэдніцтве братоў Савінкавых

галоўны штаб “Зялёнага Дуба” наладзіў добрыя стасункі з польскіміўладамі, якія падтрымалі беларускі народны рух спачатку харчамі з інтэнданцтва 18 дывізіі і IV арміі. Беларускія кіраўнікі партызанскага руху ўвесь час павялічвалі колькасьць едакоў. Так, Дзяргач, атрымліваючы харчы з польскага інтэнданцтва, на 3000 чалавек пры рэальнай колькасьці ў 450, лішак харчоў рэалізоўваў па спэкулятыўных коштах. Паверка дзейнасьці “Зялёнага Дуба” Інфармбюро ў красавіку 1921 г. устанавіла “тыя ж зьявы, што і ў астатніх беларускіх арганізацыях”: “жажду к наживе, мальчишеское отношение к делу, полную непригодность всех этих “атаманов” к организационной работе”. Польскае камандаваньне раззброіла партызанаў, асноўная іх частка разыйшлася па хатах, да сярэдзіны 1921 г. арганізаваных партызанаў “Зялёнага Дуба” засталося 80 чалавек” (РДВА, ф.461, воп.1, спр.151, арк.54).
*Друкуецца ў перакладзе з расейскай мовы паводле публікацыі: СимоноваТ. “Прометеизм” во внешней политике Польши. 1919—1924 гг. // Новая и новейшая история (Расея), 2002, № 4.*

Спасылкі:
*Барыс Савінкаў — кіраўнік Расейскага палітычнага камітэту з цэнтрам у Варшаве, які спрабаваў каардынаваць антыбальшавіцкую барацьбу ў Савецкай Расеі. Гэтая і наступныя заўвагі — “БР”.
**Палкоўнік Вячаслаў Антонавіч Адамовіч быў адным зь лідэраў беларускага вайсковага руху з 1917 г. Ініцыятар стварэньня нелегальнай Беларускай сялянскай партыі “Зялёны Дуб”, якая ў далейшым знаходзілася пад ягоным уплывам.
***Атаман Дзяргач — Вячаслаў Вячаслававіч Адамовіч, сын палк. Адамовіча, старшыня Беларускай сялянскай партыі “Зялёны Дуб”.

**УДАКЛАДНЕНЬНЕ**

Пасьля выхаду першага нумару “БР” з рэдакцыяй зьвязаўся Васіль Супрун са Слоніма. Ён паведаміў пра прыкрую памылку ў ілюстраваньні артыкула“Сьмерць падпольшчыка”. Замест здымка Ўладзімера Салаўя на б. 93 № 1 было надрукаванае фота Сяргея Ціхана. Памылку выпраўляем і зьмяшчаем фота ўдзельніка пасьляваеннага патрыятычнага моладзевага падпольля Ўладзімера Салаўя (на здымку ён стаіць першы зьлева).
Паводле В. Супруна, Сяргей Ціхан падчас нямецкай акупацыі вучыўся ў Слонімскай настаўніцкай сэмінарыі. У 1944 г. быў арыштаваны немцамі і расстраляны разам з маці, што прыйшла наведаць сына, на Пятралевіцкай гары. Паходзіў С. Ціхан зь вёскі Глоўсевічы Слонімскага раёну.

**ФОТАФАКТ**

**Памылка ў рамачцы**

Памылкі ў подпісах архіўных здымкаў дапускае нават КДБ.
У спэцвыпуску “Вестника КГБ Республики Беларусь” ад 1997 г. быў надрукаваны артыкул Міхаіла Токарава “Шпионы”, прысьвечаны закідцы ЦРУ ў пачатку 1950-х у БССР разьведчыкаў-беларусаў. З боку беларускіх эміграцыйных цэнтраў (найперш Рады БНР) гэтую працу каардынаваў Барыс Рагуля. Токараў праілюстраваў публікацыю фотаздымкам, вядомым па кнізе Васіля Рамаўскага“Саўдзельнікі ў злачынствах” (Менск, 1964, б.174). У згаданай кнізе правільна пазначана, што справа на здымку — Б. Рагуля (пра іншага вайскоўца інфармацыіне было пададзена). У “Вестнику КГБ Республики Беларусь” на б.51 чытаем подпіс да здымку: “На снимке слева — Борис Рогуля. Во время войны был командиром полицейского батальона в Белоруссии. После войны Рогуля был заместителем начальника разведшколы в Германии, поставлял для ЦРУ агентов для заброски в Советский Союз”. А каб у чытачоў не было ніякіх сумневаў, узялі твар “Рагулі” ў рамачку. Аднак атрымалася памылка. Зьлева на здымку сябраРагулі, будучы старшыня Рады БНР Язэп Сажыч (цяпер жыве ў ЗША).
Сяргей Дудаліч

**РЭКЛЯМА**

У выдавецтве “Беларускі Рэзыстанс” на працягу 2003 — 2004 гг. пабачылі сьвет:
“Была вайна. З гісторыі антысавецкага ўзброенага супраціву” (Менск, 2003),
Ёрш С. “Рыцар Свабоды. Ксёндз Вінцэнт Гадлеўскі як ідэоляг і арганізатар беларускага нацыянальнага антынацыскага Супраціву” (Менск, 2004),
“Беларускі Рэзыстанс”, часопіс найноўшай гісторыі, 2004, № 1.
Рыхтуецца да друку кніга Кастуся Рамановіча “За волю Беларусі. Успаміны пра сябе і сваіх сяброў”.

Нашы выданьні можна замовіць праз “Кнігі-поштай”: Менск, 220050 п/с 333,
тэл. 8 (029) 643 57 33, exlibris@tut.by